ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**16** чэрвеня 2011 г.
**ЧАЦВЕР**
№ 111 (26975)
Кошт 750 рублёў

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АГАРОДНЫ ДОКТАР



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

11-гадовы жыхар вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Уладзіслаў ЧАРНАВОКІ палівае агарод з памідорамі, каб выратаваць будучы ўраджай.

## ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ ЗАХАВАЕЦЦА, АЛЕ ЯГО АБ'ЁМЫ СКАРОЦЯЦЦА

**Аб гэтым заявіў учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, наведваючы комплекс жылой забудовы раёна Усходні ў Мінску, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы даручыў на працягу паўгода стварыць новую сістэму льготнага крэдытавання насельніцтва, вызначыўшы ў ёй тыя катэгорыі грамадзян, якія будуць мець права на крэдыт. Прэзідэнт лічыць, што такімі катэгорыямі будуць шматдзетныя сем'і, ваенныя, аднак аб'ём іх дзяржпадтрымкі будзе таксама адрозніваацца.

«Трэба адкрыта гаварыць, што ў такім аб'ёме льготна крэдытаваць мы не можам. Бясплатна жыллё мы будаваць не зможам, таму што пры цяперашняй інфляцыі, якая ўсё з'ядае за 20 гадоў, чалавек фактычна бясплатна атрымлівае кватэру. Таму бясплатнага жылля ў такім аб'ёме, як гэта было ўчора, не будзе. Не таму, што тут праблемы, цяжкасці і г.д. Мы вельмі захапіліся, і фактычна многія людзі не думаюць аб тым, што яны самі павінны будаваць дом, кватэру і клапаціцца аб сваёй сям'і. Аб гэтым галава павінна балець перш за ўсё ў чалавека, а потым ужо — падтрымка, дапамога і г.д.», — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што «сітуацыя паказала: бяздумнае ўкідванне грашовых сродкаў, у тым ліку ў будаўніцтва жылля, прыводзіць да панікі».

«Ільготнае крэдытаванне, зразумела ж, застанецца, але яно будзе зведзена да таго аб'ёму, які дзяржава можа вытрымаць, каб не стварыць чарговыя праблемы на рынку валютным, фінансавым, эканамічным і г.д.», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «Але трэба дакладна вызначыць, каму мы будзем дапамагаць па льготах, — адзначыў Прэзідэнт. — Тут даўно пара ўраду вызначыцца, якая падтрымка будзе сем'ям з трыма, чатырма, пяццю дзецьмі, і дакладна прапісаць гэта».

СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

17 чэрвеня 2011 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца чарговае пасяджэнне шостай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

## ЗА СМЕЛАСЦЬ

**29 сакавіка ў в. Узногі пад Баранавічамі ўспыхнула хата, у якой жыла сям'я пенсіянераў.**

Састарэлых выратавалі два мясцовыя жыхары — Аляксей Дубоўскі і Аляксей Сівоха. Яны аблілі сябе вадой і кінуліся ў хату... На гэтых днях старшыня Брэсцкага аб'яднання «Беларускае пажарнае таварыства» Ігар Аўсяннікаў уручыў смельчакам падарункі — мікрахвалевыя печы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## ЗАБЫЛАСЯ КУРТКУ З ВАЛЮТАЙ

**Пенсіянерка з Брэста ехала на маршрутным таксі № 20 па вуліцы Смірнова, выйшла на сваім прыпынку, а ў машыне забылася куртку.**

Усё б нічога, і са стратай можна было б змірыцца, каб у кішэні вопраткі не было 8630 долараў. Потым пасажырка спахапілася, але было позна, у салоне маршруткі адзення не было. Жанчына пабегла ў міліцыю, напісала заяву. Справу завялі, а вось надзеі на тое, што грошы знойдуцца, не вельмі многа.

**Яна СВЕТАВА.**

## РАЗВІТАЎСЯ З ЖЫЦЦЁМ

**43-гадовы жыхар Баранавіч пасварыўся з жонкай і пайшоў на Жлобінскае возера, каб скончыць жыццё самагубствам.**

Рыбакі і іншыя прысутныя бачылі, як мужчына кінуўся ў ваду, і паспрабавалі яго выратаваць. Але зрабіць гэта не ўдалося. Падчас выратавання адзін з добраахвотнікаў ледзьве сам не пайшоў на дно.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Васіль ЖАРКО:

## «РЭЗКАГА ПАВЫШЭННЯ ЦЭН НА ЛЕКІ НЕ БУДЗЕ»

**Запасы лекавых сродкаў дазваляюць гаварыць аб тым, што, па меншай меры, да восені медыкаменты ў аптэчнай сетцы будуць па звыклых цэнах. Наогул за 5 месяцаў рост цэн на лекавыя сродкі склаў усяго 4 працэнты.**

Калі айчынныя прэпараты і будуць павышацца ў цане, то нязначна, у залежнасці ад павелічэння іх сабекошту, адзначыў перад журналістамі міністр аховы здароўя Васіль ЖАРКО. Паводле яго слоў, на наступным тыдні будзе падпісаны чарговы мемарандум па стрымліванні цэн на лекі, які падпісваецца паміж Міністэрствам аховы здароўя і аптовымі пастаўшчыкамі лекаў, а таксама паміж міністэрствам і аптэкамі ўсіх формаў уласнасці. Усе ўдзельнікі, якія падпісваюць гэты дакумент, вытрымліваюць яго патрабаванні.

Зараз Нацбанк «вытрымлівае прыярытэтнасць» і ў поўным аб'ёме выдаткоўвае валюту на закупку лекавых сродкаў па курсе Нацбанка. «Пару тыдняў таму я збіраў асноўных пастаўшчыкоў, і мы дамовіліся аб вытрымліванні мінімальных нацэнак на опт і розніцу, каб не было рэзкага павышэння цэн, — сказаў міністр. — Цяпер мы праводзім маніторынг цэн у аптэках, і я б не сказаў, што яны рэзка выраслі».

Між іншым, паступленні грашовых сродкаў ад аказання платных медыцынскіх паслуг насельніцтву пакуль стабільна павялічваюцца. Толькі за 4 месяцы гэтага года аб'ём экспарту медпаслуг павялічыўся на 133 працэнты да аналагічнага перыяду мінулага года. На экспарце заробленa звыш 7 млн долараў. У студзені-красавіку ўстановы аховы здароўя аказалі меддапамогу 25 тысячам замежных грамадзян, што на 177 працэнтаў больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Дарэчы, да 1 ліпеня ўстановы аховы здароўя павінны атрымаць у Нацбанку ліцэнзіі на аказанне меддапамогі замежнікам за валюту. Такія ўказанні атрымалі і ўстановы адукацыі медыцынскага профілю.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

***(Працяг тэмы ў наступным нумары.)***

ISSN 1990 - 763X

## РЭСУРС, З ЯКІМ МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ УСЕ ЦЯЖКАСЦІ

**Падыходзіць да завяршэння восьмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Пра некаторыя папярэднія вынікі заканатворчай работы народных выбраннікаў у інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**



**— Уладзімір Паўлавіч, што вы аднеслі б да асноўных сесійных напрацовак?**

— Прыняты законапраекты па шэрагу пытанняў эканомікі, нацыянальнай бяспекі, праваахоўнай дзейнасці, міжнароднага супрацоўніцтва, рэалізацыі канстытуцыйных правоў грамадзян, прыродакарыстання, аховы здароўя і культуры. Усе заканадаўчыя рашэнні запатрабаваныя жыццём і адпавядаюць задачам развіцця нашай краіны. Умоўна я падзяліў бы іх на тры блокі.

Першы блок складаюць законапраекты аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў нашай краіны, большасць з якіх — пагадненні ў фармаце Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана. Можна сказаць, што аснова нарматыўна-прававой базы Мытнага саюза створана: з улікам пагадненняў, ратыфікаваных на гэтай сесіі, намі ратыфікавана ўжо 60 дакументаў. Прычым гэтыя пагадненні — не дэкларацыі, а канкрэтны прававы механізм рэалізацыі інтэграцыйных праектаў, які рэгулюе практычныя пытанні мытных аперацый. Адзначу ў гэтым блоку і ратыфікацыю пагаднення з Расійскай Федэрацыяй, якім устанаўліваецца адзіны комплексны кантроль аўтатранспартных сродкаў на знешняй граніцы Саюзнай дзяржавы, што значна спросціць перавозку грузаў і пасажыраў беларускімі і расійскімі перавозчыкамі і скароціць час паездкі, бо кантрольная працэдура будзе толькі адна.

Другі блок — праекты законаў, у тым ліку базавых, работа над імі ўжо завершана. Маю на ўвазе, у прыватнасці, прынятыя заканадаўчыя рашэнні аб аўтарскім праве і сумежных правах, па пытаннях гаспадарчай дзейнасці, нерухомай маёмасці, ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур, дзейнасці пракуратуры, прафесіянальных саюзаў, выкарыстання аб'ектаў расліннага свету і іншыя. А ў трэцім блоку — змяненні і дапаўненні дзейнага заканадаўства, якія прайшлі працэдуру першага чытання. У тым ліку па пытаннях барацьбы з карупцыяй, адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, медыцынскай дапамогі, шлюбу і сям'і, кінематаграфіі. Усяго агульная колькасць прынятых на сесіі законапраектаў складзе не менш за 70, а, верагодна, будзе і большай, бо сесія яшчэ працягваецца.

**— У якім накірунку ідзе развіццё заканадаўства?**

— Сфарміраваная на сесіі нарматыўна-прававая база ў цэлым накіравана на рэалізацыю Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011—2015 гады, адобранай чацвёртым Усебеларускім народным сходам, і на выкананне задач, пастаўленых перад парламентам кіраўніком дзяржавы. Зроблены чарговы сур'ёзны крок па шляху сістэматызацыі і збалансаванасці заканадаўчай прасторы, яе якаснага паляпшэння. Унесены запатрабаваныя жыццём змены ў шэраг законаў. У першым чытанні прынята некалькі зусім новых па прадмеце прававога рэгулявання законапраектаў — «Аб процідзеянні гандлю людзьмі», «Аб папярэджанні распаўсюджвання захворванняў, небяспечных для здароўя насельніцтва, віруса імунадэфіцыту чалавека і гарантыях правоў грамадзян, якія маюць такія захворванні», «Аб дапаможных рэпрадуктыўных тэхналогіях і гарантыях правоў грамадзян пры іх прымяненні». Хаця апошні выклікаў у грамадстве дыскусію, гэта не адмяняе яго навізны і важнасці, а пацвярджае складанасць заканатворчай работы.

СТАР. 4

# ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ Ў БЕЛАРУСІ ЗАХАВАЕЦЦА, АЛЕ ЯГО АБ'ЁМЫ СКАРОЦЯЦЦА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы не можам бяздумна, у тым ліку за кошт эмісіі, укідваць грошы ні ў будаўніцтва, ні ў сельскую гаспадарку — ва ўсе дзяржпраграмы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду прапрацаваць дакладную сістэму аказання дзяржаўнай падтрымкі пры будаўніцтве жылля і «не з пункту гледжання Дзеда Мароза ўсім раздаць».

## Будаўніцтва ў Мінску будзе скарачацца

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што мінчане ў аснoўным павінны будаваць жыллё без дзяржпадтрымкі.

Ён лічыць, што ўсё насельніцтва краіны не павінна канцэнтравацца ў сталіцы, людзі павінны ісці туды, дзе ёсць рабочыя месцы і патрабуецца рабочая сіла.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, у свеце ёсць адзін непахісны прынцып: чалавек ідзе да рабочага месца. У якасці прыкладу ён прывёў хуткае будаўніцтва ў Светлагорску пад кітайскі крэдыт новага камбіната. «Туды патрэбны людзі, будзе будавацца жыллё. Не можаш пабудавацца ў Мінску — едзь туды і будуй», — сказаў ён. Прэзідэнт падкрэсліў, што аб'ёмы будаўніцтва ў Мінску будуць скарачацца. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тыя людзі, якія даўно ішлі да будаўніцтва жылля ў сталіцы і доўга стаялі на чарзе, гэта жыллё павінны пабудавацца. «Але льгатаваць і падштурхоўваць людзей трэба туды, дзе патрэбна рабочая сіла», — сказаў Прэзідэнт. «Трэба зыходзіць з тых прынцыпаў, на якіх сёння жыве свет», — дадаў ён.

У той жа час кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ніхто не будзе перашкаджаць будаўніцтву жылля грамадзянам за свой кошт, за сродкі камерцыйных крэдытаў. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што людзям неабходна выдзеліць максімум участкаў пад асабістыя забудовы па ўсёй краіне. Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на зніжэнні долі імпартных складальнікаў у жыллёвым будаўніцтве. «Трэба падумаць, каб мы былі менш завязаны пад гэтыя долары, еўра, пад імпарт», — сказаў ён.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу ўрада, што ўсе нюансы трэба звесці разам і новая сістэма павінна быць толькі пад кантролем дзяржавы. «Ніякага прыватніка, таму што мы атрымаем праблемы, і вялікія: грошы збяруць, людзей падмануць і паедуць», — сказаў ён.

«Тут павінна быць дакладная справядлівасць і ніякага папулізму і непатрэбнай падтрымкі, калі мы бачым, што гэта ў перспектыве на шкоду дзяржаве», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Віцэ-прэм'ер Анатоль Калінін расказаў, што ўжо вызначаны некалькі катэгорый, каму будзе выдавацца льготны крэдыт пры будаўніцтве жылля. Гэта шматдзетныя сем'і, грамадзяне, якія жывуць больш за 10 гадоў у інтэрнаце, маюць правa на сацыяльнае жыллё і жывуць у старых дамах. Паводле яго слоў, сёння з дзяржпадтрымкай будуецца 72 працэнты жылля, у будучым урад плануе ўраўнаваць долі жылля, якое будуецца з дзяржпадтрымкай і за кошт грамадзян. Анатоль Калінін таксама лічыць, што пры новым падыходзе на бюджэт ляжа значна меншая нагрузка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе не дапускаць павышэння кошту будаўніцтва па раней заключаных кантрактах. Як далажыў кіраўніку дзяржавы, у першым квартале гэтага года ўдалося ўтрымаць кошт квадратнага метра жылля і нават знізіць яго на 5 працэнтаў з улікам адзелкі. Цяпер сярэднеўзважаны кошт 1 кв.м жылля для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і будуюць жыллё з дзяржпадтрымкай, замацаваўся на ўзроўні каля Br1 млн 700 тыс. Паводле слоў намесніка прэм'ер-міністра Анатоля Калініна, да канца года з улікам павышэння цэн прагназуецца цана каля Br2 млн 200 тыс. «Гэта вы як ведамасны чыноўнік гаворыце. А калі б вы падціснулі будаўнікоў? Перш за ўсё па тэрмінах. Так, ім цяжка выконваць пры такіх умовах гэтыя задачы. Але, калі ласка, здай на адзін-два месяцы раней, — адзначыў кіраўнік дзяржавы, звяртаючыся да віцэ-прэм'ера. — Таму трэба падціснуцца да немагчымага, аж да таго, што, можа, нейкім чынам падтрымаць будаўнікоў».

«Тут трэба ўсё кінуць, але чалавека не пакрыўдзіць. Ужо новыя дагаворы, добра, заключайце пад Br2-2,2 млн. Чалавек тады будзе выбіраць. Але тут мы не можам біць так чалавека. Гэту праблему трэба вырашыць, чаго б нам гэта ні каштавала. Абараніць тых, хто ўжо заключыў дагаворы і ў каго жыллё ўжо будуецца», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама адзначыў, што неабходна ў цэлым працаваць над змяншэннем кошту будаўніцтва жылля, у тым ліку за кошт скарачэння тэрмінаў здачы.

«Галоўнае — захаваць будаўнічы комплекс. Гэты час пройдзе. Калі няма будаўніцтва — у краіне няма развіцця», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## Прадухіліць адток будаўнічых кадраў

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў прыняць самыя дзейсныя меры для прадухілення адтоку будаўнічых кадраў за мяжу. Гаворачы аб адтоку кадраў з будаўнічай галіны Беларусі, які намеціўся апошнім часам, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Мы ў гэтым не зацікаўлены». «Таму мы павінны гэтым «летунам», інакш іх не назавеш, сказаць: мы не можам забараніць табе ехаць будаваць некуды за мяжу. Ты паехаў працаваць неарганізавана ў іншую дзяржаву, у краіну грошай не прыносіш. Едзь, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але па-першае, камунальныя паслугі 100 працэнтаў сям'я аплачвае, медыцынскае забеспячэнне, тваё асабіста, дзяцей мы не чапаем і сям'ю, — 100 працэнтаў. Не нясеш сацыяльную нагрузку, дзяржаве не дапамагаеш, давай хоць за камуналку і за медабслугоўванне заплаці».

«Тады ён тысячу разоў падумае, ехаць ці не ехаць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Зарабіў грошы — прыйдзі і заплаці».

Звяртаючыся да членаў урада, Аляксандр Лукашэнка даручыў: «Неадкладна выконвайце — з другога паўгоддзя. Адукацыю не чапаем». «Мы застаёмся тут, плацім падаткі, утрымліваем гэту ахову здароўя і камуналку. Трэба яшчэ паглядзець (па іншых напрамках. — **Заўвага БЕЛТА**). Мы не забараняем — едзь, але плаці тут», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

## Будаўнічыя паслугі — на экспарт

Аляксандр Лукашэнка даручыў у бліжэйшыя гады давесці аб'ём будаўніцтва за мяжой да 1 млн кв.м. Як далажылі Прэзідэнту, у 2012 годзе ў Беларусі плануецца пабудаваць 5,7 млн кв.м жылля і яшчэ 700 тыс. кв.м будзе пабудавана за мяжой. «Цяпер мы ўжо выйшлі на пляцоўкі Венесуэлы, Расіі і рухаемся ў гэтым напрамку», — адзначыў намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у Беларусі ёсць добрыя магчымасці для папулярызацыі сваіх будаўнічых паслуг за мяжой, перш за ўсё ў Расіі. «У нас ёсць адзін добры рычаг. Там не хапае будаўнічых матэрыялаў, такіх як шчэбень, цэмент і інш.», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У сувязі з гэтым ён прапанаваў дамаўляцца аб пастаўках з Беларусі дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў у абмен на будаўнічы падрад. «Яны з задавальненнем, асабліва расіяне, згодзяцца», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што ў Расіі існуе значная патрэбнасць у кваліфікаваных будаўнічых кадрах. «Расія нядрэнна цяпер прымае нашых будаўнікоў», — канстатаваў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр Якабсон, дадаўшы, што асабліва гэта датычыцца домабудаўнічых камбінатаў.

«Трэба выходзіць за мяжу і там будаваць, ісці да таго мільёна паслуг у будаўніцтве за мяжой, аб якім мы нексалі дамаўляліся. Якія тэрміны? Я не хачу гаварыць год-два, але ў бліжэйшы час міністр павінен далажыць, што мільён (квадратных метраў. — **Заўвага БЕЛТА**) за мяжой будуюць і прывозяць у краіну валюту», — даручыў Аляксандр Лукашэнка.

**Абзац**

◢ У Беларусі па санітарна-эпідэмічных паказчыках купанне забаронена ў 12 месцах масавага адпачынку. У Брэсцкай вобласці ў спіс непрыдатных для купання месцаў трапілі пляж «Цэнтральны» (левы і правы бераг у раёне моста па бульвары Шаўчэнкі) на рацэ Мухавец у Брэсце, а таксама зоны адпачынку каля ракі Чаква (вёска Рубель, Столінскі раён), вадасховішча Жабер (Драгічынскі раён), возера аграгарадка Хмелева (Жабінкаўскі раён), вадасховішча Мышанка (Баранавічы), вадасховішча Гаць і сажалкі Палонка (Баранавіцкі раён). Закрыты для купання зоны адпачынку каля чатырох азёр Полацкага раёна: Гомель, Янова, Суя, Шчаты. Забаронена купанне ў рацэ Іпуць Добрушскага раёна.

◢ **Суд Першамайскага раёна Мінска вынес прыгавор адносна былых дырэктара і начальніка аддзела РУП «Будтэхнорм» і начальніка аддзела нарміравання і стандартызацыі ўпраўлення Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі. Яны прызнаны вінаватымі ў тым, што ўчынілі крадзеж Br986 млн. Былы кіраўнік «Будтэхнорм» прыгавораны да 6 гадоў пазбаўлення волі. Другі прадстаўнік гэтага прадпрыемства атрымаў 5 гадоў пазбаўлення волі, а чыноўнік Мінбудархітэктуры — 5 гадоў і 6 месяцаў. Па папярэдняй змове гэта група на працягу 3 гадоў афармляла фіктыўныя дагаворы падраду на выкананне розных распрацовак. Іх фінансаванне ажыццяўлялася за кошт сродкаў інавацыйнага фонду Мінбудархітэктуры. Для спісання і атрымання наяўных сродкаў выкарыстоўваліся лжэпрадпрымальніцкія структуры. Акрамя таго, заключаліся фіктыўныя дагаворы падраду з фізічнымі асобамі. Як мяркуюць праваахоўнікі, кропка ў гэтым злачынстве не пастаўлена.**

**Поўны абзац**

◢ У Аўстраліі забаранілі катам гуляць па начах. Улады Сіднэя ўвялі каменданцкую гадзіну для катоў. На такія меры пайшлі ў пяці прыгарадах горада пасля серыі нападаў хатніх гадаванцаў на апосумаў. Чаму каты менавіта зараз адкрылі начное паляванне — невядома. Па звестках абаронцаў дзікіх звяроў, толькі за гэты год каты 564 разы рабілі замах на жыццё звяркоў. Цяпер уладальнікі катоў павінны трымаць іх ноччу толькі дома.

◢ **Амерыканец загінуў, прайграўшы ў «рускую рулетку» ўласнаму сабаку. Расел Літл, жыхар горада Саўт-Бэнд (Індыяна, ЗША) прыставіў пісталет да галавы свайго сабакі і двойчы націснуў на спускавы кручок. Але абодва разы баёк ударыў па пустых гнёздах. Затым ён накіраваў зброю на сябе — раздаўся стрэл. Па словах удавы, яе муж доўгі час быў у дэпрэсіі. Напярэдадні ён доўгі час прасядзеў у двары дома, ужываючы самагонку. Затым вырашыў згуляць з сабакам у «рускую рулетку». Пасля ракавога стрэлу жонка выклікала экстраныя службы. У цяжкім стане Расела даставілі ў мясцовую бальніцу, але праз 45 хвілін ён памёр.**



◢ У раёне Алтуф'еўскай шашы Маскоўскай кальцавой дарогі качка з качанятамі на пэўны тэрмін заблакавалі рух транспарту. Калі на дарогу выйшла качыная сямейства, кіроўцы сталі тармазіць побач з птушкамі, прапускаючы іх. Дарогу качкам саступалі не толькі ўладальнікі легкавых аўто, але і кіроўцы грузавога транспарту. У рэшце рэшт качка перавяла сваіх птушанят на знешні бок МКАД, знайшоўшы ў раздзяляльным бар'еры адтуліну. Падчас пераходу дарогі ні дарослая птушка, ні яе вывадак не пацярпелі. З машынамі таксама ўсё ў парадку. Як мяркуецца, качыная сям'я ішла ад сажалкі да іншага вадаёма. Затор на дарозе расцягнуўся на даволі вялікую адлегласць.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ НАРОДНАГА АРТЫСТА РСФСР МІХАІЛА ДЗЯРЖАВІНА З 75-ГОДДЗЕМ

**«За многія гады плённай працы вы сыгралі дзясяткі яркіх роляў у тэатры, кіно і на эстрадзе, чым унеслі важкі ўклад у развіццё савецкага і расійскага мастацтва. Вялікі талент і акцёрскае майстэрства прынеслі вам шырокае прызнанне і заслужаную любоў гледачоў», — гаворыцца ў віншаванні.**

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі добра ведаюць і цэняць творчасць Міхаіла Дзяржавіна. «Няхай яна і ў далейшым радуе паклоннікаў, умацоўвае дружалюбныя сувязі народаў Беларусі і Расіі», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

## АФІЦЫЙНАЕ АПУБЛІКАВАННЕ — НА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПРАВАВЫМ ІНТЭРНЭТ-ПАРТАЛЕ

**Нарматыўна-прававыя акты ўрада і Нацбанка змогуць афіцыйна публікавацца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Рэспублікі Беларусь. Адпаведны ўказ № 248 «Аб некаторых пытаннях афіцыйнага апублікавання нарматыўных прававых актаў» 13 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Дакумент падпісаны ў мэтах аператыўнага ўвядзення ў дзеянне прымаемых урадам, Нацыянальным банкам і рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання нарматыўных прававых актаў, накіраваных на стабілізацыю сітуацыі на спажывецкім і валютным рынках.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## АДКЛАДЗЕНА ЎВЯДЗЕННЕ СВАБОДНЫХ АДПУСКНЫХ ЦЭН НА АЛКАГОЛЬ

**Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе міністэрства.**

Пастановай Мінэканомікі ад 13 чэрвеня 2011 года № 89 прыпынена на два месяцы ўступленне ў сілу пастановы Мінэканомікі ад 31 сакавіка 2011 года № 49 «Аб устанаўленні гранічных мінімальных цэн на алкагольную прадукцыю мацункам больш за 28 працэнтаў і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь», якая прадугледжвае павышэнне мінімальных цэн у сярэднім на 8,4 працэнта. Уступіць у сілу гэта пастанова павінна была 15 чэрвеня.

Цяпер, да ўступлення ў сілу пастановы Мінэканомікі № 49, будуць па-ранейшаму прымяняцца фіксаваныя рознічныя цэны на гарэлку, адпускныя цэны на спірт этылавы з харчовай сыравіны і мінімальныя адпускныя цэны на алкагольную прадукцыю мацункам вышэй за 28 працэнтаў, прадугледжаныя пастановай Мінэканомікі ад 18 жніўня 2010 года № 126 (са змяненнямі і дапаўненнямі).

**Кампетэнтна**

## Нацбанк лічыць сённяшні абменны курс адзіным і раўнаважным

**НАЦЫЯНАЛЬНЫ банк апублікаваў прэс-рэліз, дзе гаворыцца пра тое, што рублёвыя і інвалютныя ўклады насельніцтва ў пераліку на нацыянальную валюту на пачатак чэрвеня дасягнулі 27,7 трыльёна беларускіх рублёў (на 1 студзеня 2011 г. яны складалі амаль 23 трыльёны). Пры гэтым удакладняецца, што *«іх павелічэнне абумоўлена ўстанаўленнем новага цэнтральнага значэння рублёвага кошту кошыка замежных валют у сувязі з выхадам 24 мая на адзіны раўнаважны курс беларускага рубля на ўсіх сегментах унутранага валютнага рынку».***

Мы па тэлефоне папрасілі **Анатоля ДРАЗДОВА, прэс-сакратара Нацыянальнага банка,** патлумачыць, што разумеецца пад адзіным і раўнаважным курсам беларускага рубля:

— Гэта як хто захоча паглядзець. Я магу выказаць толькі тое, як мы разумеем цяпер: гэта курс, які, па-першае, забяспечвае неабходны ўзровень падтрымкі экспарту, а па-другое, не прыводзіць да істотнага росту інфляцыі ў краіне. Вось такая наша пазіцыя.

***— Значыць, калі я правільна разумею, з цягам часу ўсе павінны да гэтага курсу і прыйсці?***

— Вы правільна разумееце.

***— Але пакуль ні насельніцтва, ні нават дзяржаўныя прадпрыемствы нешта не вельмі да яго імкнуцца. Што павінна для гэтага адбыцца? Час павінен нейкі прайсці?***

— Напэўна, так, патрэбны час.

***— Як вылічваецца раўнаважны курс?***

— Ён вызначаецца, зыходзячы з многіх фактараў па складанай формуле — на пальцах гэтага не патлумачыш.

Нагадаем, што сёння 1 долар па курсе Нацыянальнага банка каштуе каля 5 тысяч беларускіх рублёў (калі быць дакладнымі, то на 16 чэрвеня курс устаноўлены ў памеры 4 988 рублёў за адзін амерыканскі долар).

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

МУС:

# «У НАС ЁСЦЬ ІНФАРМАЦЫЯ, ШТО МОГУЦЬ УЧЫНЯЦЦА ПРАВАКАЦЫІ»

**ТАКУЮ заяву, каментуючы сітуацыю з утварэннем у сацыяльных сетках суполак з недвухсэнсоўнымі заклікамі, зрабіў сёння часова выконваючы абавязкі начальніка ўпраўлення інфармацыі грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ.**

Паводле яго слоў, апошні час у інтэрнэце, асабліва ў сацыяльных сетках, актыўна распаўсюджваецца інфармацыя з заклікамі да ўдзелу грамадзян у розных несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. «Органы ўнутраных спраў сумесна з іншымі праваахоўнымі структурамі гэтую інфармацыю ўважліва адсочваюць і правяраюць», — падкрэсліў чыноўнік.

У прыватнасці, як зазначыў Канстанцін Шалькевіч, зараз вядзецца актыўная работа па ўстанаўленні асоб, якія не толькі размяшчаюць гэтую інфармацыю на сайтах, але і даюць указанні на яе размяшчэнне:

— З вялікай доляй верагоднасці можна канстатаваць, што такія заклікі накіраваны на дэстабілізацыю становішча ў грамадстве, на ўцягванне простых грамадзян да ўдзелу ў масавых беспарадках, а таксама да таго, каб улады прынялі нейкія меры ў адказ.

Каментуючы інфармацыю пра магчымую блакіроўку сацыяльных сетак, Канстанцін Шалькевіч прызнаўся, што сам гэтай інфармацыі не бачыў. «А каб МУС нейкім чынам прымала ўдзел у блакіроўцы сацыяльных сетак — гэта не зусім наш накірунак дзейнасці», — адказаў ён.

— Органы ўнутраных спраў гатовы забяспечыць парадак у нашай краіне, гатовы забяспечыць правы і законныя інтарэсы нашых грамадзян, гасцей нашай краіны. Любыя спробы пасягнуць на законныя інтарэсы нашых грамадзян будуць спыняцца ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам.

Адказваючы на пытанні журналістаў, прадстаўнік МУС адзначыў, што такія формы заклiку (праз інтэрнэт) адносяцца да новых спосабаў арганізацыі масавых беспарадкаў:

— Усе гэтыя мерапрыемствы несанкцыянаваныя. І ў нас ёсць інфармацыя пра тое, што падчас такіх мерапрыемстваў могуць учыняцца розныя правакацыі, праз якія могуць пацярпець мірныя грамадзяне. З улікам таго, што падобная сітуацыя ўжо была абыграна ў Брузгах, калі з боку пікетуючых нехта распыліў газ, а на наступны дзень прайшла інфармацыя, што гэта зрабілі ўлады, можна зрабіць вывад, што такія ж метады могуць быць прыменены на любой з гэтых акцый.

Як пацвердзіў Канстанцін Шалькевіч, у МУС ёсць падставы меркаваць, што на падобных мерапрыемствах з боку правакатараў могуць прымяняцца спецыяльныя сродкі — у прыватнасці, узрыўныя пакеты, петарды і нават агнястрэльная зброя.

**Ілья ЛАПАТО.**

Шануй сваё!

# ПАДАРУНАК МАМЕ, ВЁСЦЫ, КРАІНЕ

## зрабіў расійскі бізнэсмен, ураджэнец вёскі Клятное

**У аўторак, на трэці дзень Тройцы, у Пружанскім раёне прайшло ўрачыстае адкрыццё турыстычнага комплексу, які на вачах вырас у невялічкай пушчанскай вёсачцы Клятное.**


Турыстычная вёска.

Гэта адзін з аб'ектаў на новай аб'язной дарозе вакол Нацыянальнага парку «Белавежская пушча». Сёння ўсе месцы ў новай турысцкай вёсцы занятыя. Госці з Расіі, Украіны, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, іншых краін адпачываюць у пушчанскім краі. Адзін з новых домікаў спецыяльна не засялялі, прытрымалі, каб паказаць падчас адкрыцця-прэзентацыі. І сапраўды, жыць у такіх апартаментах, трэба думаць, адно задавальненне: пах жывога дрэва сцен спалучаецца з арыгінальным дызайнам абстаноўкі, плюс суперсучасныя выгоды, спадарожнікавае тэлебачанне, інтэрнэт, раскошная мэбля. І яшчэ шмат мілых дробязяў, якія прыцягваюць турыста нават з багатых Арабскіх Эміратаў. Тамтэйшыя наведнікі найперш шукаюць холаду, у іх летам з-за гарачыні наогул знаходзіцца на вуліцы немагчыма, жыцьможна толькі ў памяшканні з кандыцыянерамі.

А людзі з поўначы Расіі знаходзяць у нас цяпло. Прырода тут прыгожая, усё дыхае спакоем і цішынёй. Птушкі спяваюць на ўсе лады. Вялікі штучны вадаём упрыгожаны выгнутымі масткамі. А з невялікай цаглянай вежы, стылізаванай пад даўніну, добра праглядаецца ваколіца і ўдалае архітэктурнае рашэнне самой турысцкай вёскі. На гары стаіць вятрак, але гэта не муляж. Гэта сучасная міні-электрастанцыя на сонечных батарэях.

Яшчэ ёсць рэстаран, лазня, саўна, спартыўны комплекс. Апошні — не проста спартзала з трэнажорамі і іншым стандартным наборам. Тут зроблены пляцоўкі для гульнявых відаў спорту, у якіх можна праводзіць сур'ёзныя спаборніцтвы. Казалі, што літаральна днямі пройдзе чэмпіянат вобласці па баскетболе для юніёраў.

А колькі розных фішак, забаўлянак, прынад для турыста! І першая з іх — коні, на якіх можна пакатацца, а вопытныя інструктары нават навучаць, як правільна трымацца ў сядле. Акрамя стайні, ёсць аўчарня, кароўнік. Свая чарада авечак разведзена для таго, каб рэстаран штодня забяспечваўся экалагічна чыстым мясам. Ну а каровы — для малака, масла, якое будуць збіваць рукамі на вачах у цікаўных турыстаў. Расказваць можна і пра шыкоўны дом гаспадара з мармуровым фантанам, дзе прадугледжана некалькі нумароў для VIP-персон, пра новую экалагічную сцяжыну, на якой можна адчуць некранутасць пушчы. Расказваць можна многа, але лепш на новую вёску ўсё ж паглядзець, калі з'явіцца такая магчымасць.

Гаспадар сядзібы Мікалай БУРНАС, які нарадзіўся ў вёсцы Клятное, здзівіў журналістаў, калі сказаў, што пра таную вёску ён марыў... калі яшчэ падлеткам тут пасвіў кароў. Мабыць, тая самая мара і стымулявала яго на ўсё, што адбылося з ім пазней.


Канстанцін СУМАР і Мікалай БУРНАС.

А пазней ён адкрыў свой бізнэс у суседняй краіне, разбагацеў, потым вярнуўся ў родную вёску, каб адрадзіць яе, вярнуць да новага жыцця. І пабудаваў тут усё, што штрыхамі абмалявана вышэй. Як чалавек прадпрымальны, Мікалай Аляксеевіч упэўнены, што праект хутка акупіцца. У кулуарах адкрыцця казалі, што ўкладзеныя сродкі вымяраюцца прыкладна двума дзясяткамі мільёнаў долараў.

Але на гэтым бізнэсмен спыняцца не збіраецца:

— Мы разглядаем магчымасць будаўніцтва іншых аб'ектаў па перыметры аб'язной дарогі. Найперш гатэля. Пазней з'явяцца такія ж прыкладна вёскі, як у Клятным, іх мае быць некалькі.

Як прадпрымальнік Мікалай Бурнас разважае эканамічнымі катэгорыямі, а як ураджэнец гэтых мясцін, як сын сваёй маці, ён гаворыць зусім інакш. Наогул падчас адкрыцця віноўнік урачыстасці сказаў вельмі кароткую прамову. І ўсе даведаліся, чаму адкрыццё было запланавана на 14 чэрвеня: у маці Мікалая Веры Мікалаеўны дзень нараджэння. Таму ўся імпрэза, усе песні ў выкананні ансамбля «Сябры» з Мікалаем Ярмоленкам, пружанскіх артыстаў, былі прысвечаны ёй. Седзячы на адным з першых радоў побач з вясковымі жанчынамі, Вера Мікалаеўна змахвала слязінкі. І было відаць, як яна ганарыцца сынам.

Ганарацца земляком і аднавяскоўцы. Усе прыйшлі на мерапрыемства ў святочных строях з дзецьмі, унукамі, падышлі жыхары суседніх вёсак.

Як сказаў падчас адкрыцця туркомплексу старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР, дзякуючы земляку Мікалаю Бурнасу вёска Клятное будзе жыць у новай якасці — вёска, якая аб'ектыўна трапіла б у разрад выміраючых, бо ўсе яе жыхары — пенсіянеры. Губернатар падзякаваў бацькам, настаўнікам, усёй грамадзе, якая выхавала чалавека, сённяшняга інвестара перспектыўнага праекта. Яшчэ кіраўнік вобласці запэўніў прысутных, што аблвыканкам і надалей будзе падтрымліваць намаганні інвестараў па развіцці турызму як па перыметры новай аб'язной дарогі, так і ва ўсёй вобласці.

***

***Калі са старой часткі Клятнога трапляеш у новую турыстычную вёску, такое ўражанне, што трапіў на нейкія здымкі фільма, што гэта ўсё нерэальна. Яно і нерэальна пакуль для нас, сярэднестатыстычных беларусаў. У сэнсе, не па кішэні. Але ж калі падобных аб'ектаў стане болей, ёсць некаторае спадзяванне, што з'явяцца вёскі і для нас, дзе можна будзе прыехаць з сям'ёй адпачыць. Толькі для гэтага спачатку, відаць, павінны прыехаць госці з Расіі, Эміратаў, іншых краін, пакінуць свае долары, якія запрацуюць на развіццё разнастайнай інфраструктуры.***

**Святлана ЯСКЕВІЧ. Фота аўтара.**
*Пружанскі раён.*

# СПЯКОТА. ХОЧАЦЦА НА ПЛЯЖ! КУДЫ?

**Карэспандэнт «Звязды» па Віцебскай вобласці ў рабочы час пабываў на пляжах, у зонах адпачынку, але не адпачываў — пастараўся на месцах атрымаць адказ на пытанні: ці адпавядаюць пляжы патрабаванням часу і ці навучыліся мы культурна адпачываць на прыродзе? Дарэчы, а дзе ў Віцебску афіцыйныя пляжы?**

Звязаўся з таварыствам выратавання на водах. Маўляў, масквічы ў госці прыехалі, куды з імі можна на пляж схадзіць? Высветлілася, што толькі пляжная зона ў віцебскім парку сямейнага адпачынку імя Савецкай Арміі на беразе Заходняй Дзвіны легальная. Стан пляжа стараюцца дагледзець камунальнікі, тут дзяжураць выратавальнікі. Але ж нармальных умоў, на жаль, пакуль што не стварылі. Так, у самім парку арганізаваны гандаль і праводзяцца розныя культурныя праграмы. Але ад пляжа да ўсяго гэтага параўнальна далёка. Няўжо па шашлык, квас і гэтак далей я пайду ў глыбіню парку? Акрамя таго, ёсць і яшчэ адзін у гэтым жа парку пляж, ды «дзікі», у сэнсе неафіцыйны. Толькі чаму?

На беразе Заходняй Дзвіны, недалёка ад каледжа сувязі, пляж, з берага якога добра бачная галоўная плошча Віцебска, зусім не абсталяваны. Ні лежакоў, ні месцаў для пераапранання няма, а дзе прыбіральні? І нічога не змянілася з савецкіх часоў. Чаму б не зрабіць пасля добраўпарадкавання гэты пляж — фактычна ў самым цэнтры горада — платным і не зарабляць на паслугах? Карыстаючыся тым, што людзей тут заўсёды шмат.

А дзе пляж на беразе ракі Віцьба? Так, дзякуй уладам, рэчышча ракі пашырылі, арганізавалі пракат малых суднаў, добры гандаль, і выратавальнікі працуюць, каб не танулі адпачывальнікі. А дзе ж сам пляж? З пясочкам, з тымі ж лежакамі? Дарэчы, нейкая дзіўная сітуацыя: тлумачаць спецыялісты, што афіцыйнага пляжа тут насамрэч і няма. Ды і купацца ў рацэ тым ж выратавальнікі мне і маім «масквічам» не раілі, бо якасць вады «не ўнушае даверу».

Возера Сосны ў вёсцы Доўжа — адно з любімых месцаў адпачынку. Сярод аўто, прыпаркаваных недалёка ад мясцовай крамы, ёсць машыны і з расійскімі нумарамі. Возера цягнецца ўздоўж транзітнай дарогі ў суседнюю краіну. Накомт умоў для адпачынку, тут зроблена многае: арганізаваны пракат лодак, катамаранаў, ёсць добраўпарадкаваны пляж. Калі параўнаць з тым, што было яшчэ гады два таму, слоў няма — добра. Мо і зараз усяго б гэтага не было, калі б не заклік кіраўніцтва вобласці да мясцовых уладаў — стварыць у вёсцы сучасны турыстычны цэнтр. Нават з верталётнай пляцоўкай. Але ж недахопы ёсць. І пра іх расказалі адпачывальнікі. У прыватнасці, хочацца людзям больш пунктаў харчавання. Ды і чаму б не прымаць турыстаў здалёк з начоўкай? Прама на тым жа пляжы запрасіць у цікавае падарожжа па тэрыторыі раёна з экскурсіяй у сталіцу «Славянскага базару».

Возера Лосвіда — добра знаёмае месца адпачынку не толькі жыхарам Віцебска, ад якога яно недалёка. Пляж на момант майго прыезду быў, мякка кажучы, далёкі ад ідэальнага стану. Ставяць машыны адпачывальнікі недалёка ад берага, у так званай водаахоўнай зоне. Паўсюль — сляды ад вогнішчаў. Хто сочыць за парадкам? Вядома, калі пападзешся пры парушэнні на вочы эколагам, аштрафуюць. Дык не будзе ж за кожным пляжам сачыць прадстаўнік экалагічнай службы?

Пра тое, што, на жаль, большасць пляжаў не адпавядае існуючым патрабаванням, пісалася шмат. І ў выніку? Як расказалі кампетэнтныя адказныя асобы, нярэдка чыноўнікам працуей зрабіць так, каб пляж такім на паперы не з'яўляўся. Калі няма афіцыйнага пляжа, дык і ламаць галаву не трэба, каб ім займацца. Прыкладаў прыватных пляжаў і зон адпачынку ва ўсёй краіне, на жаль, яшчэ мала. Нявыгадны бізнэс? Дык вывучайце вопыт нават не Турцыі, а суседніх краін Еўрасаюза, дзе дзелавыя людзі і ў глыбінцы зарабляюць па прынцыпе: дзе людзі, там павінны быць паслугі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Кніжная паліца

# «ЖЫВЁМ НА СВЕЦЕ ТОЛЬКІ РАЗ»

**Пад такой назвай у выдавецтве «Народная кніга» выйшаў зборнік апавяданняў, нарысаў і бывальшчын Міхася Кучко на рускай і беларускай мовах.**




«Тут і Чарнобыль, горкімі і цяжкімі шляхамі якога прайшоў аўтар кнігі, і далёкія ўжо па часе, але блізкія ўсім нам па крыві і духу падзеі Вялікай Айчыннай, і бясконцыя вандроўкі па любімым ім Палессі, і цікавыя рыбацкія гісторыі з абавязковай юшкай ля дымнага кастра на беразе прыгажуні Прыпяці, і трапны гумар...» — піша ў прадмове да кнігі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Міхась Башлакоў. Простая лаканічная мова, якой напісана кніга, будзе зразумелая любому чытачу. А важныя для людзей тэмы, якія закранае аўтар, пераконваюць, што кніга пісалася проста пра людзей і для людзей. Некаторыя творы можна назваць хутчэй рэпартажамі, таму што аўтар па-журналісцку востра і па-рэпарцёрску жвава намагаецца напісаць, напрыклад, аб праблеме забруджвання рэк і азёраў альбо прэзентуе нам свае апытанні і інтэрв'ю са сведкамі Чарнобыля альбо Вялікай Айчыннай вайны.

Хоць большую частку кнігі складаюць рускамоўныя апавяданні, яна называецца ўсё ж такі пабеларуску — «Жывём на свеце толькі раз». Кніга Міхася Кучко праўдзівая і проста распавядае пра разнастайны вопыт аўтара і герояў яго апавяданняў, чые прататыпы кожны можа лёгка адшукаць у рэальным жыцці.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

## ЧАС, ПРАВЕДЗЕНЫ ПЕРАД ТЭЛЕВІЗАРАМ, АДНІМАЕ ГАДЫ ЖЫЦЦЯ



**Усяго дзве гадзіны, выдаткаваныя на прагляд тэлепраграм, павялічваюць рызыку заўчаснай смерці, папярэджваюць даследчыкі. Такім чынам, кожныя дзве гадзіны павялічваюць верагоднасць смерці раней 65 гадоў да 13%, піша часопіс Journal of the American Medical Association.**

Чыннік у наступным: адсутнасць фізічнай актыўнасці пагражае развіццём дыябету 2 тыпу і сардэчных хвароб, устанавілі супрацоўнікі Гарвардскай школы грамадскага здароўя.

Даследчыкі Андрэс Гронтвед і Фрэнк Ху канстатуюць: у сярэднім еўрапейцы марнуюць па тры гадзіны ў дзень на прагляд тэлевізара. Аўстралійцы — чатыры гадзіны, а амерыканцы — пяць. Да сумных высноў адносна наступстваў падобнага рэжыму навукоўцы прыйшлі, прааналізаваўшы восем даследаванняў, якія апісвалі стан здароўя сотняў чалавек на працягу 1970-2011 гадоў. Аказалася, дзве гадзіны, праведзеныя перад тэлевізарам, павялічвалі рызыку развіцця дыябету да 20% і рызыку развіцця хвароб сэрца — да 15%.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Чэхія адмовілася ад удзелу ў амерыканскай сістэме ПРА

**Чэхія адмовілася ад удзелу ў амерыканскай сістэме супрацьракетнай абароны, якую Вашынгтон разгортвае на тэрыторыі краін Усходняй Еўропы. Пра гэта заявіў чэшскі міністр абароны Аляксандр Вондра.**

Паводле слоў Вондры, які 15 чэрвеня правёў перамовы з намеснікам кіраўніка Пентагона Уільямам Лінам, Прагу не задавальняе роля, якую ёй адводзілі амерыканцы ў сваёй сістэме супрацьракетнай абароны. Пры гэтым кіраўнік чэшскага абароннага ведамства адзначыў, што Чэхія гатова супрацоўнічаць з ЗША, але не ў той меры, як таго хочуць у Вашынгтоне. Рэакцыя амерыканцаў на заяву Вондры пакуль невядомая.

Перамовы пра ўдзел Чэхіі ў сістэме ПРА пачаліся яшчэ пры ранейшым амерыканскім прэзідэнце Джорджу Бушу. Згодна з першапачатковым планам, на чэшскай тэрыторыі павінен быў з'явіцца радар, а ў суседняй Польшчы — дзесяць ракет-перахопнікаў. Аднак у далейшым новая адміністрацыя Барака Абамы прапанавала новы праект ПРА з лімітаваным чэшскім удзелам. У прыватнасці, Вашынгтон вырашыў пабудаваць у Чэхіі не радар, а ўсяго толькі цэнтр ранняга папярэджання пра ракетную пагрозу, чым выклікаў абурэнне чэшскага боку. У красавіку 2011 года Прага заявіла, што збіраецца закрыць ваенны палігон, дзе раней планавалася размясціць радар амерыканскай сістэмы ПРА.

### За новую зніжку на газ Украіна можа перадаць Расіі завод атамнага машынабудавання?

**У абмен на новую зніжку на газ Расія можа атрымаць кантроль над Адэскім прыпартовым заводам, а таксама харкаўскім прадпрыемствам "Турбаатам". Як піша ўкраінская газета "Дзелавая сталіца", Кіеў ахвотней расплаціўся б з Масквой прадпрыемствамі, чым уступам у Мытны саюз.**

"Што сапраўды гатовы гарантаваць расіянам украінскія перагаворшчыкі, дык гэта сакрэтнае палітычнае садзейнічанне ў атрыманні кантролю над стратэгічнымі актывамі. Гэта, перш за ўсё, харкаўскі завод атамнага машынабудавання "Турбаатам", у якім украінская дзяржава валодае 75% акцый, гаворыцца ў публікацыі].

Пра тое, што Расія зацікаўлена ўдзельнічаць у яго развіцці, нядаўна заяўляў кіраўнік "Расатама" Сяргей Кірыенка. Паводле яго слоў, Расія гатова стварыць на базе завода сумеснае прадпрыемства з расійскім "Атамэнергамашам" для вытворчасці новага пакалення турбін для атамнай прамысловасці. Цікавасць расіян да "Турбаатама" зразумелая: каб пабудаваць аналагічны завод з нуля, спатрэбілася б не менш чым дзесяць гадоў і мільярдныя інвестыцыі, піша ўкраінская газета.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАЦВЕРДЗІЎ ПАГАДНЕННЕ АБ ПРАДАСТАЎЛЕННІ БЕЛАРУСІ ФІНАНСАВАГА КРЭДЫТУ АНТЫКРЫЗІСНАГА ФОНДУ ЕЎРАЗЭС

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 15 чэрвеня падпісаў указ нумар 251, якім зацверджана Пагадненне аб прадастаўленні фінансавага крэдыту са сродкаў Антыкрызіснага фонду Еўразійскага эканамічнага супольніцтва паміж Рэспублікай Беларусь і Еўразійскім банкам развіцця, падпісанае ў Мінску 9 чэрвеня 2011 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ZALA: новы крок у беларускамоўным кірунку

**Днямі сайт інтэрактыўнага тэлебачання ZALA набыў не толькі новы выгляд, але і беларускамоўную версію.**

Нагадаем, што прэзентацыя першага беларускамоўнага брэнда ZALA адбылася яшчэ ў верасні 2009 года. Усе рэкламныя і прома-матэрыялы рыхтаваліся на беларускай мове, тэлевізійныя рэкламныя ролікі таксама «размаўлялі» з гледачамі па-беларуску. Як вынікала са слоў кіраўнікоў кампаніі «Белтэлекам», беларуская мова была абраная для правядзення рэкламай кампаніі тэлебачання новага пакалення невыпадкова: па-першае, каб пацвердзіць нацыянальную прыналежнасць новай гандлёвай маркі, а па-другое, каб «з прыцэлам» вырасціць брэнд нацыянальнага маштабу. З'яўленне беларускамоўнай версіі сайта — гэта працяг канцэпцыі нацыянальнага беларускамоўнага брэнда, з нагоды якой інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA і атрымала сваю назву: за лацінскімі літарамі хаваецца беларускае слова «зала».

ZALA прадстаўлена на тэрыторыі ўсёй Беларусі, і яе абанентамі ўжо сталі больш за 290 тысяч чалавек. 90 працэнтаў гледачоў інтэрактыўнага тэлебачання пражываюць зусім не ў сталіцы, а ў райцэнтрах, аграгарадках, пасёлках гарадскога тыпу — там, дзе няма кабельнага ці спадарожнікавага тэлебачання, але ёсць стацыянарная тэлефонная сувязь (хоць можна быць адначасова абанентам і кабельнага, і інтэрактыўнага тэлебачання). Але галоўная адметнасць інтэрактыўнага тэлебачання — гэта магчымасць кіраваць тэлеэфірам і ладзіць яго пад сябе.

А з 1 чэрвеня інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA запусціла тэставае вяшчанне 3D-канала, які даступны абанентам HD-пакета. Прыстаўка (Settopbox), якая падтрымлівае фармат высокай выразнасці, прадастаўляецца кожнаму абаненту HD-пакета. 3D-канал — гэта першы крок да з'яўлення ў нашых дамах перадач і фільмаў з аб'ёмнымі вывамі і адзін з элементаў тэлебачання высокай выразнасці, які стаў новым стандартам якасці. Абавязковай умовай для прагляду аб'ёмных выяў з'яўляецца наяўнасць тэлевізара з функцыяй падтрымкі 3D і сумяшчальных з ім актыўных 3D-акуляраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## У ДЗЕНЬ ЮБІЛЕЮ — БЯСПЛАТНЫ ІНТЭРНЭТ. І НЕ ТОЛЬКІ

Новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі, у будаўніцтве якога прымала ўдзел уся краіна, сёння адзначае сваё 5-годдзе з дня адкрыцця для карыстальнікаў. Свой першы юбілей самы вялікі ў свеце «алмаз» сустракае годна: за гэты час лік наведвальнікаў склаў больш за 4,6 млн, а лік віртуальных наведванняў перавысіў 7 млн, паведамілі «Звяздзе» ў бібліятэцы. Кожны дзень тут выдаюць чытачам каля 10 тыс. кніг. Агульны лік чытачоў сёння — 170 тыс. чалавек.

У дзень юбілею чытачы НББ змогуць бясплатна карыстацца інтэрнэтам, скарыстацца паслугай капіявання электроннай інфармацыі на здымны носьбіт (акрамя музычных твораў), а таксама пакінуць дзяцей у дзіцячым пакоі бібліятэкі пад наглядам кваліфікаваных спецыялістаў. Акрамя таго, тых, хто запісаўся ў бібліятэку 16 чэрвеня, чакае бясплатная экскурсія па «алмазе ведаў».

**Ул. інф.**

## У Фрунзенскім раёне нованароджаных часцей за ўсё называюць Максімамі і Дар'ямі

**У тройку самых папулярных імёнаў нованароджаных у раёне цяпер уваходзяць Аляксей, Арцём і Ганна, Паліна.**

Сярод рэдкіх імёнаў, якімі назвалі малых жыхары раёна, — Патап, Сава, Фелікс, Натан, Каміла, Марыям, Радзіслава, Мар'я. Сёлета ў загсе Фрунзенскага раёна зарэгістравалі 2020 нованароджаных — 1157 хлопчыкаў і 1063 дзяўчынак. Самай маладой маці 16 гадоў, бацьку — 18. Самым сталым — 44 і 62 адпаведна.

**Вераніка ЛЕБЕДЗЕВА,** *«Мінск—Навіны».*

| *Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.06.2011 г. (для б/н разлікаў)* | | | | *Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ* | |
|---|---|---|---|---|---|
| ▲1 долар ЗША | 4 988,00 | 1 чэшская крона | 296,57 | USD | 27,8957 |
| ▼1 еўра | 7 164,76 | 1 польскі злоты | 1821,80 | 10 UAH | 34,9351 |
| 1 латвійскі лат | 10 114,57 | ▲1 расійскі рубель | 178,81 | 1000 BYR | 56,0267 |
| 1 літоўскі літ | 2 076,56 | украінская грыўня | 624,28 | EUR | 40,1280 |


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
*в. Вязынка, Маладзечанскі раён.*

# РЭСУРС, З ЯКІМ МЫ ПЕРААДОЛЕЕМ УСЕ ЦЯЖКАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Цікава, ці ёсць ужо нейкія дывідэнды, практычныя плён для нашай краіны ад дзейнасці Мытнага саюза і ад ратыфікаванага пакета мытных пагадненняў?***

— Плён ёсць, і дынамічна нарошчваецца, пра што можаце меркаваць па такой статыстыцы: два гады назад, да стварэння Мытнага саюза, тавараабарот паміж Беларуссю, Расіяй і Казахстанам складаў 24 мільярды долараў, а цяпер ён дасягнуў 29 мільярдаў долараў. За гэты ж час амаль на 3 мільярды долараў павялічыўся наш экспарт у Расію і Казахстан, дасягнуўшы каля 10 мільярдаў долараў. Уніфікацыя заканадаўства адыгрывае, несумненна, вельмі пазітыўную ролю ва ўмацаванні эканамічнага ўзаемадзеяння.

Зразумела, прававыя нормы, што фіксуецца дзяржавамі-ўдзельніцамі Мытнага саюза сёння, праз пэўны час могуць радагавацца пры патрэбах практыкі, і гэта нармальна, бо патэнцыял інтэграцыі будзе выкарыстоўвацца, я ўпэўнены, ва ўсё большай меры. Літаральна праз лічаныя дні, з 1 ліпеня 2011 года, мытны кантроль паміж трыма краінамі перамесціцца з нашых міждзяржаўных граніц на знешнюю граніцу Мытнага саюза. А праз шэсць месяцаў, з 1 студзеня 2012 года, запрацуе Адзіная эканамічная прастора — агульны рынак са свабодным перамяшчэннем тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы. Гэта значыць, што эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі, Расіі і Казахстана выводзіцца на прынцыпова новую, больш высокую арбіту ў інтарэсах нашых дзяржаў і народаў.

***— Працяглы час на слыху праект Закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Можаце сказаць, калі будзе пастаўлена кропка ў яго дапрацоўцы?***

— Яна пастаўлена ўжо. Другое чытанне законапраекта запланавана на бліжэйшы час. Гэты дакумент сістэмнага характару, важны найперш сацыяльна, таму і адшліфоўваўся, зыходзячы з важнасці рэгулюемых пытанняў.

***— Яго прыняцця стане, напэўна, яшчэ адной адметнасцю сесіі?***

— Законапраект вельмі важны. З аднаго боку, устаноўлена адказнасць арганізацый і службовых асоб за парушэнне парадку разгляду зваротаў, а з другога боку — абараняючы правы і законныя інтарэсы грамадзян, дакумент прадугледжвае таксама адказнасць заяўнікаў за парушэнне заканадаўства пры падачы і разглядзе зваротаў. Дэпутаты профільнай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі шмат папрацавалі над гэтым законапраектам разам з іншымі ўдзельнікамі заканатворчага працэсу. Усе прынцыповыя пытанні ўзгоднены.

***— У чым сутнасць важнейшых прававых нававядзенняў, зафіксаваных у законапраекце?***

— Ключавыя моманты наступныя. Устаноўлены патрабаванні да пісьмовых адказаў на пісьмовыя звароты, асноўныя з якіх — абгрунтаванасць і матываванасць адказаў, канкрэтнасць фармулёвак, пры неабходнасці са спасылкамі на заканадаўства. Вызначаны парадак разгляду калектыўных зваротаў, прычым зварот за подпісам трыццаці і больш грамадзян разглядаецца з выездам на месца. Уведзены электронныя звароты. І яшчэ адна навацыя — прадастаўлена права па рашэнні кіраўніка дзяржаўнага органа або арганізацыі выкарыстоўваць на асабістым прыёме тэхнічныя сродкі, паведамі́ўшы аб гэтым заяўніцелю загадзя, да пачатку прыёму.

***— З якой мэтай уносяцца ўжо шырока «агучаныя» папраўкі ў Закон «Аб барацьбе з карупцыяй»?***

— Комплекс мер процідзеяння карупцыі стане больш шырокім. Задача змяненняў і дапаўненняў галоўным чынам папераджальная, прафілактычная. Уводзіцца шэраг абмежаванняў у дачыненні да дзяржаўных службовых асоб, да якіх прапануецца аднесці ўсіх дзяржаўных служачых, а таксама прыроўненых да дзяржаўных службовых асоб — кіраўнікоў арганізацый, доля дзяржаўнай уласнасці ў статутным фондзе якіх не менш за палову. Папраўкі ў Закон павінны пасадзейнічаць больш эфектыўнаму процідзеянню злоўжываннем службовымі паўнамоцтвамі, павышэнню адказнасці чыноўнікаў і іншых дзяржаўных службовых асоб, выкараненню ўмоў, што могуць выкарыстоўвацца для супрацьзаконных паводзін.

***— Нядаўна Палата прадстаўнікоў заслухала і зацвердзіла справаздачу аб выкананні бюджэту дзяржаўнага пазабюджэтнага Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны за 2010 год. Летась у адпаведнасці з указамі Прэзідэнта пераразлікі працоўных пенсій зроблены тройчы, акрамя таго, чатыры разы павышаліся мінімальныя і сацыяльныя пенсіі, а таксама надбаўкі да іх. Ці будуць і ў далейшым прадпрымацца меры па сацыяльнай абароне?***

— Такія меры прадпрымаюцца. Адна з іх — павышэнне працоўных пенсій з 1 чэрвеня. Вы ведаеце, што кіраўнік дзяржавы абавязаў урад забяспечыць сацыяльную абарону людзей. Урад працуе над дадатковымі мерамі па аказанні адраснай сацыяльнай дапамогі, будзе кампенсавацца заробатная плата работнікаў бюджэтнай сферы. Пашырыцца пералік тавараў, цэны на якія рэгулюе дзяржава.

***— Што вы пажадалі б простым людзям, якія замаркоціліся ад росту цэн, выкліканага фінансава-эканамічнымі складанасцямі, што ўзніклі ў нашай краіне ў апошнія месяцы?***

— Не драматызаваць сітуацыю. Не падаць духам. Праяўляць цярпенне. Калі кожны з нас будзе эфектыўна працаваць на сваім рабочым месцы, з такім невычэрпным рэсурсам усе цяжкасці мы абавязкова пераадолеем.

**Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.**

## А не шкодзь!

### ЗА ЛІНЯ ЛОДКУ, ЗА КАРАСЁЎ — ЛЕГКАВІК?

**Ляснік Бярэзінскага лягаса і рабочы адасобленага структурнага падраздзялення «Бярэзінскі спіртзавод» РУП «Мінск-Крышталь» вырашылі парыбачыць на вадаёме паблізу вёскі Высокая Гара. Толькі ў якасці прыладаў для лоўлі чамусьці абралі забароненыя сеткі.**

Іх у браканьераў мелася ажно сем агульнай даўжынёй 368 метраў. Плюс гумавая лодка. Налавіць «рыбакі» паспелі 36 асобінаў залатога карася і аднаго ліня, пакуль іх не спынілі работнікі Бярэзінскай міжрайінспекцыі. Лодка канфіскаваная. Легкавы аўтамабіль «Рэно-Меган», што належыць лесніку, арыштаваны і змешчаны на штрафстаянку.

Шкода ацэненая ў больш чым 2,5 мільёна рублёў. Вырашаецца пытанне крымінальнай адказнасці браканьераў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АБАРАНІЦЬ НАЖЫТАЕ

**Аснашчэнне сродкамі ахоўнай сігналізацыі пакуль выконваецца па старых расцэнках. Зараз на складах падраздзяленняў аховы ёсць апаратура, закупленая на аснове конкурсаў. Пры новых закупках яе кошт будзе вышэй. Устаноўка сігналізацыі застаецца, бадай, самым эфектыўным сродкам абароны маёмасці.**

Як адзначае намеснік начальніка ўпраўлення сродкаў і сістэм аховы Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Ігар БРЭЛЬ, дзякуючы надзейнаму функцыянаванню сродкаў сігналізацыі і зладжанай працы нарад груп затрымання летась было спынена 55 спробаў пранікнення ў жылыя дамы і памяшканні, затрымана 49 праваапарушальнікаў. За пяць месяцаў гэтага года спынена падобных 16 спробаў і затрымана 19 праваапарушальнікаў. Большасць пранікненняў у памяшканні з сігналізацыяй мае месца ў прыватных дамах.

Ахоўныя сродкі выконваюць і прафілактычную «місію». Самі зламыснікі прызнаюць, што ахоўная «кнопка» нярэдка адбівае ў іх жаданне звязвацца з такім аб'ектам. Па гэтай прычыне ў Віцебску наогул набірае папулярнасць устаноўка муляжа сігналізацыі. Супрацоўнікі МУС падтрымліваюць любыя ахоўныя мерапрыемствы па абароне грамадзянамі сваёй маёмасці, паколькі самае горшае ў такім выпадку — не рабіць нічога. А за мяжой лічаць, што пры нармальным падыходзе да справы 5-10 працэнтаў таго, што зарабляеш непасільнай працай, неабходна траціць на яго абарону.

Паводле слоў намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення — начальніка ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Рамана МЕЛЬНІКА, кожны грамадзянін, асабліва ў летні час, павінен звярнуць увагу на некалькі важных момантаў. Дзверы, напрыклад, павінны быць металічнымі (толькі не пустацелымі), з двума сучаснымі замкамі (між іншым, лічыцца, што замок страчвае свае запіральныя вартасці на працягу трох гадоў). Трэба, праўда, мець на ўвазе, што, па вялікім рахунку, замкі адкрываюцца на працягу літаральна ад 2 секунд да некалькіх хвілін. Шклопакеты неабходна дадаткова аснашчаць шпінгалетамі, паколькі яны вельмі лёгка выціскаюцца а гэта звычайна толькі спрыяе больш хуткаму пранікненню ў памяшканне. Здаваць кватэру ці жылы дом пад ахову можна на любы тэрмін (напрыклад, на час адсутнасці па прычыне ад'езду ў адпачынак), і зрабіць гэта можна хутчэй, чым устанавіць новыя дзверы.

За 5 месяцаў зарэгістравана звыш 24 тысяч крадзяжоў маёмасці. З іх 25 працэнтаў — крадзяжы з кватэр або прыватных дамоў, 5 працэнтаў — з садовых домікаў і дач. 40 працэнтаў крадзяжоў з жылых дамоў прыпадае на сельскую мясцовасць, дзе апошнім часам праводзіцца вельмі актыўная адпаведная прафілактычная работа з насельніцтвам.

Падазронымі асобы былі ўстаноўлены ў 68 працэнтах выпадкаў. Палова крадзяжоў з кватэр і дач здзяйсняецца асобамі, якія нідзе не працуюць і не вучацца, а трэць мае судзімасць.

Нягледзячы на тое, што ў апошнія гады колькасць крадзяжоў маёмасці зніжаецца, МУС не стамляецца нагадваць аб тым, што парадак можа быць толькі тады, калі ёсць удзел кожнага ў яго забеспячэнні. Аднак неабходна правядзенне і больш маштабнай работы, разлічанай не на адзін год. Так, па даручэнні Савета Міністраў МУС сумесна з зацікаўленымі праводзіць распрацоўку праекта нарматыўнага прававога акта, які рэгламентуе пытанні функцыянавання сістэм відэаназірання, устаноўленых у грамадскіх і іншых месцах, у тым ліку пад'ездах дамоў, выкарыстання атрыманых звестак у папярэджанні правапарушэнняў, устаноўленні асоб, якія іх здзейснілі. Паводле новага дакумента, забеспячэннем сістэмамі відэаназірання павінен займацца ўласнік канкрэтнага суб'екта гаспадарання. Якім чынам, за чый кошт і ў якім парадку будзе ажыццяўляцца падобная работа, гэта і павінен растлумачыць новы дакумент.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Палітыкаў Літвы захапіў узровень нашай сельскай гаспадаркі

**Член Сейма Літвы Ёнас Рамонас прыйшоў у захапленне ад развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі, паведамляе i-Dela, праект групы незалежных журналістаў Еўрасаюза. Парламентарыя ўразілі лічбы па надоях і экспарце малака, тэхналогіі, парадак і чысціня на палях, добрыя дарогі і іншая інфраструктура.**

«Мы паехалі азнаёміцца з сельскай гаспадаркай, — сказаў Ёнас Рамонас i-Dela. — Яна аказалася на вельмі высокім узроўні. Вядома, і ў нас ёсць фермеры, гаспадаркі вельмі добрага ўзроўню, аднак калі ўлічыць, колькі ў сярэднім яны выпрацоўваюць прадукцыі, як выглядаюць палі, жывёлагадоўчыя комплексы, колькі інвестуюць, колькі будуюць, то тут беларусы напераджаюць прыкладна на 20-30 гадоў. Вядома, яны ўсяго гэтага дабіваюцца адміністрацыйнымі мерамі». Палітык разам з членам партыі «Парадак і справядлівасць» Эгідыюсам Клумбісам сустрэліся і з міністрам сельскай гаспадаркі Беларусі Міхаілам Русым, даведаліся, што да 2015 года выбітворчасць малака павінна вырасці ўдвая: калі сёння выпрацоўваецца 7,5 млн тон малака, то праз чатыры гады будзе 14-15 млн тон.

**Настасся КАПІЧЫНА.**

## Перапіс пёрыстага насельніцтва

У заказніку «Спораўскі» распачаўся перапіс птушак. Спецыялісты грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», іх калегі з Нідэрландаў і Вялікабрытаніі вядуць арніталагічны ўлік птушак. Асаблівая ўвага надаецца рэдкім птушкам, такім як вяртлявая чаротаўка, драч, дупель, вялікі бугай.

**Яна СВЕТАВА.**

## Трапіў пад сустрэчны

Мужчына, жыхар Баранавічаў, на чыгуначным пераездзе па вул. Кірава прапусціў цягнік, выйшаў на чыгуначнае палатно і трапіў пад сустрэчны. А загінулага пазней убачыў машыніст хуткага цягніка.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Яшчэ зусім нядаўна Максім Мірны быў зоркай беларускага спорту першай велічыні — перамогі ў Кубку Дэвіса і высокі рэйтынг на турнірах. Але спартыўны век кароткі — на змену поспехам Максіма прыйшлі гучныя перамогі іншых атлетаў, і Мірнага ўсё часцей запісвалі ў разрад ветэранаў. На мінулым тыдні Максім прымусіў узгадаць пра сябе: ён выйграў турнір Вялікага шлема — «Ралан Гарос» — у парным разрадзе разам з канадцам Даніэлам Нестарам. Гэта 39-ты парны тытул у яго кар'еры. Усяго ж Мірны мае 5 перамог на турнірах Вялікага шлема, 3 з іх — у Парыжы. Прыехаўшы ў Мінск, Максім расказаў чаму так і не адсвяткаваў перамогу ў сталіцы Францыі, чаму ён зайздросціць звычайным людзям і гатовы памяняцца з імі месцамі, і прызнаўся, што нават у крызіс не пашкадаваў, што ўклаў грошы ў беларускі бізнэс. Максім не шкадаваў сябе і расказваў... А пасля гутаркі, калі Мікалай Мірны ўбачыў мокрую ад поту кашулю сына і не ўтрымаўся: «Ну, ты, Макс, быццам бы турнір згуляў».**



Пераможца парнага «Ралан Гарос» Максім МІРНЫ:

# «У ПАРЫЖЫ НЕ БЫВАЕ «ЗЛІЎНЫХ» МАТЧАЎ»

***— Максім, як адсвяткавалі перамогу?***

— Ніяк яшчэ. Магчыма, у жніўні знойдзем час арганізаваць пампезнае святкаванне. Гуляць мы скончылі ў дзевяць вечара, а цягнік у Лондан адыходзіў у шэсць раніцы. Трэба было рыхтавацца да наступнага турніру ў Вялікабрытаніі.

***— Вы прызвычаіліся да перамог, а як успрынялі перамогу ваш партнёр Даніэл?***

— Што значыць, я прызвычаіўся? Ён прызвычаіўся яшчэ больш. У мяне 39 парных тытулаў, а ў яго — 72! Ён зараз самы тытулаваны гулец ITP-тура. Мы з Даніэлам партнёры толькі на корце, таму прафесійна павіншавалі адзін аднаго. Калі б сябравалі па-за кортам, магчыма, больш аб'ёмна адсвяткавалі б. Хоць гэта важны этап у нашым жыцці. Здараецца, што людзі гуляюць 5-6 гадоў разам і не могуць выйграць Вялікі шлем. А мы пасля 6 месяцаў партнёрства пераадолелі гэты бар'ер.

***— Для вас лепш сябраваць з партнёрам?***

— Калі можна дасягнуць таго, што сапраўды сябруеш па-за кортам, то гэта будзе толькі на руку партнёрству і на выніку адаб'ецца так, як гэта мы бачым у братоў Браянаў.

***— Максім, атрымліваецца, што французскія корты для вас шчаслівыя...***

— Хочацца вярнуцца ў далёкі 91-ы год, калі адбылася мая першая паездка за мяжу ў складзе зборнай СССР. У камандзе 14-гадовых тэнісістаў я паехаў у горад Тарк на поўдні Францыі. Я паказаў самы лепшы вынік сярод членаў нашай каманды, дабраўшыся да чвэрцьфіналу. Тыя ўспаміны дзяцінства, якія звязаны з гэтым турнірам, мяне агортваюць падчас выступлення ў Парыжы. Увогуле на турнірах у Францыі ў мяне 7 перамог. Я заўсёды з азартам імкнуся вучыць французскую мову. Але ў мяне на гэта не хапае часу, і я «стопаруся» пасля кожнага чарговага параграфа. Але не страчваю надзеі пазнаць французскую лепш.

***— Ваша перамога стала магчымай яшчэ і таму, што браты Браяны загадзя вылецелі...***

— Мы не надта засмуціліся, што яны вылецелі. Выпадкова ў фінал ніхто не трапляе. На «Ралан Гарос» кожныя 2-3 гады выскоквае такая вось каманда, складзеная з добрых адзіночных гульцоў. Магчыма, таму, што гэта Парыж, прычым у тую пару года, калі ўсё квітнее навокал, таму не бывае там «зліўных» матчаў, якія сустракаюцца ў халодным асеннім Шанхаі, калі адзіночнікі, прайграўшы ў адзіночным разрадзе, спяшаюцца ўз'ехаць куды-небудзь у Еўропу і рыхтавацца да заканчэння сезона. У Парыжы ўсе абставіны спрыяльныя для таго, каб выступаць. Прычым на кортах «Ралан Гароса» такое пакрыццё, што можна тупа стаяць у абодвух ззаду і перамагаць. Гэтая пара, з якой мы сышліся ў фінале, у такую тактыку слепа верыла і, безумоўна, уяўляла сябе чарговымі чэмпіёнамі. Узрадаваўшыся, што Браяны прайгралі ў паўфінале, мы адразу ўздрыгнулі, бо не хацелі быць чарговай сенсацыяй у руках гэтых навічкоў на парным туры.

***— Як вы выбіраеце партнёраў? Збоку здаецца, што вы можаце перамагаць у пары з любым тэнісістам?***

— Гэта зусім не так. У 2008-м я выступаў з Джэмі Мюрэем, братам знакамітага Энндзі Мюрэя. Мы выдатна сябравалі, але выйграць нам удалося толькі на адным шэраньскім турніры. І толькі тое, што мы Браянаў у фінале абыгралі, было нашым ганарам 2008 года. Ва ўсіх астатніх выпадках мы саступалі ва ўзроўні. Уступаючы ў партнёрства, ты аналізуеш: ці не мы абодва занадта непаваротлівыя ці наадварот; у нас самыя лепшыя рукі, ногі, мы ўсіх дагонім і пераможам.

***— Здараецца, што ў выбары партнёра не сыходзіцеся ў меркаваннях з бацькам?***

— Здаралася, і не раз. І на мой жаль, я вынікам не мог даказаць сваю правату. Былі выпадкі, калі бацькі не было на турнірах, і я прымаў рашэнні сам, і атрымлівалася, што яго флюіды спрацоўвалі на мой няспех.

***— Вашы дзеці аваладалі ракеткай?***

— Зараз яны з задавальненнем займаюцца два разы на тыдзень у нашым цэнтры ў Малінаўцы. Там выдатныя трэнеры, і мне падабаецца, як яны ставяцца да дзяцей. Калі мы жывём у Фларыдзе, то сумуем па нашых зімовых традыцыях. Непадалёк ад дома ёсць закрыты каток для падрыхтоўкі хакеістаў і фігурыстаў, дзеці і там займаюцца фігурным катаннем. Ад школы яны ездзяць на ўсходнія адзінаборствы. Такое агульнае развіццё, каб пасля яны маглі самастойна зрабіць выбар.

***— Максім, ваш бізнэс у Беларусі павялічваецца: кавярня, тэнісны цэнтр, будаўнічая кампанія. Гэта значыць, што вашу будучыню вы звязваеце з вяртаннем у Мінск? Не пашкадавалі ў перыяд крызісу, што ўклалі грошы?***

— Ніколькі не пашкадаваў. Не бывае крызісу бясконцага — чорная паласа змяняецца белай. Я таксама, маючы свае прадпрыемствы, імкнуся балансаваць, каб выжыць у гэты цяжкі перыяд. Але не сумняваюся, што ўсё пройдзе, проста трэба набрацца цярпення. Мы ж не афрыканскія плямёны, а нармальныя адукаваныя людзі, і ўсё ў нас павінна быць добра. А што да вяртання, то я і не з'язджаў. Проста апошнія 20 гадоў я вельмі актыўна раз'язджаю па свеце ў межах свайго турнірнага графіка. У мяне былі думкі развіваць штосьці пасля актыўнай спартыўнай кар'еры. З часам мы абраслі такімі актывамі ў выглядзе спартцэнтраў і рэстаранаў, каб пасля спорту было чым заняцца. Мне гэта прыносіць задавальненне, прычым мая сям'я вельмі дапамагае, асабліва бацька. Хочацца верыць, што я змагу зрабіць гэты пераход ад спартсмена да нармальнага чалавека, які займаецца іншай працай, прачынаецца ў адзін і той жа час кожную раніцу і ідзе спаць у адзін і той жа час. Калі прасачыць мой сённяшні тыднёвы графік, ён падаецца б вам дзікім, і вы б іншаму паглядзелі на жыццё прафесійнага спартсмена.

***— Цікава, што там дзікага...***

— Такія, рэчы, як харчаванне і сон, цалкам пераварочваюцца з ног на галаву. На турніры ў Квінсе на мінулым тыдні мы сядзелі на корце ад 8 да 10 гадзін проста ў чаканні выхаду. Адпаведна, калі ты выходзіш на корт, ты павінен быць гатовым лепш, чым супернік. Таму ты трэніруешся разы чатыры на дзень, ісці пры гэтым не можаш, бо не ведаеш, праз 20 хвілін гуляць ці праз 2 гадзіны. Харчуешся арэшкамі ці семкамі, каб падтрымліваць узровень энергіі. Выходзіш, размінаешся, а потым зноў ідзе дождж... Ведаючы пра такія дні, ты, як хакеіст, прыходзіш з вялікім рукзаком з рэчамі, бо прыходзіцца 4 разы памыцца ў душы і пераапрануцца. Калі такі дзень заканчваецца і ўдалося згуляць, трэба дзесьці хутчэй павячэраць, каб назаўтра неяк устаць на ногі. Забягаеш па дарозе дадому, купляеш піццу ці сасіскі з сокам. Кладзешся спаць, а ў галаве пракручваецца карціна прайшоўшага дня. А калі прайграў — то гэта круціцца аж да раніцы. У сем раніцы звоніць будзільнік, усё трэба пачынаць нанава, а ты разумееш, што галава трохвугольная і перад табой стаяць новыя задачы. А патэлефанаваў дадому, там свае праблемы... Тыдзень за тыднем гэта накопліваецца. Прыходзіцца пераехаць з Масквы ў Шанхай, вярнуцца, а там туман, а там вулкан і вылет адмяніў... У нейкай ступені я зайздрошчу звычайным людзям. Давайце памяняемся ненадоўга?

***— Наперадзе ў вас Уімблдон, падзяліцеся планамі на гэты турнір.***

— Я намецяў трэніроўку на пятніцу ў Лондане, хачу зноў адчуць гэтую слізкую траву, некалькі разоў упасці, спадзяюся, што паспяхова, без траўмаў. Спадзяюся атрымаць позні старт, каб патрэніравацца 4-5 дзён і максімальна падрыхтавацца. А што датычыць выніку, то вельмі важна прайсці першы круг. Гэта і перадстартавае хваляванне, і самы першы час абыгрась лідара, які не адчуў турнірнага духу і не разыграўся. Ну, а далей — куды коні вывезуць.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# РАССЛАБІЛІСЯ І БЫЛІ ПАКАРАНЫ

## Наша «маладзёжка» не здолела датэрмінова прайсці ў плэй-оф

**Працягнуць удалы старт на чэмпіянаце свету ў Даніі ў нашай маладзёжкі не атрымалася. Выйграўшы першы матч у ісландцаў, мы саступілі ў другім гаспадарам-датчанам — 1:2. Прычым абсалютна справядліва.**

Забіўшы на 20-й хвіліне (вызначыўся Дзмітрый Бага), наша каманда нават не паспела адсвяткаваць і як след усвядоміць свой поспех, як атрымала адказ. Міхаіл Сівакоў парушыў правілы ў штрафной, і Крышціян Эрыксан рэалізаваў 11-метровы. Гэты абмен галамі пайшоў на карысць дацкай дружыне: каманда стала атакаваць больш упэўнена і дасягнула свайго. На 71-й хвіліне Ёргенсен устанавіў канчатковы лік 2:1. Але, калі б не Гутар, нашу каманду мог чакаць разгром.

Прычыны паражэння патлумачылі нашы гульцы:

— Магчыма, вельмі рана скокнуў, калі прабівалі пенальці. Мяч трапіў мне ў грудзі і адскочыў да Эрыксана. Пашанцавала супернiку, а не мне. Магчыма, мы дзесьці спалохаліся, што забілі гол. Страцілі на дзве хвіліны канцэнтрацыю — і атрымаўся такі момант. Магчыма, і лепш, калі б не было гэтага абмену і лік заставаўся нуль-нуль, — расказаў пасля матча наш варатар **Аляксандр ГУТАР**. З ім пагадзіўся і абаронца **Сяргей ПАЛІЦЭВІЧ**:

— Пэўная расканцэнтрацыя была. Падумалі, што калі забілі, то далей усё само сабой пойдзе. Расслабіліся — вось нас і пакаралі.

Нягледзячы на паражэнне, трэнер нашай каманды **Георгій КАНДРАЦЬЕЎ** з аптымізмам глядзіць на апошні матч групавога турніру:

— На жаль, у нас не атрымалася гульня ў пас. Рабілі шмат непатрэбных страт. Замест таго, каб праводзіць хуткія атакі ў адказ, мы гублялі мяч і давалі суперніку шанцы, якія ён скарыстаў. Я ведаю, што шмат галявых момантаў у нас не будзе. Пасля таго, як каманда забівае гол, яна, як ні дзіўна, робіцца ўразлівай. Мы страцілі канцэнтрацыю і тут жа прапусцілі гол у адказ. Але мы будзем спакойна рыхтавацца далей. Пакуль ёсць шанцы, трэба за іх змагацца. Мы не раз траплялі з камандай у складанае становішча, але з гонарам з яго выходзілі. Спадзяюся, выйдзем і зараз.

Сапраўды, вырашальная гульня ў нашай каманды наперадзе — у суботу супраць швейцарцаў. У другім матчы групы, дарэчы, швейцарцы абыгралі ісландцаў, і цяпер турнірнае становішча наступнае: Швейцарыя — 6 ачкоў, Данія — 3, Беларусь — 3, Ісландыя — 0. Нам трэба перамагаць швейцарцаў для выхаду ў плэй-оф. У выніку нічыёй нас выратуе паражэнне датчан ад ісландцаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ПАТАНУЎ, КАЛІ ВУЧЫЎ ПЛАВАЦЬ СВАЮ ЖОНКУ

**Высветлены абставіны гібелі мінчаніна ў канале Сляпянскай воднай сістэмы паблізу вуліцы Філімонава ў мінулую суботу. Як паведаміў старшы памочнік пракурора Мінска Сяргей Балашаў, мінчанін патануў, калі вучыў плаваць сваю жонку.**

Ён разам з жонкай і сябрамі адпачываў на беразе. Кампанія вырашыла пакупацца. Аднак жонка маладога чалавека адмовілася, спаслаўшыся на няўменне плаваць. Тады муж прапанаваў навучыць яе. У час навучальнага працэсу муж і жонка пачалі тануць. Сябрам удалося выратаваць толькі жанчыну.

**Марына КАСЦЮКЕВІЧ,** *«Мінск—Навіны».*

## У Мінску прынятыя меры па недапушчэнні распаўсюджвання эшэрыхнозу —

цяжкага захворвання стрававальнай сістэмы, якое ўспыхнула ў многіх краінах свету. Як паведаміла урач-эпідэміёлаг цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Цэнтральнага раёна сталіцы Сняжана Несцярук, цяпер у краіне дастаўка кожнай партыі імпартнай гароднiны адсочваецца да месца рэалізацыі: правяраюцца дакументы і сертыфікаты на тавар, у лабараторыі гарадскога Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі даследуюцца пробы на ўзбуджальнікаў хваробы. Таксама прынята рашэнне аб забароне выкарыстання агароднiны, якая паступіла ў сталіцу па імпарце, для прыгатавання страў ва ўстановах адукацыі, арганізацыях аховы здароўя, дзіцячых дашкольных і санаторна-курортных аздараўленчых установах.

У розных дзяржавах ужо больш за 2 тысячы хворых на эшэрыхіяноз. Ёсць смяротныя выпадкі. Сімптомы хваробы — крывавая дыярэя, гарачка і рвота. Заражэнне адбываецца праз ежу: агародніну, садавіну, малако і малочныя прадукты, ваду, а таксама праз прадметы штодзённага ўжытку.

**Любоў ЯГОРАНКАВА,** *«Мінск—Навіны».*

# АЧАГ КУЛЬТУРЫ — АЧАГ ПАЖАРУ

**Што магло стаць прычынай узгарання клуба ў вёсцы Дзяржынск Лельчыцкага раёна: прамое трапленне маланкі, неасцярожнае абыходжанне з агнём або парушэнне правілаў эксплуатацыі электраабсталявання — пакуль дакладна невядома. Зразумела толькі, што цяпер вяскоўцы засталіся без Дома культуры, які разам з апаратурай згарэў ушчэнт. Людзі не пацярпелі. Напярэдадні ва ўстанове культуры мерапрыемствы не праводзіліся.**

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што па выніках планавай праверкі, якая праводзілася тут у пачатку года, кіраўніцтву сельскага Дома культуры было прапанавана прывесці ў парадак электраправодку, абсталяваць будынак абаронай супраць маланкі і сістэмай пажарнай сігналізацыі, забяспечыць персанал спраўнымі сродкамі індывідуальнай абароны органаў дыхання і іншае. Не паспелі.



Між тым, у дачыненні да 11 клубаў Лельчыцкага раёна (у іх ліку і Дзяржынскі) вынесены папярэджанні пра забарону эксплуатацыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота МНС.**

Да ведама!

# МЕДЫКІ РЭКАМЕНДУЮЦЬ У СПЯКОТУ ГУЛЯЦЬ БАСАНОЖ ПА ТРАВЕ

**У спякоту рэкамендуецца часцей бываць за горадам і пры першай магчымасці гуляць басанож па траве, паведамілі БЕЛТА ў аддзеле грамадскага здароўя Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

На ступнях размешчана мноства кропак, якія адказваюць за работу арганізма, у тым ліку за тэрмарэгуляцыю.

Каб лягчэй пераносіць гарачае надвор'е, медыкі рэкамендуюць выконваць некалькі асноўных правілаў. У прыватнасці, адмовіцца ад салодкіх напояў на карысць мінеральнай вады. У ёй змяшчаюцца мікраэлементы, якія аднаўляюць водна-салявы баланс, бо менавіта соль і ваду чалавек страчвае ў спякоту. У сонечнае надвор'е неабходны галаўны ўбор. Лепш за ўсё выбіраць шыракаполыя капелюшы або панамы, якія цалкам закрываюць галаву ад сонечных праменяў. Яны абароняць ад лішку ультрафіялету далікатную скуру твару і вочы.

Калі асноўную частку дня прыходзіцца праводзіць на працы і ў душным памяшканні, можна пакласці пад язык лядзяш. На ніжнім баку языка знаходзіцца кропка, якая стымулюе работу сардэчна-сасудзістай сістэмы і танізуе арганізм. Дапаможа арганізму і зялёная гарбата. Высокая тэмпература напою прымушае арганізм пацець. Выпараючыся з паверхні скуры, вільгаць выносіць з сабой частку цеплыні, і ў выніку арганізм ахалоджваецца. Лягчэй перанесці спякоту дапаможа мята. Яе лісточак трэба расцерці ў руках і на працягу хвіліны націраць ім скроні. У мяце прысутнічае ментол, які валодае ахаладжальным эфектам, а на скронях сасуды размешчаны блізка да паверхні скуры, і прахалода хутчэй дабярэцца да іх.

Улетку лепш насіць адзенне светлых адценняў: яно адбівае сонечныя прамені. Звыклую біжутэрыю лепш замяніць упрыгажэннямі з горнага хрусталю. Гэты мінерал убірае ў сябе гарачыню, але навобмацак застаецца халаднаватым. Тым, хто карыстаецца касметыкай, медыкі раяць выбіраць сродкі, якія не ўтрымліваюць алеі, а крэмы на воднай аснове, якія адлюстроўваюць ультрафіялет і не перашкаджаюць дыханню скуры.



У спякоту ў арганізме асабліва хутка з'яўляюцца свабодныя радыкалы, якія разбураюць сасуды і выклікаюць дачаснае старэнне. Нейтралізуе свабодныя радыкалы вітамін С. Спецыялісты рэкамендуюць з'ядаць у дзень па дольцы лімона або па 10 ягад чорных парэчак, у якіх утрымліваецца дзённая доза гэтага вітаміну. Аднавіць сілы ў гарачы дзень дапаможа і зялёны суп. Трэба надзерці агуркоў, нарэзаць зяленіва і заліць усё мінеральнай вадой.

**Кар. БЕЛТА.**

ЗВЯЗДА 16 чэрвеня 2011 г.

# «ШКЛЯНКА НАПАЛОВУ ПОЎНАЯ»:

## як стаматолаг можа стаць прадзюсарам, а настаўніца пачатковых класаў — артысткай

Ілья ЛАПАТО

**...У маім класе вучылася дзяўчына, у якой быў добры атэстат. А яна не ведала, куды ісці і, хвалюючыся за паступленне, падала дакументы ў першы паток. У выніку паспяхова паступіла... на бібліятэкара. Паступіла на бюджэт, таму забіраць дакументы і паступаць з другім патокам ўжо не рызыкнула. Так і вучылася ўсе пяць гадоў. А сёння працуе ў турфірме. Логікі тут няма, я з вамі пагаджуся. Але, як кажуць аптымісты, — шклянка напалову поўная: калі стаць спявачкай не дазволіла шасцёрка па гісторыі, засмучацца не варта. Хто ведае, дзе і як вы будзеце працаваць у выніку.**

**Напрыклад, літаратар Пятро Васючэнка думаў стаць біёлагам, тэлевядучы «АНТ» Аляксандр Сярэбраннікаў — прафесійны спартсмен, а Уладзімір Кубышкін, прадзюсар Ані Шаркуновай, па адукацыі... стаматолаг. Каб падбадзёрыць сёлетніх абітурыентаў, «Звязда» адшукала цікавае і незвычайнае ў біяграфіях вядомых беларусаў і распытала, як вызначаліся з выбарам будучай прафесіі ў свой час яны.**



### СА СТУДЭНТКІ-МІЖНАРОДНІЦЫ Ў... ФОТАМАДЭЛЬ І ПАПУЛЯРНУЮ ТЭЛЕВЯДУЧУЮ

**ТВОРЧАЯ біяграфія тэлевядучай «АНТ» <u>Сашы ПАЎЛАВАЙ</u> не можа не здзіўляць. Дзяўчына сем гадоў пражыла ў Галандыі, дзе з прыбіральшчыцы офісных памяшканняў стала ў выніку папулярнай тэлевядучай, сумяшчаючы працу на тэлебачанні з працай фотамадэлі. Саша здымалася ў серыялах, а ў 2006 годзе нават перамагла ў галандскай версіі праекта «Апошні герой». Аднак мала хто ведае, што тэлевізійны дэбют дзяўчыны адбыўся... на БТ, калі Сашы Паўлавай было ўсяго 10 гадоў...**

**ЯК ГЭТА БЫЛО**

— З дзесяці гадоў, калі я, дарэчы, працавала ў БТ адной з вядучых дзіцячай праграмы, я марыла стаць журналістам. Вядома ж, я ўяўляла сябе Сайманам Ханам (з фільма «The Hunting Party»). Вельмі хацелася сустракацца з цікавымі людзьмі, вандраваць, на сабе адчуць усе цяжкасці прафесіі, рызыку, прызнанне, славу...

Аднак пасталеўшы, калі мой рамантычны настрой змяніўся на прагматычны, я паступіла ў БДУ на прэстыжны факультэт — факультэт міжнародных адносін (далей — ФМА. — **Аўт.**).

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА**

— Вучыцца страшэнна падабалася! Калі шчыра, я не ўзгадаю нават лішніх прадметаў і ніякія прадметы не давала б — нагрузка была вельмі моцная. Плюсы вучобы на ФМА — гэта фундаментальныя веды, мовы, сябры і незабыўныя моманты бесклапотнага студэнцтва! З мінусаў — толькі сесіі (смяецца. — **Аўт.**).

**СЁННЯ...**

— Сёння я ТБ-вядучая, што, вядома, мае мала агульнага з ФМА. Аднак па гэтай спецыяльнасці я працавала і ў Нідэрландах, дзе атрымала адукацыю ТБ-вядучай і ТБ-прадзюсара ў Медыя-акадэміі. У планах — засвоіць яшчэ пару замежных моў. Зараз я свабодна размаўляю на галандскай, англійскай і іспанскай. Спадзяюся, хопіць сіл засвоіць кітайскую.

### З ПРАДЗЮСАРА Ў... ДЫРЭКТАРА МАДЭЛЬНАГА АГЕНЦТВА

**ДЫРЭКТАР вядомага мадэльнага агенцтва «Студыя моды Сяргея Нагорнага» <u>Сяргей НАГОРНЫ</u> лічыць, што ў тым узросце, калі моладзь пакідае школу, яшчэ цяжка вызначыцца з тым, чым хочаш займацца ўсё жыццё. Але як бы ні рэкламавалі прафесіі, лепш ісці туды, куды падказвае ўласны голас. Сам Сяргей Нагорны так і зрабіў.**

**ЯК ГЭТА БЫЛО:**

— Улічваючы, што я нядрэнна маляваў, пасля школы я хацеў паспрабаваць сябе ў дызайне адзення або мэблі. Але я дакладна ведаў, што хацеў бы атрымаць вышэйшую адукацыю. Я скончыў школу якраз у гады перабудовы. Гады перамен — якраз у гэты час з'яўляюцца першыя камерцыйныя ВНУ ў Беларусі. Таму я прыйшоў да парога толькі што створанага Інстытута сучасных ведаў. І хоць самы разрэкламаваны факультэт у ВНУ быў эканамічны, я падаў дакументы на факультэт «Прадзюсарства ў сферы мастацтва».



**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА:**

— Я акунуўся ў атмасферу творчасці, атмасферу людзей, якія жылі культурай краіны. Гэта не былі выкладчыкі, якія толькі чытаюць студэнтам лекцыі.

Гэта былі выкладчыкі-практыкі: кінарэжысёр Ігар Дабралюбаў («Белыя росы»), дырэктар «Клас-клуба» Генадзь Шульман, доктар мастацтвазнаўства Надзея Высоцкая — яна, лічы, выратавала старажытнабеларускае мастацтва; беларускі драматург Уладзімір Рудаў, рэжысёр вядомага спектакля «Камедыя»; Ларыса Фінкельштэйн, дырэктар аўтарскай канцэптуальнай галерэі «Брама».

А ёсць і выкладчык, для якога я спачатку быў студэнтам, а сёння стаў босам. Гэта Дзіна Георгіеўна Тыцюк, якая выкладае ў маёй подыум-школе этыкет і сцэнічнае майстэрства.

**СЁННЯ...**

— Я думаю, усё маё жыццё будзе звязанае з модай. Свой факультэт я рэкамендую і многім сваім мадэлям. Зараз даводзіцца пісаць за іх дыпломныя працы *(смяецца. —* **Аўт.**). Жартую. Я толькі дапамагаю.

### СА СПАРТСМЕНА Ў... ТЭЛЕВЯДУЧЫЯ

**ВЯДУЧЫ інфармацыйных праграм АНТ <u>Аляксандр СЯРЭБРАННІКАЎ</u> у кадры працуе ўжо дзявяты год — з моманту стварэння тэлеканала. Мы настолькі звыкліся з яго «тэлевізійным» амплуа, што, напэўна, вельмі здзівіліся б, калі б аднойчы пабачылі Аляксандра з вінтоўкай у руках...**

**ЯК ГЭТА БЫЛО:**



У школе Аляксандр Сярэбранікаў па прыкладзе бацькі рыхтаваўся да кар'еры ваеннага, нават збіраўся паступаць у вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча. Ён сур'ёзна займаўся спортам і пайшоў у войска, але пасля звальнення ў запас паступіў у Акадэмію фізічнай культуры і спорту.

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА:**

— Маёй спецыялізацыяй сталі стралковыя віды спорту. Стэндавая стральба. Вучыцца было цікава, усе спецпрадметы — патрэбныя, акрамя гісторыі КПСС і таму падобных. А не хапала ў нас прафесійных псіхолагаў.

**СЁННЯ...**

— Год назад атрымаў другую адукацыю. Скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь па спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» (з чырвоным дыпломам). Трошкі ведаю нямецкую і англійскую мовы, але хацеў бы падцягнуць іх да ўзроўню размоўных. Спадзяюся, гэта стане наступным этапам маёй адукацыі.

### З ЖУРНАЛІСТА Ў... ЛІТАРАТАРЫ

**ПІСЬМЕННІК і літаратуразнаўца <u>Пятро ВАСЮЧЭНКА</u> ў школе думаў аб прафесіі біёлага. Як прызнаецца літаратар, сантымент да ўсяго жывога застаўся ў ім і сёння, інакш ён не стварыў бы экалагічную казку «Каляровая затока» і не напісаў бы зборнік вершаў пра жывёл «Піраміда Лінея»...**



**ЯК ГЭТА БЫЛО:**

— У школе мае сімпатыі дзяліліся паміж літаратурнай творчасцю і біялогіяй. Захапляўся ўсім жывым — што лятае, бегае, поўзае, плавае (толькі не самалёты, не танкі, не падводныя лодкі). Вывучаў пры дапамозе мікраскопа насельнікаў кроплі вады. Цікавіўся, хто жыве ў сажалцы ці калюжыне. Вёў дзённікі. Завочным «гуру» быў для мяне Джэральд Дарэл, заолаг і літаратар. А паступіў я ў рэшце рэшт на факультэт журналістыкі.

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА:**

— Журфак не навучыць пісаць, калі ў чалавека няма да таго схільнасці. Ён дае ключы да прафесіі. Яшчэ ён дае смак да вандровак, пазнання жыцця, знаёмстваў. У свой час, нават не працуючы журналістам, аб'ездзіў амаль усю Беларусь. Без гэтага няможна стацца літаратарам.

Любімай дысцыплінай была літаратура, беларуская і замежная. Дый выкладалі яе такія мэтры, як Ірына Шаблоўская, Сцяпан Александровіч, Дзмітрый Бугаёў, Таццяна Шамякіна.

**СЁННЯ...**

— Цяпер я вучу студэнтаў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, вучу літаратуры, якая ёсць чалавеказнаўства. Пішу кнігі. А самому вучыцца даводзіцца і цяпер — удасканальваць замежныя мовы, веданне камп'ютара. А калі б давялося яшчэ паступаць... Можа, і абраў бы біялогію.

### З НАСТАЎНІЦЫ Ў... АРТЫСТКІ



**ЗА плячыма спявачкі і тэлевядучай «Ранішняй пошты» <u>Ларысы ГРЫБАЛЁВАЙ</u> дзве вышэйшыя адукацыі. Цяжка паверыць, што вядучая вядомай некалі перадачы «Усё нармальна, мама» магла стаць... бухгалтарам. Па прызнанні артысткі, яе мама вельмі хацела, каб дачка пайшла па яе шляху і атрымала прафесію эканаміста. Аднак дзяўчына даверылася сабе і пайшла ў... педінстытут.**

**ЯК ГЭТА БЫЛО:**

— Яшчэ з дзяцінства я хацела быць настаўніцай пачатковых класаў. І ўсё, чаго я хацела, я дасягнула — па першай адукацыі я настаўнік. Педагагічная адукацыя мне вельмі дапамагала і дапамагае — у стасунках з людзьмі, пры выхаванні сваіх дзяцей і падчас атрымання другой вышэйшай адукацыі. Пасля педінстытута я скончыла Універсітэт культуры па спецыяльнасці «артыст-вакаліст, артыст эстрады».

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА**

— Вучыцца мне падабалася. Асабліва псіхалогія. Увогуле я за тое, каб асоба развівалася гарманічна. Я не лічу, што калі ты матэматык, то не павінен ведаць мову і літаратуру. Я лічу, што вучоба развівае чалавека як асобу. Калі глядзець на маю адукацыю з пазіцыі сённяшняга дня, то я, відаць, спрабавала б узяць у выкладчыкаў больш ведаў, чым брала тады.

**СЁННЯ...**

— Зараз у мяне сваё святочнае агенцтва — агенцтва Ларысы Грыбалёвай. Паралельна працую як спявачка і тэлевядучая. Калі б з'явілася магчымасць павучыцца яшчэ, то я, напэўна, атрымлівала б адукацыю за мяжой — у Расіі або ЗША. Хацела б авалодаць прафесіяй рэжысёра тэлебачання. Аднак пакуль не бачу, дзе і як змагу прымяніць новыя навыкі.

### СА СТАМАТОЛАГА Ў... ПРАДЗЮСАРЫ



**ПРАДЗЮСАР і аўтар песень артыстаў Ані Шаркуновай і Германа <u>Уладзімір КУБЫШКІН</u> расказаў «Звяздзе», што яго ў сям'і ўсе бачылі ўрачом. Таму, як прызнаецца прадзюсар, асаблівага выбару ў яго і не было. Так ён пайшоў вучыцца на медыка.**

**ЯК ГЭТА БЫЛО**

— Хоць асабіста мяне цягнула ў творчасць: я добра маляваў і падумваў наперакор усім паступаць у Тэатральна-мастацкі інстытут або архітэктурны. Але ў выніку паступіў у медыцынскі. Пасля васьмага класа я паступіў у медвучылішча, скончыў яго. Пасля на два гады пайшоў у армію, дзе мая спецыяльнасць была вельмі запатрабаванай — служыў у санітарнай часці на афіцэрскай пасадзе, таму што ў тую правінцыю ўрачы-афіцэры не даязджалі.

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА**

— Вучыцца мне падабалася — у медыцынскім інстытуце ў асноўным дзяўчынкі вучыліся (усміхаецца. — **Аўт.**). Але было вельмі цяжка, вялікія аб'ёмы інфармацыі, вельмі складаныя прадметы, многіх адлічвалі за непаспяховасць. Але да ўсяго прывыкаеш. А каб стаць добрым урачом, гэта было неабходна. А я яшчэ паралельна з вучобай уначы і па выхадных працаваў на «хуткай», у кардыялагічнай брыгадзе. Гэта мне вельмі дапамагала ў вучобе.

**СЁННЯ...**

— Я вельмі б хацеў атрымаць музычную адукацыю. Па-першае, яе бракуе падчас працы, па-другое — я шчыра зайздрошчу людзям, якія ўмеюць іграць на фартэпіяна.

### З КАМПАЗІТАРА Ў... АНІМАТАРЫ

**Ўдзяцінстве, як і большасць хлопчыкаў, рэжысёр-пастаноўшчык анімацыйных фільмаў «Беларусьфільма» <u>Ігар ВОЛЧАК</u> любіў гуляць у футбол і нават задумваўся аб прафесіі шафёра.**

Аднак, як лічыць сам рэжысёр, свой лёс ён прадвызначыў яшчэ ў тры з паловай гады, калі падабраў мелодыю з «Вяселля Фігара» Моцарта. Тады ўсе зразумелі: з хлопчыка Ігара вырасце музыкант...

**ЯК ГЭТА БЫЛО:**

— У пяць гадоў я ўжо займаўся ў падрыхтоўчым класе, а ў сем, калі сям'я пераехала ў Мінск (1953 год), паступіў у спецыяльную музычную школу-дзесяцігодку ім. Л. Александроўскай пры Белдзяржкансерваторыі. Акрамя музыкі, я вучыўся жывапісу ў цудоўнага педагога і мастака Сяргея Пятровіча Каткова.

У старэйшых класах шмат чытаў, займаўся самаадукацыяй. Між іншым, чытаць кнігі неабходна не толькі для таго, каб ведаць. У першую чаргу гэта гімнастыка для мозгу і пачуццяў, чаго не дасць ніякі камп'ютар.

**ЯК ДАВАЛАСЯ ВУЧОБА:**

— У музычнай школе часу на адпачынак амаль не было: акрамя агульнаадукацыйных прадметаў, трэба было займацца музыкай. У пачатковых класах вучоба не прыносіла ніякага задавальнення да таго часу, пакуль у маім жыцці не з'явіўся НАСТАЎНІК — Барыс Рыгоравіч Гарт. Акрамя заняткаў на фартэпіяна, у нас было шмат размоў пра мастацтва ўвогуле, ды і штодзённых праблем не цураліся. Гэта было важна, каб на жыццёвай дарозе маладога чалавека сустрэўся такі настаўнік. Пасля я скончыў Белдзяржкансерваторыю па класе фартэпіяна (клас І. Цвятаевай). А ў 1979 годзе паступіў у Маскву на Вышэйшыя двухгадовыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў, на аддзяленне рэжысёраў-аніматараў (майстэрня Ю. Нарштэйна).




**СЁННЯ...**

Сёння Ігар Волчак працуе на кінастудыі «Беларусьфільм» у якасці рэжысёра-пастаноўшчыка анімацыйных фільмаў вышэйшай катэгорыі, з'яўляецца лаўрэатам шматлікіх міжнародных фестываляў. Якраз на гэтых фестывалях Ігар Віктаравіч узнавіў свае веды англійскай мовы, якую пасля школы ледзь не забыў. Пра перспектывы іншых прафесій рэжысёр адказвае коратка:

— Самае высокае з мастацтваў — музыка, і калі б я быў дастаткова адораны, то выбраў бы, безумоўна, музыку. Але ў вольны час абавязкова займаўся б анімацыяй.

**Фота з архіваў герояў матэрыялу, тэлеканала «АНТ» і з адкрытых крыніц.**

## ВЫРАТУЕМ КІРОЎЦАЎ АД СПЯКОТЫ!

Побач з пунктам мытнага пропуску «Новая Гута» ў Гомельскім раёне размясціўся пункт прыёму грамадзян, дзе праводзіўся агляд іх фізічнага стану. Спецыялісты Чырвонага Крыжа разам з супрацоўнікамі ДАІ прапаноўвалі кіроўцам прайсці абследаванне падчас акцыі «Выратуем кіроўцаў ад спякоты!» Вядома, што гарачае надвор'е негатыўна ўплывае на стан аварыйнасці: пры ўзнікненні неардынарнай сітуацыі кіроўцы часта не паспяваюць своечасова на яе адрэагаваць, у выніку чаго можа адбыцца ДТЗ. З кіроўцамі, якія згаджаліся праверыць свой артэрыяльны ціск і іншыя параметры здароўя, праводзілася гутарка, уручаліся буклеты па аказанні даўрачэбнай дапамогі, а таксама пітная вада. Грамадзяне былі крыху здзіўленыя, але ўдзячныя за такую ўвагу да іх здароўя. Па аператыўных звестках, з пачатку чэрвеня на Гомельшчыне зарэгістравана 92 ДТЗ, у якіх 22 чалавекі загінулі і 95 атрымалі раненні рознай ступені цяжару.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**



## На клубніцы сёлета сезон скончыцца раней?

**Калі летась нарыхтоўку клубніц Лунінецкае раённае спажывецкае таварыства толькі распачало з 12 чэрвеня (і працягвала недзе да пачатку ліпеня), дык сёлета закупкі салодкай ягады ўжо з тыдзень як вядуцца. Па прагнозах, сезон нарыхтовак працягнецца яшчэ тыдзень-паўтара.**

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» эканаміст спажывецкага таварыства Аксана САЙКО, планы па нарыхтоўцы падчас сёлетняга сезона былі даволі значнымі — да тысячы тон клубніц. Пакуль закуплена толькі 27 тон, з якіх 1,8 тоны — так званай тварнай, якая пайшла на продаж у Мінск і Брэст. Сёлета, на жаль, і насельніцтва, і нарыхтоўшчыкі наракаюць, што ягада — сухая, не сакавітая. У раёне даўно не было добрых дажджоў... Зараз ад людзей клубніцы закупляюць па 1,1 тысячы рублёў за кілаграм і вышэй. Гэта пра ягаду, якая ідзе на прамперапрацоўку. За так званую таварную плацяць ад 2,5 да 5 тысяч рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Г. ВИТЕБСК** **20.07.2011**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НА АУКЦИОНЕ С ПРИМЕНЕНИЕМ В ХОДЕ ТОРГОВ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Минимальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка за участие в торгах, рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Советская, 10, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объем 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет. | **14 413 044** | **3 609 009** | **9 448 290** |
| **2.** | Здание административно-хозяйственное с колодцем и асфальтобетонным покрытием и сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, расположенные по адресу: Витебская область, Бешенковичский район, г.п. Бешенковичи, ул. Володарского, 49, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8416 – одноэтажное бревенчатое здание, фундамент бутовый, перекрытия деревянные утепленные, крыша шиферная, общая площадь 128,9 кв.м, 1988 г. постройки; пристройка кирпичная; холодная пристройка кирпичная; колодец, ж/б кольца; дворовое покрытие – асфальт, общая площадь 776 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 231/С-8415 – одноэтажное кирпичное здание, фундамент бутовый, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, общая площадь 75,4 кв.м, 1988 г. постройки. Земельный участок: площадью 0,1468 га для обслуживания административного здания и построек, кадастровый номер 220555100001001826, срок аренды – 55 лет. Ограничения в использовании земельного участка – охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадью 0,0230 га, охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В, площадью 0,0096 га. Использование – для обслуживания административного здания и построек. | **83 955 653** | **26 039 173** | |
| **3.** | Здание склада с рампой, расположенное по адресу: Витебская область, г. Полоцк, ул. Боровая, д. 11, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение инв. № 250/С-27777 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), одноэтажное кирпичное, 1985 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша рулонная, общая площадь 1030 кв.м, объем 5232 куб.м, бетонная рампа, площадь 95 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000001001208 для содержания и обслуживания здания вещевого склада, площадь 0,4656 га, срок аренды 25 лет. Использование – под специализированное здание здравоохранения и предоставления социальных услуг. | **332 677 887** | **163 931 303** | |
| **4.** | Неиспользуемое здание магазина с тремя пристройками, дорожкой, забором и сетями, расположенное по адресу: Витебская область, Миорский район, г. Миоры, ул. Садовая, 1, и право заключения договора аренды земельного участка | Характеристика объекта недвижимости: - капитальное строение с инв. № 211/С-8297 (здание магазина с тремя пристройками, дорожкой и забором) – кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша – шиферная, общая площадь 136,6 кв.м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9123 (сооружение специализированное коммунального хозяйства (хозбытовая канализационная сеть) – протяженностью 1,1 м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9124 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения (водопроводная сеть) – протяженностью 12,0 м; - капитальное строение с инв. № 254/С-9125 (сооружение специализированное энергетики (электрическая сеть) – протяженностью 15,0 м. Земельный участок с кадастровым номером 223350100001000309, площадью 0,0216 га, под здание магазина с офисом, сроком аренды 50 лет. Использование – под объект розничной торговли. | **105 010 171** | **23 330 812** | |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в г. Витебск: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

**Продавец:** по лотам №№ 1–2 – Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон в г. Витебске (0212) 487687;

по лоту № 3 – Государственное учреждение «Борисовское эксплутационное управление Вооруженных Сил», контактный телефон в г. Витебске (0212) 369352;

по лоту № 4 – Производственное республиканское унитарное предприятие «Витебскоблгаз», тел. (0212) 471223.

**Условия пользования земельными участками:**

**по лотам №№ 1–2:** заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок со дня принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка;

**по лоту № 3:** заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с Полоцким горисполкомом и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок после получения решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией;

**по лоту № 4:** заключение победителем аукциона с Миорским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта с момента утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объектов в соответствии с целью предоставления земельного участка.

**Аукцион состоится 20 июля 2011 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица, индивидуальные предприниматели Республики Беларусь и иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество». Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают заверенную банком копию платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона, а также:

юридическое лицо – резидент Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальный предприниматель – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов **19.07.2011** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308.

**Заключительная регистрация участников 20.07.2011 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.**

2. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495. Внесение задатка в сумме **9 448 290** рублей дает участнику право на участие в торгах по всем лотам. **Если имеет место превышение задатка, внесенного победителем аукциона, над ценой продажи единого предмета аукциона, сумма превышения подлежит возврату в течение 5 рабочих дней** со дня проведения аукциона.

3. Регистрация участников производится без предоставления информации о намерении приобретения конкретного объекта.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками. Аукцион по каждому объекту начинается с объявления месторасположения, краткой характеристики объекта, его начальной и минимальной цены. При наличии двух и более участников, желающих приобрести объект по начальной цене, аукционист повышает цену с установленным шагом, пока по новой объявленной цене аукционный номер поднимает один участник, которого объявляют победителем. Если по начальной цене аукционный номер поднял только один участник – аукционист объявляет победителем этого участника. Если после объявления начальной цены ни один участник не поднял свой номер, аукционист понижает цену в соответствии с шагом аукциона до момента, когда один из участников не поднял аукционный номер по объявленный цене. Этот участник объявляется победителем. Объект не может быть продан по цене ниже минимальной цены, опубликованной в настоящем извещении. Задатки участникам, не ставшим победителями, возвращаются в течение 5 рабочих дней. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 дней** со дня принятия решения исполнительного комитета о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и расходы, связанные с формированием земельного участка **в сумме 3,5 миллиона рублей по каждому лоту**; **не позднее 12 дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи до 19.07.2011 включительно.

6. Информация о продаже объектов опубликована ранее в газете «Звязда» от 11.05.2011 № 85 (26949) (по Лотам №№ 1–3), «Звязда» от 17.09.2009 № 175 (26533) (по Лоту № 4).

## ШАХМАТЫ

***Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА***

### ПАДУМАЙ І РАШЫ

Л. Тамкоў



**Белыя:** Kph8, Лc8, Kd8, п. c7 (4)

**Чорныя:** Kpa5, Лa3, Cf7, п. a2 (4)

Выйгрыш.

О. Хейна



**Белыя:** Kpc7, Cb6, Kh3, п. b3 (4)

**Чорныя:** Kph1, Ch5, пп. a3, b4, e5 (5)

Нічыя.

Чакаем вашых адказаў.

### ПРАВЕРЦЕ СВАЕ АДКАЗЫ

Прыводзім рашэнні задач, апублікаваных 4.06. г.г.

Ф. Сімховіч. 1. Kf5! — цугцванг, 1... Лb3 2. Фa1!~цугцванг 2... Лb4 3. b3x, 2... Л:b6 3. b4x, 2... Лa3 3. ba, 2... Лc3 3. bcx, 1... Лf3 2. Фg1! — цугцванг, 2... Лf4 3. f3x, 2... Л:f5 3. f4x, 2... Лg3 3. fgx

У галоўных варыянтах праходзіць тэма «Альбіна», а ў наступных дадатковых варыянтах ахвяра белага ферзя: 1... Лc~2. Ф:d5+! cd 3. c6x. 1... Л:c5! 2. Фe4+! de 3. C:c5x.

П. Радзюк. 1. Kg2! — цугцванг, 1... Л:c3 2. Лh4!~3. Лh8x. 1. Лd4 2. Л:d4! 1... cd 3. Лc8x, 1... Лe4 2. Л:e4, 1... Л:f4 2. K:f4, 1... Лb4 2. Л:b4, 1... Лa4 2. Л:a4.

У першай задачы і другой змест-гульня ладдзёй, але першая задача намнога лепшая за другую.

### ПАРТЫІ-ЛАЎРЭАТЫ

Прыводзім дзве шахматныя партыі-лаўрэаты, якія былі ўдастоены прызамі за прыгажосць на міжнародных турнірах.

*М. ЧЫГОРЫН — МАРТАМЕР (Парыж, 1900 г.)*

**ВЕНСКАЯ ПАРТЫЯ**

1. e4 e5 2. Kc3 Kc6 3. f4 ef 4. d4 Фh4+ 5. Kpe2 d5 6. ed Cg4+ 7. Kf3 o-o-o 8. dc Kf6 9. Фe1! Лe8+ 10. Kpd2 Фh5 11. Фf2 Cb4+ 12. Cd3 Лe3 13. Cb+ Kpb8 14. Ke5! Гэты ход падкрэслівае перавагу белых. Наступная стадыя барацьбы мае фарсіраваны характар. 14... Лe2+ 15. Ф:e2! C:e2 16. C:e2 Ke4+ 17. Kpd3 Kf2+ 18. Kpc4! Фh6 19. Cf3! c5 20. Kd7+ Kpc7 21. C:f4+! Ф:f4 22. Kd5+ Kp:c7 23. Kf4 K:h1 24. dc! Ca5 25. b4! Cc7 26. Лad1+ Kpe8 27. Cc6+! Чорныя здаліся.

*М. БАЦВІННІК — С. ТАРТАКОВЕР (Натынгем, 1936 г.)*

1. Kf3 Kf6 2. c4 d6 3. d4 Kbd7 4. g3 e5 5. Cg2 Ce7 6. o-o o-o 7. Kc3 c6 8. e4 Фc7 9. h3 Лe8 10. Ce3 Kf8 11. Лc1 h6 12. d5 Cd7 13. Kd2 g5? 14. f4! gf 15. gf Kpg7 16. fe de 17. c5! cd 18. K:d5 Фc6 19. Kc4 Kg6 20. Kd6 Ce6 21. K:e7 K:e7 22. Л:f6 Kp:f6 23. Фh5 Kg6 24. Kf5! Лg8 25. Ф:h6 C:a2 26. Лd1 Лad8 27. Фg5+ Kpe6 28. Л:d8 f6 29. Л:g8 Kf4 30. Фg7. Чорныя здаліся.

# ФІЛЬТРУЙ ЗАГАР!



**ЗАГАР здольны змяніць наш настрой і знешнасць да непазнавальнасці. Сонца мяняе нас, дадаючы фігуры стройнасці, усмешцы — бляску, эмоцыям — аптымізму, вобразу ў цэлым — упэўненасці і сэксуальнасці. Усё гэта лёгка тлумачыць вечную моду на загар. Лёгкія адценні спелага абрыкоса, цёплы тон салодкай карамелі і малочнага шакаладу, высакародная бронза — сонца нязменна дорыць індывідуальнасць, насычаючы скуру жаданым колерам. Ніводны загар не падобны на іншы, уражваючы разнастайнасцю адценняў. Але агульнае паміж імі ўсё ж ёсць — небяспека, якой падвяргаецца арганізм пад уздзеяннем сонечных праменяў. Таму, «смажачыся» на сонцы, проста неабходна выкарыстоўваць сонцаахоўныя сродкі: яны дапамогуць захаваць эластычнасць і прыгажосць скуры, утрымаць вільгаць у яе клетках і максімальна абароняць ад небяспечнага ўльтрафіялету.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сонцаахоўныя сродкі могуць быць рознымі. Малачко лёгка наносіцца і ўмомант усмоктваецца. Крэм па кансістэнцыі гусцейшы, але і дзеянне яго больш доўгае. Алей робіць скуру атласнай, але не ўсім падабаецца адчуваць сябе «алеістым». Што датычыцца геляў, то некаторыя з іх могуць выкліканы смыленне.

**І ўсё ж важная не столькі форма, колькі правільна падабраны SPF**

SPF (англ. — sun protection factor) — параметр, які паказвае нам, якой ступені аховы ад сонца мы можам чакаць ад таго ці іншага прэпарату. Як ён разлічваецца? Безумоўна, вучоныя аперыруюць нейкімі сярэднімі лічбамі. Галоўныя з іх такія. Прынята лічыць, што скура чырванее ў сярэднім праз 20 хвілін пасля таго, як яе падставілі яркаму сонцу. Дозу сонечнага выпраменьвання, якую мы атрымліваем за гэты час, называюць мінімальнай эрытэмнай (эрытэма — пачырваненне). Тэарэтычна SPF-4 дазваляе нам знаходзіцца на сонцы ў 4 разы даўжэй: 4 разы па 25 хвілін, гэта значыць, прыкладна паўтары гадзіны. Тут важна падкрэсліць слова «тэарэтычна». Не трэба забываць, што сярод нас ёсць і бландзіны, і брунеты, і рыжыя. Прынятая ў свеце класіфікацыя падзяляе ўсіх нас на шэсць фотатыпаў — па ступені насычанасці скуры пігментам меланінам. Першы фотатып — самы далікатны. Яго прадстаўнікі ўмомант «згараюць»: на іх чырвоную скуру нават навакольным балюча глядзець. Калі вы адносіцеся да гэтага фотатыпу, то паўтары гадзіны пад нялітасцівым сонцам, асабліва ў першыя пляжныя дні, стануць для вашай скуры катастрофай, і SPF-4 вас не выратуе.

**Які SPF лепшы?** Можна меркаваць, што лепшы той, які большы. Але...

Перш за ўсё, велічыня SPF не знаходзіцца ў прамой залежнасці з магчымасцямі прэпарату. Мяркуецца, што SPF-2 пазбаўляе нас ужо ад 50 працэнтаў шкоднага выпраменьвання, SPF-4 — ад 75. Пры SPF-10 яно змяншаецца на 90 працэнтаў, пры казфіцыенце 20 — на 95, пры 50 — на 98. Прэпарат з SPF-100 павінен быў бы засцерагчы нас практычна цалкам, на 99 працэнтаў. Аднак канцэнтрацыю фільтраў немагчыма павышаць бясконца. Пра прымітыўныя і гаварыць няма чаго: яны могуць выклікаць раздражненне аж да алергіі. Але нават і самыя сучасныя — калі іх «перабраць» — здольныя прынесці нашай скуры непрыемнасці, якія ўжо нельга лічыць адэкватнай платай за ахову ад сонечнага выпраменьвання.

Зразумела, даследчыкі пастаянна шукаюць магчымасць павысіць узровень аховы ад сонца і пры гэтым не прынесці скуры іншай, не ўльтрафіялетавай шкоды. Пакуль яны гэтым займаюцца, нам трэба засвоіць некалькі элементарных правілаў уласнай фотабяспекі.

Лічыцца, што два сонцаахоўныя сродкі павінны быць у кожнага з нас: адзін з SPF не ніжэй як 25, другі — з SPF-10 або крыху ніжэй. SPF-25 — для першых пляжных і дачных дзён; SPF-10 выкарыстоўваецца, калі скура ўжо прымірылася з сонцам і крышачку падзагарэла.

**Што такое УФ-фільтры?**

Выбіраючы сонцаахоўны сродак, абавязкова звярніце ўвагу на яго хімічны склад. Ён павінен быць камбінаваным, г.зн. змяшчаць мінеральныя (фізічныя) і хімічныя УФ-фільтры (рэчывы, якія нейтралізуюць дзеянне ўльтрафіялетавых праменяў на скуру).

Фізічныя фільтры дзейнічаюць накшталт экрана, не даючы УФ-праменям А і В пранікнуць у глыбокія слаі нашай скуры. Як правіла, гэтыя рэчывы ўяўляюць сабой нешта цвёрдае, што расцерлі ў парашок. Самыя распаўсюджаныя з іх — дыяксід тытану, вокіс цынку, вытворныя сіліконаў. Фізічныя фільтры апошніх пакаленняў — гэта мікранізаваныя парашкі. Сродкі з такімі фільтрамі не пакідаюць на целе бялёсую плёнку і не скачваюцца, як гэта адбываецца з фільтрамі маральна ўстарэлымі.

Хімічныя фільтры паглынаюць УФ-прамяні і, ператвараючы сонечную энергію ў цеплавую, тым самым нейтралізуюць іх уплыў. Хімічныя фільтры — гэта злучэнні з розных хімічных груп. Самыя распаўсюджаныя — вытворныя цынаматаў, эфіры саліцылавай кіслаты, бензахіноны і інш.

Камбінаваныя сонцаахоўныя сродкі заклікаліны змагацца з двума відамі праменяў УФ-А і УФ-В. (А-прамяні надзвычай каварныя: яны пранікаюць глыбока ў скуру, выклікаючы змяненні калагену і эласціну, у выніку чаго скура дачасна старэе. В-прамяні ажыццяўляюць лабавыя атакі, выклікаючы пачырваненне і апёкі. Абодва віды праменяў здольныя ўздзейнічаць на ядро клеткі і пракакаваць пашкоджанне ДНК, што можа прывесці да неабарачальных наступстваў.)

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

*(Заканчэнне будзе.)*

## ФОТАТЫПЫ СКУРЫ

**I тып:** вельмі светлая скура, часта з вяснушкамі, блакітныя вочы, рыжыя валасы. Прадстаўнікі гэтага фотатыпу ўмомант «згараюць» на сонцы. Ім неабходна выкарыстоўваць сродкі з індэксам SPF не менш як 50.

**II тып:** белая скура, светлыя валасы. Лёгка атрымлівае сонечны апёк; з цяжкасцю, але ўсё ж крыху загарае. Для аховы — SPF ад 30 да 50.

**III тып:** звычайны колер скуры, каштанавыя валасы і цёмныя вочы. Абгарае мінімальна, загарае паступова, раўнамерна. На першыя дні загару SPF — 30 адзінак; як толькі на скуры з'явіцца лёгкая «бронза», узровень сонцаховы можна знізіць да 20.

**IV тып:** светла-карычневая скура, як правіла, цёмныя вочы і валасы. Абгарае мінімальна, заўсёды добра загарае. Можна выкарыстоўваць крэм з SPF-15.

**V тып:** цёмныя валасы і цёмная скура. Рэдка абгарае. Ім можна пачынаць прывыкаць да сонца з SPF-15, а потым пры жаданні апусціць планку нават да пяці адзінак.

**VI тып:** людзі з чорнымі валасамі, чорнымі вачамі і чорнай скурай. Яны лепш за ўсіх абаронены прыродай ад шкоднага ўздзеяння сонца. У іх скуры вялізная колькасць пігменту меланіну, які і афарбоўвае скуру ў чорны колер. Шосты фотатып практычна ніколі не абгарае.

## ЯК МАКСІМАЛЬНА ЗАСЦЕРАГЧЫ СКУРУ НА АДПАЧЫНКУ?

• *Да прыняцця сонечных ваннаў нельга карыстацца мылам, паколькі яно абястлушчвае скуру, разбураючы яе ахоўнае пакрыва. Сонцаахоўны сродак неабходна наносіць за 20—30 хвілін да непасрэднага кантакту скуры з сонечнымі праменямі.*

• Вельмі важна ведаць, колькі крэму наносіць на твар і на цела. Калі вы нанесяце маленькі аб'ём, то адпаведна яго ахоўнае дзеянне будзе нашмат меншае. На твар трэба наносіць столькі крэму, колькі змяшчаецца на канцавой фаланзе пальца. Для цела трэба столькі крэму, колькі па аб'ёме адпавядае шарыку для гульні ў гольф.

• *У пахмурны дзень каля 80% ультрафіялетавых праменяў праходзіць праз аблокі, таму нават у гэтым выпадку неабходна карыстацца сонцаахоўнымі сродкамі.*

• Прымаць сонечныя ванны варта толькі раніцай і вечарам — да 10.00 і пасля 17.00. З 12 да 16 гадзін усякі кантакт з нябесным свяцілам лепш спыніць: у гэты час ультрафіялетавае выпраменьванне асабліва інтэнсіўнае.

• *Нязменнае правіла: больш як 20 хвілін загараць на адкрытым сонцы нельга! Пасля чарговага «сонечнага сеанса» адпраўляйцеся ў цень мінімум на 30 хвілін.*

• Роўны загар ляжа, калі вы актыўна рухаецеся: бегаеце, ходзіце, гуляеце ў рухавыя гульні. Аматарам загараць пасіўна падкажам: класцися трэба нагамі да сонца і мяняць становішча цела праз кожныя 5—10 хвілін. Лежачы на сонцы, адкідвайце галаву назад, каб шыя атрымала сваю порцыю сонца. Не забывайце і пра ўнутраную паверхню рук.

• *Ёсць шэраг найбольш адчувальных да ўльтрафіялетавага выпраменьвання месцаў. Для твару неабходна выкарыстоўваць сродак з найбольшым сонцаахоўным фактарам, каб пазбегнуць фотастарэння. Аднак вакол вачэй такія сродкі наносіць нельга. Каб абараніць вочы ад сонца, насіце сонцаахоўныя акуляры. Акрамя таго, існуюць эрытэмныя зоны цела — нос, вушы, плечы, спіна, грудзі (найбольш схільныя да апёкаў). Дарэчы, ад сонечных праменяў і марской солі пакутуюць і валасы. Яны становяцца цьмянымі, ломкімі, дрэнна расчэсваюцца (асабліва гэта датычыцца афарбаваных валасоў). Для аховы валасоў неабходна таксама выкарыстоўваць спецыяльныя сродкі (гэта могуць быць ласьёны і тонікі) з фактарам засцярогі не менш SPF-10.*

• Існуе шэраг рэчываў, якія ўзмацняюць уплыў УФ-праменяў. Напрыклад, ужыванне касметыкі і парфумы на аснове эфірных алеяў, раслінных экстрактаў, асабліва святаянніку (звераробою) можа прывесці да з'яўлення ўстойлівых пігментных плям. У спіс забароненай на пляжы касметыкі ўваходзяць усе спіртазмяшчальныя сродкі — ласьёны, дэзадаранты, а таксама туалетная вада. Таксама пігментныя плямы могуць праваканаваць цытрусавыя: як своечасова нязмытыя кроплекі апельсінавага соку, так і крэм з цытрусавымі эфірнымі алеямі (мандарынам, лімонам і інш.). Не варта набываць і сонцаахоўныя сродкі з араматызатарамі. Яны могуць выклікаць раздражненне скуры або апёк.

Карысна ведаць

# ШТО ПСУЕ НЕРВОВУЮ СІСТЭМУ?

**Адной з найважнейшых сістэм чалавечага арганізма з'яўляецца нервовая сістэма. Менавіта яна каардынуе работу ўсіх астатніх органаў і сістэм. Дзякуючы ёй мы дыхаем, рухаемся, ядзім. Ад яе залежаць нашы паводзіны, эмоцыі, паслядоўнасць учынкаў і шмат што іншае. І ўсё наша жыццё мы свядома і несвядома наносім ёй значную шкоду. Што ж ёй шкодзіць больш за ўсё?**

### НЕРВОВАЯ СІСТЭМА НЕ ЛЮБІЦЬ

**Грып, ВРВІ, любое інфекцыйнае захворванне** — найпершыя яе ворагі. Хваробатворныя дыверсанты (вірусы, бактэрыі) выклікаюць інтаксікацыю ўсяго арганізма. Таксічныя рэчывы «бамбардзіруюць» клеткі вегетатыўнай нервовай сістэмы. Вынік «бамбардзіроўкі» — галаўны боль, слабасць, боль у суставах, моцнае потавыдзяленне. Таму, ужо калі падхапілі інфекцыю, паспяшайцеся на дапамогу нервовай сістэме — займіце кругавую абарону. Забяспечце сабе поўны спакой, ні ў якім разе не пераносьце хваробу на нагах. Інакш не абмінуць ускладненняў з боку нервовай сістэмы.

Калі не атрымліваецца «захапіць» нервовую сістэму знянацку, інфекцыя ідзе ў абход. Скакаўшы, пакуль чалавек грунтоўна запусціць захворванні вушэй, гаймаравых пазух, зубоў, яна па крывяносных шляхах пранікае да мазгавых абалонак, выклікаючы гнойны менінгіт.

**Укус насякомых.** Вясна, пачатак лета — найбольш актыўны перыяд у жыцці кляшчоў, пераносчыкаў віруса энцэфаліту, які «прыцэльна» пашкоджвае нервовую сістэму. Адпраўляючыся ў лес, апраніцеся так, каб не стаць лёгкай здабычай крывасмокаў, або загадзя абараніце сябе з дапамогай пырышчэнне.

**Удар галавы.** Галаўны мозг, падобна да крэпасці, з усіх бакоў абаронены чарапной каробкай, якая ў стане вытрымаць дастаткова моцныя ўдары. І ўсё ж нервовая сістэма не адобрыць, калі вы пачняце правяраць яе на трываласць. Сасуды мозга даволі далікатныя і пры страсенні пакутуюць першымі. У месцы ўдару парушаецца кровазабеспячэнне, узнікаюць кровазліцці. Наступствы самыя сумныя: паралічы, парушэнні псіхікі, нават смерць.

Дарэчы, каб атрымаць страсенне мозга, зусім не абавязкова прабіваць ілбом сцяну, дастаткова няўдала прызямліцца на «пятую кропку» і моцна ўдарыць хвасцец. Дзеянне ўдару дойдзе да мозга праз пазваночнік. А праз некалькі гадоў застарэлая і своечасова нераспазнаная траўма галаўнога мозга дасць аб сабе знаць пакутлівым галаўным болем, галавакружэннем.

«Ганяеце» на веласіпедзе або матацыкле, захапляецеся конным спортам, боксам, хакеем, кантактнымі відамі баявых мастацтваў? Абараніце галаву з дапамогай зручнага шлема. Навучыцеся правільна падаць і ўлічыце: моцны ўдар або няўдалае «прызямленне» — падстава звярнуцца да доктара.

**Стрэс.** Удары лёсу не менш небяспечныя і балючыя для нервовай сістэмы. Стан хранічнага стрэсу можа стаць прычынай неўрозу.

**Сонца.** І яшчэ адной разнавіднасці ўдараў паспрабуйце пазбегнуць — сонечных. За доўгае знаходжанне на сонцы нервовай сістэме давядзецца расплачвацца доўга і цяжка, а лепшым выпадку вегета-сасудзістай дыстаніяй.

**Шум.** Бяда жыхароў вялікіх гарадоў — камунікатыўны стрэс, выкліканы лішкам інфармацыі. У асноўным яна абрушваецца на нашы галовы з тэлеэкранаў і дзейнічае на нервы. Некаторыя прывыкаюць да ўключанага тэлевізара настолькі, што амаль не заўважаюць яго. Між тым шум, агрэсіўнае, з пункту гледжання медыкаў, выяўленчае асяроддзе кладуцца дадатковай нагрузкай на нервовую сістэму. Што рабіць? Вазьміце за правіла глядзець толькі тыя перадачы, якія вас сапраўды цікавяць. І не забывайцеся выключаць тэлевізар.

І напрыканцы нашага пераліку назавём тое, што бязлітасней за ўсё знішчае нервовую сістэму, прычым па нашай добрай волі. Гэта нашы шкодныя звычкі!

### НЕРВОВАЯ СІСТЭМА ЛЮБІЦЬ

**Свежае паветра.** ЦНС будзе вам удзячная за доўгія прагулкі на свежым паветры. Бо мозг, займаючы ўсяго 2% вагі цела, паглынае 18% кіслароду, які атрымлівае арганізм, — значна больш, чым астатнія органы і тканкі.

Нервовая сістэма любіць **простую ежу:** хлеб грубага памолу, крупы, асабліва грэцкія і аўсяныя, бабовыя, рыбу, сушаныя белыя грыбкі, нятлустае мяса і субпрадукты (печань, сэрца, ныркі). Яны багатыя на вітаміны групы В, нікацінавую кіслату, магній, якія асабліва неабходныя для зладжанай работы нейронаў.

**Сон.** Спакойны, глыбокі, ціхамірны сон — вось што вам трэба, каб аднавіць расхістаную нервовую сістэму. Спіце столькі, колькі неабходна вашаму арганізму. 8 гадзін — гэта сярэдняя лічба. Аднаму чалавеку, каб аднавіць сілы, дастаткова 6 гадзін, а другому патрэбна не менш як 9.

Нішто так не ўмацоўвае нервовую сістэму, як купанні, асабліва марскія, абціранні — карацей, любыя **водныя працэдуры.**

**Змена дзейнасці.** Мудра робіць той, хто, як сказаў адзін знакаміты паэт, то «паапэ», то «пяпіша вершы»: пераключэнне з разумовай працы на фізічную для нервовай сістэмы ідэальнае.

**Рух.** Фізкультура, рух ёй (нервовай сістэме) на карысць, бо раўнамерна развіваюць мышцы, умацоўваюць звязкі, касцявую сістэму. Фізічна трэніраваны чалавек менш схільны да траўмаў, якія такія небяспечныя для ЦНС. Да таго ж на занятку спортам арганізм «адгукнецца» «мышачнай радасцю» і выкідам эндарфінаў. Гэтыя прыродныя лекі ад стрэсу, якія выдзяляе галаўны мозг, дабратворна ўплываюць на стан вегетатыўнай нервовай сістэмы.

**Радасць.** Хочаце мець здаровыя моцныя нервы? Займайцеся тым, што прыносіць вам задавальненне, — будзе гэта выпілоўванне лобзікам, сустрэча з сябрам або перастаноўка мэблі ў кватэры — і радуйце іншых.

І памятайце: **моцная сям'я, верныя сябры** — самая надзейная абарона ад нервовага зрыву.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

Інфарм-укол

# НЕ КАВА, А ЗАГАДКА



**ВУЧОНЫМ пакуль не ўдалося вызначыць катэгорыі людзей, для якіх кава будзе адназначна карыснай або шкоднай.**

Паводле слоў **інструктара-валеолага 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Галіны ЧЫРАК,** на сённяшні дакладна вядома, што кава карысная далёка не для ўсіх. Акрамя даўно вядомай небяспекі кафеіну для гіпертонікаў і сардэчнікаў, быў выяўлены і ўплыў кавы на ўзровень халестэрыну ў крыві. Так, згодна з амерыканскімі даследаваннямі, людзі, якія штодня выпіваюць звыш шасці кубкаў гэтага напою, маюць больш шанцаў захварэць на атэрасклероз і звязаныя з ім хваробы сэрца. Аднак ёсць і іншае меркаванне вучоных, згодна з якім шкода кавы для арганізма, у прыватнасці, для сэрца, вызначаецца генетычнымі асаблівасцямі канкрэтнага чалавека. У залежнасці ад таго, які ў арганізме дзейнічае пэўны ген, верагоднасць інфаркту пры ўжыванні напою можа павышацца або заставацца на ранейшым узроўні.

Наогул замежнымі вучонымі праведзена ўжо нямала розных даследаванняў кавы. Паводле адных, пяць кубкаў кавы ў дзень дазваляюць пазбегнуць праблем з памяццю. Паводле іншых, працяглае ўжыванне кафеіну спрыяе зніжэнню рызыкі ўзнікнення хваробы Альцгеймера. Сцвярджаецца, што кава здольная знізіць верагоднасць развіцця цукровага дыябету другога тыпу. Была выяўлена нават сувязь паміж рэгулярным ужываннем кавы і зніжэннем рызыкі алкагольнага цырозу печані. Праўда, вучоныя не выявілі сувязі паміж верагоднасцю развіцця алкагольнага цырозу печані і частатой ужывання гарбаты, якая таксама змяшчае кафеін, што дало даследчыкам падставы думаць, нібыта спрыяльнае ўздзеянне кавы звязана не з кафеінам, а з іншымі, пакуль не ўстаноўленымі рэчывамі кавы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

16 чэрвеня 2011 г.
№ 20 (258)


У ЗОНЕ ДАСТУПНАСЦІ

# ЛЁГКАЯ НА ПАД'ЁМ

**Тамара Пратасевіч — чалавек незвычайны, а можа нават і ўнікальны. Няхай сабе і ў межах невялікай па мерках Смалявіцкага раёна вёскі Сакаўка, дзе яна — стараста. Незвычайнасць, зразумела, заключаецца не ў гэтым. Яна і без грамадскай «пасады» вылучаецца сярод аднавяскоўцаў: аднаму дапаможа, за другога папросіць, трэцяга прыструніць...**



Тамара Мікалаеўна з дачкой Волечкай.

У вёсцы 52 двары, усе як на далоні. Калі ўзнікаюць праблемы, людзі не ў сельскі Савет звяртаюцца, а да Тамары Пратасевіч — балазе яе мабільны тэлефон даступны ў любы час сутак. «Не чалавек, а золата! — кажа пра старасту аднавяскоўка Галіна Іпалітаўна Лапцёнак. — У мяне мама ляжачая, з хаты надоўга адлучыцца не магу, але ўсе пытанні праз Тамару Мікалаеўну вырашаю».

Летні поўдзень, спякота... Ідзём з ёю па цэнтральнай сакаўскай вуліцы, разважаем пра вясковае жыццё. Паралельна Тамара Мікалаеўна дае распараджэнні па тэлефоне (бо дзеля журналістаў прыйшлося на нейкі час адарвацца ад асноўнай працы — абавязкаў брыгадзіра цэха распланаводства Смалявіцкай бройлернай птушкафабрыкі), а яшчэ паспявае заўважаць, у каго які парадак на падворках. Прычым спрактыкаванае «вока» старасты падмячае кожную дробязь: дзе «не так» абкошана, у каго пустазелле пад хату падбіраецца...

Хаця на мой — староннi — погляд вёска выглядае амаль беззаганна. У тым сэнсе, што тут няма і намёку на запусценне, на неахайнасць, на нешта такое, што прымусіла б грэбліва паморшчыцца і ў думках прапець «алілуя!» гарадскому жыццю. Сакаўка выглядае дагледжанай, утульнай, жывой. Але так было не заўсёды.

— Яшчэ гадоў пяць таму мне было сорамна за сваю вёску, за яе выгляд, — прызнаецца Тамара Мікалаеўна. — І балюча. На самым бачным месцы — стыхійная звалка, аўтакрама дапатопная прыязджае, п'яная моладзь сярод белага дня бадзяецца з адкаркаванымі бутэлькамі...

Многія ад цяжкасцяў і неўладкаванасцяў імкнуцца ўцячы. Або прымірыцца з імі, прыстасавацца, каб не звяртаць увагі. Уцякаць Тамара Мікалаеўна не збіралася — тут жылі яе бацькі, тут яна нарадзілася, сюды вярнулася, кінуўшы вучобу ў Віцебскім ветэрынарным інстытуце, калі цяжка захварэла мама. А мірыцца з запусценнем не магла. Таму сваю асабістую барацьбу за адраджэнне Сакаўкі яна пачала... з выкараненя самагоншчыкаў і «падпольных» пунктаў гандлю спіртным.

— Як мяне толькі не абзывалі тады, «палівалі» ўсяляк, нават пагражалі! Але ў мяне на той час быў цудоўны памочнік — наш участковы Дзмітрый Анатольевіч Яблонскі. Разам мы выкрылі і ліквідавалі ўсе «кропкі», цяпер у Сакаўцы ніхто не гандлюе самагонам, — узгадвае Тамара Мікалаеўна. — Галоўнае, што для гэтага трэба — жаданне ўчастковага. Ні старшыня сельскага Савета, ні дэпутаты, ні стараста без дапамогі міліцыі нічога не зробяць... Самагоншчыкі былі вымушаны выплачваць па 3 мільёны штрафаў, і неаднойчы.

— І вы не баяліся пагроз? — пытаюся ў яе.

— Нікога я не баялася, заўсёды казала: калі што — абарону знайду ў дзяржавы. Затое цяпер самагонам у нас ужо не гандлююць.

Нягледзячы на прынятыя радыкальныя меры, адносіны з вёскай і вяскоўцамі ў Тамары Мікалаеўны не толькі не сапсаваліся, а нават палепшыліся: у ёй прызналі рэальнага лідара.

Але адна рэч — прымусіць людзей падпарадкоўвацца, караючы штрафам, і зусім іншая — арганізаваць іх на канкрэтную справу, на будаўніцтва той жа дзіцячай пляцоўкі, напрыклад. І гэта не ў аграгарадку (дзе пад такія мэты можна было б знайсці нейкія сродкі ў дзяржаўнай кішэні), а ў звычайнай вёсцы, дзе ўсё — ад першага і да апошняга цвіка — неабходна здабываць самім... Аднак Тамары Мікалаеўне гэта ўдалося — пляцоўка атрымалася што трэба: з арэлямі, усялякімі лесвічкамі, «горкай» для коўзання, лавачкамі для адпачынку. Будавалі яе дарослыя з удзелам дзяцей — на месцы былой звалкі, якую дапамог ліквідаваць ранейшы дырэктар Смалявіцкай бройлернай птушкафабрыкі. У выніку зрабілі дзве карысныя справы: пазбавілі Сакаўку ад «рассадніка» смецця і падарылі ёй месца для адпачынку. Цяпер тут падлеткі нават дыскатэкі ладзяць — на свежым паветры. Раз на год тут праводзіцца свята вёскі. Гэта зусім новая традыцыя, заведзеная з «падачы» той жа Тамары Мікалаеўны. Бо калі ёсць вёсачка і ў ёй жывуць людзі, то павінна быць і свята. Па параду і благаславенне звярнулася ў мясцовую царкву, да айца Георгія. Той падказаў: зрабіць свята вёскі ў выхадныя пасля Пакроваў.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# АБАЧЛІВАСЦЬ, РАЗЛІК І БЕСКАМПРАМІСНАЯ ЗАКОННАСЦЬ

З такімі меркамі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Ларыса Вершаловіч падыходзіць да кожнага звароту выбаршчыкаў



**Калі б у Авальнай зале вялася статыстыка дэпутацкай актыўнасці пры абмеркаванні законапраектаў, Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстання, дакладна была б сярод лідараў. У яе на ўсё свой погляд: ад харчовай прамысловасці да тэлерэкламы. Шчырую, відаць, у акрузе — думалася мімаволі. Так і карцела пагутарыць пра мясцовае. Нарэшце выдалася такая магчымасць. І вось сёння ў нашым полі зроку — Лунінец.**

**— Ларыса Георгіеўна, многія дэпутаты любяць прымяраць на сябе прымаўку пра тое, што адзін у полі не воін. Вы адносіцеся да іх ліку?**

— А як жа! Адзін дэпутат нікому не дапаможа. У нас вельмі і вельмі цеснае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі мясцовай улады — і прадстаўнічай, і выканаўчай. Толькі сумесна з дэпутатамі мясцовых Саветаў, супрацоўнікамі райвыканкамаў, кіраўнікамі прадпрыемстваў змагаемся з праблемамі. Без іх дэпутат нічога не зробіць: у яго проста няма такіх паўнамоцтваў. Наша задача — звярнуць на становішча ўвагу тых, хто ў стане яго змяніць. А паколькі мы ўсё роўна працуем супольна, то і прыёмы я звычайна праводжу ў райвыканкамах, сельсаветах. Многія пытанні ўдаецца здымаць на месцы, бо гэта якраз у іх кампетэнцыі. Часта гэта нейкія сезонныя пытанні. З апошняга — вылучэнне сотак пад пасадкі, напрыклад. На іх жа прэтэндуюць і тыя, хто не з'яўлецца ўдзельнікам калгаса. Дачаводзіцца расстаўляць прыярытэты. У першую чаргу дадатковыя соткі павінен атрымліваць той, хто на зямлі працуе. Заробак медыка ці настаўніка ў вёсцы, як вядома, большы за той, што атрымлівае селянін. Таму будзе абсалютна справядліва яму першаму вылучыць зямлю пад агарод. Ёсць і такія праблемы, якія патрабуюць выхаду на ўзровень міністэрстваў. Аднак іх меншасць.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# У ІНТЭР'ЕРЫ СЕСІІ — «СЯМЕЙНЫ ПАРТРЭТ»

**«Мама, тата, двое ці трое дзяцей, бабуля і дзядуля» — менавіта так, паводле магілёўскіх дэпутатаў, павінна выглядаць нармальная рэклама сямейнага ладу жыцця. Аднак відавочна, што адных «правільных партрэтаў» недастаткова, каб палепшыць дэмаграфію. Таму Магілёўскі абласны Савет дэпутатаў прыняў новую праграму дэмаграфічнай бяспекі рэгіёна на 2011— 2015 гады.**

## Горад... знік

На рэспубліканскім узроўні праграма дэмаграфічнай бяспекі яшчэ дапрацоўваецца, але ў Магілёве вырашылі пайсці наперадзе ўсёй краіны.

Папярэдняя праграма, паводле слоў намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерыя МАЛАШКІ, дазволіла папярэдзіць пагаршэнне дэмаграфічнай сітуацыі. Новая праграма, спадзяюцца дэпутаты, забяспечыць дэмаграфічны рост: дазволіць павялічыць нараджальнасць і працягласць жыцця.

Напрыклад, працягласць жыцця жыхароў Магілёўскай вобласці ад 2006 года ўжо павялічылася на 1,3 года і складае амаль 70 (69,8) гадоў. Аднак гэта ніжэй за развітыя краіны свету як мінімум на дзясятак гадоў. Мяркуецца, што ў выніку новай праграмы працягласць жыцця ў нас павялічыцца да 72-73 гадоў.

Увогуле ёсць нямала вельмі складаных праблем, якія давядзецца вырашаць. Прычым у дэмаграфіі ўсё робіцца не хутка, а паступова, павольна, і вынікі можна атрымаць толькі праз гады. Напрыклад, з гэтага шэрагу: давядзецца супрацьстаяць працэсу старэння, што асабліва востра выяўляецца ў сельскай мясцовасці.

Для таго, каб чалавек доўга жыў і меў дзяцей, патрэбна шмат фактараў: не толькі добрая медыцына і падтрымка жанчыны-маці, але таксама нармальная праца, прыстойны заробак, бяспечныя ўмовы і здаровы лад жыцця і шмат чаго іншага.

Пакуль жа, хоць нараджальнасць і павялічылася за апошнюю пяцігодку, але яе ўзровень, на жаль, яшчэ недастатковы для ўзнаўлення насельніцтва. Як сказаў на сесіі старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, можна лічыць, што ў краіне за апошнія чатыры гады знік невялікі горад.

Не ўдаецца справіцца з узроўнем смяротнасці: у працаздольным узросце людзі паміраюць ад хваробаў сістэмы кровазвароту і анкалагічных. Нельга абмінуць і гібель ад знешніх прычын. Ад гэтых знешніх прычын (няшчасныя выпадкі, забойствы, суіцыды і гэтак далей) у краіне гіне штогод не адна тысяча людзей. Напрыклад, сёлета павялічылася колькасць чалавек, якія сталі ахвярамі пажараў: за сёлетнія 4 месяцы — у 2,4 раза!

## Паміраюць, але п'юць

Адной з задач, якая наўпрост уплывае на дэмаграфію, стане барацьба з п'янствам. Мала таго, што мужчыны і так жывуць меней за жанчын (паводле статыстыкі), дык яшчэ з прычыны алкагалізму прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва часам не дажываюць і да пенсіі.

На сесіі прагучала такая лічба: калі спажыванне алкаголю на душу насельніцтва павялічваецца на 1 літр, то смяротнасць павялічваецца на 3%. Між тым, рэалізацыя спіртнога павялічваецца: у студзені—красавіку ў Магілёўскай вобласці людзі набылі на 10,6% болей пладова-ягадных він, а таксама гарэлкі.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК настойвае на тым, што праца па папярэджанні п'янства павінна быць не разавай, а штодзённай, і толькі ў такім разе будзе нейкі вынік:

— Трэба выкарыстоўваць не толькі забаронныя меры, але прыцягваць людзей да здаровага ладу жыцця, выхоўваць свядомае стаўленне да свайго здароўя, адказнасць за паводзіны і ўчынкі.

Пакуль жа ў Магілёўскай вобласці павялічваецца колькасць злачынстваў, учыненых нецвярозымі людзьмі. Напачатку гэтага года, праўда, скарацілася колькасць зарэгістраваных смерцяў ад атручэнняў алкаголем, але не ўва ўсіх сельскіх раёнах.

Штогод больш за 2 тысячы падлеткаў прыцягваюць да адміністрацыйнай адказнасці за розныя правапарушэнні, асноўныя з якіх з'яўляецца піццё спіртных напояў і з'яўленне нецвярозымі ў грамадскіх месцах. Пракуратура настойвае на тым, што з сітуацыяй не справіцца, калі праблемай п'янства і алкагалізму будуць займацца толькі праваахоўныя органы: патрэбна прафілактыка з усіх бакоў грамадства.

## Модная сям'я і яе падтрымка

Дэпутаты абласавета актыўна абмяркоўвалі дэмаграфічную сітуацыю і выказвалі розныя думкі накont таго, як яе паправіць. Адзін з выступоўцаў настойваў на тым, што трэба павялічваць узровень адукацыі людзей: чым больш яны ведаюць, тым больш адказна ставяцца да свайго здароўя і больш жывуць.

Ёсць хваляванні наконт замежнай працоўнай сілы, што таксама адносіцца да фактараў, якія ўскосна ўплываюць на дэмаграфію. Апошнім часам у беларускім грамадстве павялічваецца попыт на рабочыя будаўнічыя прафесіі, аднак беспрацоўныя не заўсёды спяшаюцца асвоіць дэфіцытныя прафесіі. Таму працоўныя месцы займаюць замежнікі: калі летась улады далі дазвол на працу 400 жыхарам іншых краін за ўвесь год, то за сёлетнія 4 месяцы — ўжо болей за паўтысячы дазволаў. Кітайскія грамадзяне актыўна далучыліся да будаўніцтва новай чаргі на цэментным заводзе.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС»)**

# ЛЁГКАЯ НА ПАД'ЁМ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС»)

— І вось уявіце сабе: не паспелі людзі сабрацца ў прызначаны дзень, як пайшоў дождж, узняўся вецер — усё ж кастрычнік на двары! Я — у слёзы: маўляў, якое ж гэта будзе свята, калі ўсе разбягуцца?.. Але на дапамогу прыйшоў муж: арганізаваў мужчын, яны зрабілі падпоркі для прыгатавання шашлыку... Тут і дождж спыніўся, і такое сонейка засвяціла! Карацей, праз дзве гадзіны я ўжо забылася пра свае слёзы, — усміхаецца Тамара Мікалаеўна. — Работнікі Дома культуры, што ў суседнім пасёлку Акцябрскі, падрыхтавалі выдатны канцэрт, прычым абыйшліся выключна сваімі сіламі і мясцовымі талентамі. Птушкафабрыка арганізавала гандаль фірменнай прадукцыяй... Не забыліся і пра адметных жыхароў вёскі — уручылі ім падарункі.

Людзі, паводле слоў Тамары Мікалаеўны, мерапрыемствам засталіся задаволеныя, і свята вёскі ў Сакаўцы цяпер адзначаецца штогод. Праўда, калі на самае першае святкаванне прыязджалі прадстаўнікі мясцовай улады і фабрычнай адміністрацыі, то надалей святы праходзілі ўжо без іх. Хаця, кажа староста, шкада. Зразумела, што прадстаўнікі любой адміністрацыйнай структуры — людзі занятыя. Аднак праз тую ж Смалявіцкую бройлерную птушкафабрыку прайшлі ў свой час ці не ўсе жыхары Сакаўкі, ёсць сярод іх і ветэраны працы. Ім, безумоўна, было б вельмі прыемна пачуць некалькі цёплых слоў, выказаных тым ці іншым кіраўніком. Для таго ж і свята, каб людзей віншаваць. І людзі — пераважная іх большасць — гэтага заслугоўваюць.

Тамара Мікалаеўна ўвогуле ўпэўнена, што Сакаўка перажывае другое нараджэнне. І справа не толькі ў моладзі, якая, паблукаўшы па свеце, вяртаецца да бацькоўскіх хат. Справа ў псіхалогіі людзей, якая за апошні час змянілася прыкметна. Вяскоўцы хочуць жыць годна — чаго, уласна кажучы, цалкам заслугоўваюць... Трынаццацігадовая дачка Тамары Мікалаеўны Волечка пахвалілася нам, што ў аўтакраме ёй далі чэк. Нехта скажа: падумаеш, падзея... А для Сакаўкі сапраўды падзея. Тамара Пратасевіч не адзін год змагалася за нармальную сучасную аўтакраму — з халадзільнай установай, з касавым апаратам, з наяўнасцю цэннікаў, з ветлівымі прадаўцамі, у рэшце рэшт. Ёй гаварылі свае ж, аднавяскоўцы: «Ды супакойся, Тамара, навошта нервы псаваць? Добра і так». Яна ж лічыла, што нядобра, што не павінна сырое мяса ляжаць на адным латку побач з тварагом. Што на тым самым пакеціку тварагу неабходна абавязкова пазначаць тэрмін прыдатнасці — як гэта робіцца ў гарадах, у вялікіх крамах. А інакш усе размовы пра павышэнне ўзроўню жыцця вясковага чалавека застануцца толькі размовамі. І дабілася перамен.



Так выглядае Сакаўка.

Задумак у старасты яшчэ шмат.

— Бачыце пералесак? — паказвае яна на другі бок дарогі, па якой мы даходзім да канца (ці пачатку?) вёскі. — Вельмі хацелася б ператварыць яго ў парк з сажалкай. Некалі на гэтым месцы ўжо было азярцо, але цяпер там балота... Мы ў гэтым пералеску з дазволу лясніцтва пачалі зімой высякаць сухія дрэвы. А вось пачысціць азярцо самі не зможам, таму і звярнуліся па дапамогу ў раённы аддзел МНС. Яны далі згоду, падпісалі ўсе паперы і адправілі іх на зацвярджэнне ў райвыканкам. Райвыканкам прыняў канчатковае рашэнне нам дапамагчы, расчысціць месца пад сажалку. А крынічка — жывая, натуральная! — там ёсць. Трэба толькі «вызваліць» яе з-пад завалаў, і яна зноў пачне струменіць, з цягам часу запоўніць сажалку вадой.

...Пры ўездзе ў Сакаўку, на «галгофе», складзенай уручную з камянёў, стаіць вялікі драўляны крыж — святыня вёскі, яе абярэг. З'явіўся ён на гэтым месцы параўнальна нядаўна — па ініцыятыве старасты Тамары Пратасевіч. І цяпер на Вялікдзень у Сакаўцы адбываецца свой хрэсны ход. Даглядае крыж 76-гадовая жыхарка вёскі Вольга Дзмітрыеўна Нікіціч, хата якой знаходзіцца непадалёку. Да сваіх абавязкаў жанчына ставіцца вельмі адказна: прапалвае месца вакол крыжа, мые і мяняе ручнікі на ім, сочыць за парадкам.

— Ды і як інакш? Я Тамары Мікалаеўне адмовіць не магу, яна — мая выратавальніца, бо праблемы на падворку ўзнікаюць пастаянна.

Вяртаемся ў вёску той жа дарогай. Пакуль ідзём, на языку круціцца пытанне, якое нарэшце і задаю гэтай мілай, цудоўнай жанчыне:

— Тамара Мікалаеўна, а навошта вам усё гэта патрэбна?

— Я і сама, бывае, так думаю, — усміхаецца яна. — Часам такога ад людзей наслухаешся — здаюць і сілы, і нервы. Вырашаю: усё, хопіць быць старастам, адмаўляюся!.. Потым тыя ж людзі мяне і адгаворваюць ад такіх думак. Значыць, трэба яшчэ крыху папрацаваць...

**Наталля КАРПЕНКА.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**
*Смалявіцкі раён.*

## У ІНТЭР'ЕРЫ СЕСІІ...

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС»)

У Кіраўску лагічна лічаць, што замацаванне мясцовых дэпутатаў за сем'ямі, якія вызначаны як сацыяльна небяспечныя, абавязкова дадуць плён: няхай не цяпер, але ў будучыні.

І калі адзін з дэпутатаў прапанаваў на рэкламных плакатах маляваць з мамай і татам не адно дзіця, а два ці нават тры, міністр працы і сацыяльнай абароны Марына ШЧОТКІНА, якая брала ўдзел у магілёўскай сесіі, прапанавала дамалёўваць туды бабулю і дзядулю. Бо вельмі часта ў нашым цывілізаваным свеце маладыя людзі не імкнуцца клапаціцца пра бацькоў. Цяпер у Беларусі 17 тысяч адзінокіх пенсіянераў жыве у інтэрнатах.

Добра жыць да 75 гадоў і больш, але жыць добра і актыўна, падкрэсліла міністр. Тут важная якасць жыцця: таму менавіта цяпер, у няпросты час, важна падтрымаць людзей — з боку улады, прадпрыемстваў і сацыяльна адказнага прыватнага бізнэсу.

Вынік прыняцця новай дэмаграфічнай праграмы падвёў кіраўнік Магілёўскай вобласці Пётр Руднік:

— Мець вялікую сям'ю ў Магілёўскай вобласці павінна стаць модным!

**Ілона ІВАНОВА.**

# АБАЧЛІВАСЦЬ, РАЗЛІК І БЕСКАМПРАМІСНАЯ ЗАКОННАСЦЬ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «МС»)

**— А з «дэмісезоннага» што можаце вылучыць? Нейкі аналіз зваротаў робіце?**

— Пастаянна разбіраем: колькі пытанняў вырашаецца, колькі не могуць быць вырашаны з-за таго, што не дазваляе заканадаўства. Усяго летась у мяне было каля 270 зваротаў ад выбаршчыкаў. У цэлым, пытанняў становіцца менш — значыць, мясцовыя ўлады іх вырашаюць. Структуру зваротаў таксама аналізуем. Прыкладна 20 адсоткаў тычыцца аховы здароўя. Ад нейкіх кансультацыйных пытанняў, пастаноўкі дыягназу да арганізацыйных — работы паліклінік, напрыклад. Больш за ўсё запытаў наконт ЖКГ (рамонт жылля, камунальныя паслугі). Шмат пытанняў па будаўніцтве, што, у прынцыпе, перакліkаецца з ЖКГ: дзесьці ў новым доме ліфт не запускаецца ці дарожку не заасфальтавалі. Шмат спрэчак узнікае з прыватызаваным жыллём, якое ў свой час будавалі СВК: хто будзе фінансаваць абслугоўванне малакватэрных дамоў? Гаспадаркі не хочуць мець прыватнае жыллё на сваім балансе, а жыхары — пакрываць усе выдаткі самастойна. Часам удаецца дасягнуць кампрамісу, каб частку бралі на сябе СВК, а частку аплачвалі жыхары. Многія пытанні патрабуюць выключна растлумачэнняў, дыпламатычнасці. І жыхарам, і ўладам хацелася б, каб было ўсё і адразу. Аднак справа ўпіраецца ў фінансы. Кожны сельсавет хоча заасфальтаваную дарогу. Кожны жыхар — каб адрамантавалі яго дом. Аднак немагчыма забяспечыць усіх адначасова. Ёсць графікі, і даведацца пра сваю пазіцыю там можна ў адпаведным аддзеле выканкама. Тым не менш на прыёме часта даводзіцца тлумачыць: «Зрабіць у першую чаргу вам — значыць забраць у некага іншага». А ўвогуле спрабуем у спрэчных сітуацыях знаходзіць кампрамісы. Ёсць, праўда, і такія выбаршчыкі, якім важна паставіць пытанне, а яго вырашэнне іх ужо не цікавіць.

**— Віртуальную прыёмную адкрываць не збіраецеся? Асабліва зручна было б для тых выпадкаў, калі проста патлумачыць нешта трэба...**

— Мне сын прапаноўваў сайт зрабіць... Можа, я старамодная, але лічу за лепшае прыехаць да людзей і сустрэцца асабіста. Заўжды трэба слухаць два бакі. Той, хто прыходзіць на прыём, дзеліцца сваім разуменнем праблемы. Яго трактоўка часам не зусім адпавядае рэчаіснасці. Калі-нікалі пачынаеш слухаць другі бок, і разумееш, што не мае рацыі чалавек, які прыйшоў да цябе. Да таго ж, часта ў сітуацыі можна разабрацца, толькі пабачыўшы яе «ўжывую». Увогуле з транспартам і сувяззю ў раёне праблем няма, незадаволенасць выказваюць часам хіба толькі жыхары аддаленых вёсак. У Чучавічах, напрыклад, маршрутку на Мінск хацелі. Ім пайшлі насустрач. Аўтобусны парк машыну вылучыў. Я вырашыла сама ацаніць абстаноўку: праехала на той маршрутцы. І ўяўляеце, у суботу там было ўсяго тры чалавекі! Вядома ж, гэта нерэнтабельна. Трэба быць больш абачлівымі. Калі мы імкнёмся задаволіць усіх, не варта забывацца, што і грошы мы таксама павінны лічыць. Эканоміка вызначае наш дабрабыт. Без нерацыянальных выдаткаў усе мы будзем у выйгрышы.

**— Прабелы ў заканадаўстве заўважаеце падчас работы ў акрузе?**

— Так, здараецца. У нас была парадаксальная сітуацыя з харчаваннем і аздараўленнем для дзяцей, якія жывуць у чыстых раёнах, а вучацца — у забруджаных пасля аварыі на ЧАЭС. Здаецца, мястэчкі знаходзяцца за два крокі, а такі падзел. Ільготы ж распаўсюджваліся толькі на тых, хто пражываў у зоне забруджвання. Нонсенс! Па-першае, на вучобе дзеці праводзяць шмат часу і адчуваюць такі самы шкодны ўплыў. А па-другое, як патлумачыць дзіцяці, чаму яго суседу па парце даюць апельсін, а яму не? І ўсё з-за таго, што ў заканадаўчай фармуліроўцы пра льготы для дзяцей, якія пражываюць на забруджанай тэрыторыі, не хапала слоў «ці вучацца»! Гэта заслуга нашай камісіі, што яны там з'явіліся. Такіх дзяцей крыху больш за тры тысячы па ўсёй краіне, на іх палепшанае харчаванне і аздараўленне патрэбна больш за 40 млрд. Аднак дзяржава павінна браць на сябе гэты клопат. Наогул жа такога закона, які задавальняе ўсіх, няма. Іх пішуць людзі. Да таго ж, любы закон — гэта ў чымсьці абмежаванне. Так трэба для рэгуляцыі. Вядома ж, не надта падабаецца выбаршчыкам, калі я кажу, што ім не належыць тое, чаго яны хочуць. І вядома ж, яны сыходзяць незадаволенымі. Аднак кожны павінен выконваць патрабаванні закона, і тут ніякіх кампрамісаў быць не можа. Тады лягчэй і прасцей жыць будзе ўсім.

**— А нейкія заканадаўчыя ініцыятывы вам у раёне падказваюць?**

— Безумоўна. Дэпутат не можа ва ўсім быць докам. Я магу паглядзець са сваёй званіцы і прапанаваць нейкія папраўкі ў закон. Аднак заўжды лепш параіцца з тымі, хто будзе з гэтым законам працаваць. Калі закон рэгулюе нешта ў сістэме аховы здароўя — я адпраўляю яго ў бальніцы, у галіне адукацыі — у школы, прамысловасці — на прадпрыемствы. Любы больш-менш рэзанансны законапраект, які датычыць большасці насельніцтва, праходзіць праз маю акругу. Жыллёвы кодэкс, напрыклад, мы вельмі дэталёва абмяркоўвалі. Гордасць з'яўляецца, калі прапановы маіх землякоў трапляюць у выніковы тэкст законапраекта.

**— Тупіковыя сітуацыі здараліся?**

— Горш за ўсё, калі хочацца дапамагчы чалавеку, а не атрымліваецца. Вельмі непрыемны асадак застаецца. Ёсць у маёй акрузе жанчына. Яна працуе дворнікам, у яе чацвёра дзяцей і няма жылля. Вылучылі ёй задарма нейкі безгаспадарны будынак былога дзіцячага садка. Руплівая гаспадыня там усё прыхарашыла, навяла парадак і стварыла ўтульнасць. Яна паказвала фатаграфіі «да» і «пасля» — там, як гаворыцца, неба і зямля. Але калі паўстала пытанне аб прыватызацыі, будыніну ацанілі ў 20 млн рублёў. У жанчыны такіх грошай няма, крэдыт ёй не даюць. Будынак быў безгаспадарны, усе і рады былі б, каб жанчына з дзецьмі там жыла. Як бы гэта ні было сурова, аднак заканадаўства не дазваляе проста так аддаць ёй будынак. Закон бескампрамісны.

**— Дык можа, варта нейкія карэктывы ў заканадаўства ўнесці?**

— Пад кожны выпадак закон не напішаш... Што да тэндэнцый, то дапамагло б толькі, калі б для сем'яў з чатырма дзецьмі жыллё было бясплатным. Калі гэта будзе заканадаўча аформлена, пытанне вырашыцца.

**— Што яшчэ, на ваш погляд, мэтазгодна змяніць у сямейнай палітыцы?**

— Усе мы, зразумелая рэч, толькі «за», каб дзяржава дапамагала тым, хто жыве ў нястачы. Аднак паглядзім на сітуацыю з іншага боку: калі бацькі п'юць, то выдадзеныя дзяржавай грошы не трапляюць дзецям. На жаль, ёсць у нас такія людзі, якія лічаць, што ім усе і ўсё павінны. Я думаю, калі ў раёне ёсць хоць адно працоўнае месца і чалавек, які прыходзіць па адрасную дапамогу, працаздольны, яму павінна прапаноўвацца гэтая вакансія. Больш абачліва і ўзважана трэба падыходзіць. Неабходна таксама, на маю думку, паляпшаць становішча людзей, якія выхоўваюць чужых дзяцей — так званыя дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Яны робяць вялікую справу. У маім раёне два такія дамы. Гэта цудоўныя людзі, і ім трэба аддаць належнае. Дзеці павінны выхоўвацца ў сям'і, дзе іх любяць і дзе яны адчуваюць сябе шчаслівымі. У той жа час я лічу, што адбор бацькоў для дамоў сямейнага тыпу павінен быць больш строгім. Я не ўхваляю тых, дзе ёсць толькі мама: аднабокае выхаванне атрымліваецца. Там абавязкова павінен быць і тата.

**— Вы працуеце ўжо не першае скліканне, можаце, відаць, прасачыць, як мянялася акруга.**

— Так, гэта відавочна: змяняецца побыт, прыгажэюць вёскі. Усё ж такі грошы, якія ўкладваюцца, рэальна адчуваюцца. У нас новая бальніца, якая з'яўляецца без перабольшання, адной з найлепшых раённых устаноў аховы здароўя. Там можна прайсці комплекснае абследаванне, зрабіць камп'ютарную тамаграму. Гэта вельмі важна, не ўсе сталічныя калегі могуць такім пахваліцца. У нас ёсць лядовая арэна і будуецца басейн. Імкліва развіваецца гандаль. Райпа ў нас таксама адно з самых лепшых сярод раёнаў, і сельскія крамы амаль не адрозніваюцца па асартыменце ад гарадскіх. Выбітныя педагогі, пра работу якіх сведчаць вынікі алімпіяд і ўзровень паступлення ў ВНУ. У гімназіі імя Нядведскага ў Мікашэвічах і Лунінецкім ліцэі ён гадамі перавышае 90 працэнтаў.

**— Ваша акруга пацярпела ад жудаснай аварыі на ЧАЭС...**

— Я сказала б, што Чарнобыль — гэта бяда, якая яднае. Калі б не ён, не было б той народнай дыпламатыі, якая склалася ў нас з многімі замежнымі краінамі. Гэта магчымасць для нас і нашых дзяцей пазнаёміцца з іншымі дзяржавамі. А для тамтэйшых жыхароў — наведаць Беларусь і ўбачвідкі пераканацца, што гэта нармальная, цывілізаваная краіна.

**Зоя ВАРАНЦОВА.**

**БЛІЗКАЯ ЎЛАДА**

# ЗВЯРТАЙЦЕСЯ — ВАС ПАЧУЮЦЬ



**Адзін з галоўных сакрэтаў плённай работы са зваротамі грамадзян і скарачэння колькасці скаргаў у Начскім сельсавеце Крупскага раёна, — пастаяннае кантактаванне мясцовай улады з людзьмі, папярэджванне праблемных і канфліктных сітуацый, своечасовае іх выяўленне і — па магчымасці — вырашэнне.**

Дзякуючы такой актыўнай пазіцыі самой старшыні (Надзеі Уладзіміраўны ВУСІК), яе актыву і дэпутацкага корпусу, сёлета колькасць зваротаў і скаргаў у мясцовыя органы ўлады зменшылася, а самую якасць работы з людзьмі ў Начскім сельсавеце летась назвалі лепшай у вобласці.

— Самае важнае — не адседжвацца ў кабінетах, — падкрэсліла Надзея Уладзіміраўна. Мы рэгулярна праводзім Дні інфармавання насельніцтва, выязныя Дні дэпутата. Нашы жыхары самі агучваюць свае патрэбы, праблемы, пажаданні, а мы бяром гэта на заметку і, калі можам, вырашаем. Калі ж не — абавязкова тлумачым прычыну.

Безумоўна, у адзіночку старшыня сельскага Савета не справіцца. Работа з людзьмі — гэта наша агульная задача. У мяне актыўны дэпутацкі корпус і ўпаўнаважаныя населеных пунктаў, якія пастаянна маніторяць сітуацыю ў сваёй «зоне адказнасці». Узгадаю Алену Дзмітрыеўну Найдзёнаву (дэпутат сельскага Савета, працуе паштавіком і адначасова з'яўляецца ўпаўнаважанай ад некалькіх вёсак). Яна кожны дзень сустракаецца з людзьмі, прыносіць пошту, пенсіі, ведае, якое ў кожнай сям'і становішча, хто чым жыве, каму патрэбна дапамога і г.д. Напрыклад, лямпачка на вуліцы перагарэла — яна адразу сігналізуе нам, а мы даём заяўку ў РЭС.

Па словах старшыні сельскага Савета, апошнія некалькі гадоў шмат пытанняў па вулічным асвятленні было ў аграгарадку Нача, дзе з-за высокага працэнту зносу сетак часта перагаралі лямпачкі. Пасля таго, як была праведзена маштабная рэканструкцыя сетак, з заменай апор, ліхтароў і ўстаноўкай энергазберагальных лямпачак, скаргі зніклі.

— Ва ўзгаданым аграгарадку Нача пражывае яшчэ адзін наш актыўны дэпутат — Марына Іванаўна Панкавец. Яна — загадчыца мясцовага клуба-бібліятэкі і адначасова мастацкі кіраўнік калектыву народнай творчасці. Па родзе дзейнасці яна таксама пастаянна ўзаемадзейнічае з людзьмі, як кажуць, трымае руку на пульсе. Як народны абраннік, бярэ ўдзел у Днях інфармавання, Днях дэпутата і г.д.

## Зрухі ёсць

У «рэйтынгу папулярнасці» праблемных пытанняў, з якімі мясцовыя жыхары звяртаюцца да сваіх дэпутатаў, першую прыступку займае сфера ЖКГ. Калі дакладней — пытанні водазабеспячэння.

— Усе водаправоды і свідравіны мы ў адпаведнасці з заканадаўствам перадалі на баланс раённай спецыялізаванай арганізацыі — КУП «Жылцеплабуд», — патлумачыла Надзея Уладзіміраўна.

Водаправод пракладзены ў чатырох самых буйных населеных пунктах сельсавета — пасёлку Лянок, аграгарадку Нача, вёсках Колас і Плаўчае Галое. У астатніх сямі — шахтавыя калодзежы (як грамадскія, так і прыватныя). Зразумела, што водаправодныя сеткі (там, дзе яны ёсць) даўно састарэлі, бо былі пракладзены яшчэ пры СССР і патрабуюць рамонту ці замены. Нешта ў гэтым кірунку ўжо зроблена. Напрыклад, пры будаўніцтве аграгарадка Нача частка труб (звыш 800 м) была заменена. На астатняе пакуль нестае сродкаў (толькі ў Начы агульная працягласць водаправода складае 5,1 км — на такія маштабныя работы патрэбны адпаведныя фінансы).

— У планах камунальных службаў гэта ёсць. І паступова замена труб там, дзе неабходна, будзе праведзена, — запэўніла старшыня сельскага Савета. — У пасёлку Лянок у наступным годзе «Жылцеплабуд» збіраецца правесці водаправод па дзвюх вуліцах, дзе раней яго не было.

Паколькі трубы старыя, перыядычна здараюцца парывы. Надзея Уладзіміраўна адзначыла, што пасля таго, як усе сеткі былі перададзены аднаму балансаўтрымальніку, якасць іх абслугоўвання вырасла. Часам жыхары тых населеных пунктаў, дзе ёсць водаправод, скардзяцца на адсутнасць напору вады. Як правіла, гэтае пытанне абвастраецца летам, калі жыхары актыўна расходуюць водаправодную ваду для паліўкі сваіх агародаў. У перспектыве камунальныя службы плануюць пабудаваць у Начы, дзе часцей узнікаюць такія перабоі, яшчэ адну свідравіну.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «МС».)**

**ДЭПУТАТЫ — НА ВЫЕЗД!**

# ЭКЗАМЕН НА ДАВЕР

**6 лютага 2009 года быў падпісаны Указ № 64 «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях будаўніцтва, адабрання і выдзялення зямельных участкаў», накіраваны на ўдасканаленне парадку ў гэтай сферы. Днямі ў Мядзельскім раёне адбылася выязная сесія Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, на якой разглядаўся ход рэалізацыі названага дакумента, а таксама абмяркоўваліся пытанні комплекснага развіцця гарадоў і населеных пунктаў Мінскай вобласці.**

Тэма комплекснай забудовы населеных пунктаў ушчыльную пераплятаецца яшчэ з адной — наведзеннем парадку на зямлі, добраўпарадкаваннем гарадоў і вёсак. Пра гэта нагадала ў непрацяглым уступным слове старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана ГЕРАСІМОВІЧ.

Настройваючы прысутных на працоўны лад, яна папярэдзіла, што кожны з раёнаў вобласці павінен быць гатовым да такога экзамену і кожнаму старшыні раённага Савета давядзецца даваць справаздачу пра тое, што зроблена ў азначаным кірунку.

— Нельга дапусціць, каб у Мінскай вобласці заставаліся запушчаныя, недагледжаныя тэрыторыі, да якіх у мясцовай улады чамусьці не даходзяць рукі. Крыўдна, прыязджаючы ў той ці іншы сельсавет, назіраць там шэрасць і ўбогасць. І, што яшчэ горш, нежаданне ўлад нешта мяняць. Колькі можна пра гэта казаць? Надышоў час спагаць!

***

«Агледзіны» Мядзельскага раёна пачаліся з тэрыторыі Занарацкага сельсавета. У прыватнасці, дэпутатам паказалі амбулаторыю, пабудаваную з выкарыстаннем новай энергазберагальнай тэхналогіі. Гэта першы ў краіне будынак, дзе нізкае спажыванне энергіі забяспечваецца дзякуючы выкарыстанню (у мэтах цеплаізаляцыі) трыснеговых пліт, сонечных калектараў, фотаэлектрычных батарэй і інш. Хоць будынак амбулаторыі і з'яўляецца «мадэльным», сама медустанова цалкам дзейная і працуе па сваім прамым прызначэнні, абслугоўваючы 17 вёсак у радыусе 16 кіламетраў.

У будынку светла, і нават вечарам, паводле слоў галоўнага ўрача Вячаслава Трубача, не трэба ўключаць святло. Вентыляцыя працуе ў аўтаматычным рэжыме, гэтак жа, з дапамогай аўтаматыкі, адбываецца кіраванне ацяпляльнай сістэмай. У выхадныя дні тэмпература ў памяшканнях аўтаматычна зніжаецца да 15 градусаў, а за гадзіну да пачатку працоўнага дня ўключаецца рэжым прагравання, які захоўваецца да вечара на ўзроўні камфортных 20 градусаў.

Тут ёсць дзённы стацыянар, разлічаны на 10 ложкаў (або 5 на адну змену), стаматалагічны, гінекалагічны, працэдурны і фізіятэрапеўтычны кабінеты, і, зразумела, урач агульнай практыкі. Папярэдні запіс на прыём не вядзецца — няма патрэбы. Прыйшоў у амбулаторыю — атрымаў патрэбную паслугу. За ўсе 11 гадоў існавання медустановы скаргаў ці нараканняў на яе працу ад насельніцтва не паступала.

***

Чым сёння можа пахваліцца яшчэ адзін сельсавет — Нарацкі? У першую чаргу — газіфікацыяй, якая, паводле слоў кіраўніка мясцовай улады Іосіфа Тарасёнка, стала самым вялікім падарункам для жыхароў вёскі Нарач. Пачалі закладку газаправода ў 2009 годзе, закончылі сёлета. Усе члены кааператыва — а гэта больш за паўтысячы ахвотных і іх сем'і — атрымалі газ, але падключацца да аб'екта можна будзе і надалей, на працягу 10—15 гадоў. Гэта датычыцца не толькі жыхароў Нарачы, але і ўсіх арганізацый і прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі населенага пункта.

Праблем з выдзяленнем зямельных участкаў пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва ў Нарацкім сельсавеце таксама не існуе: іх атрымалі 67 чалавек. Але, паводле слоў старшыні сельскага Савета, ёсць пытанні з правядзеннем аўкцыёнаў.

— Сума заробленых намі «аўкцыённых» грошай перавышае 1 мільярд, — кажа Іосіф Тарасёнак. — Але сёння нам прасцей правесці аўкцыён, падрыхтаваць да яго зямельныя ўчасткі, чым потым выкарыстаць зароблены грошы. Час бяжыць, — трэба вяртацца да гэтых пытанняў, перагледзець і змяніць палажэнні ва Указе, каб сельскі Савет меў права непасрэдна распараджацца заробленымі ад правядзення аўкцыёнаў грашыма — кропкава, на самыя неабходныя патрэбы... Напрыклад, мы маглі б патраціць іх на рамонт нашых сацыяльных аб'ектаў: бальніцы, школы, дзіцячага садка. Але гэтыя аб'екты знаходзяцца не на нашым балансе, таму аддаць ім сродкі адразу і напрамую мы не можам. І грошы ляжаць, абясцэньваюцца... Сельскім Саветам неабходна свабода ў гэтым плане, інакш які сэнс праводзіць аўкцыёны?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



***

За перыяд дзеяння Указа № 64 колькасць грамадзян, уключаных у спісы на атрыманне зямельных участкаў (на 1 чэрвеня 2011 года) склала ў вобласці больш за 42 тысячы чалавек. Аднак выдзелена пад індывідуальнае будаўніцтва толькі 13 тысяч участкаў. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама — галоўны архітэктар Мінскай вобласці Аляксандр ВАЛОВІЧ.

Паколькі Указ № 64 унёс змяненні ў парадак выдзялення ўчасткаў пад індывідуальнае будаўніцтва, у грамадзян з'явілася магчымасць атрымаць зямлю ў любым населеным пункце без аўкцыёну і без патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў (за выключэннем Мінска і абласных цэнтраў). І людзі кінуліся запісвацца ў чэргі на атрыманне надзелаў.

Сёння колькасць падабраных для выдзялення пад індывідуальнае будаўніцтва ўчасткаў у вобласці набліжаецца да 42 тысяч. Колькасць ахвотных атрымаць іх прыкладна такая ж. Аднак відавочны «перакос» адбыўся ў бок Мінскага, Лагойскага і Смалявіцкага раёнаў — на іх прыпадае найбольшая колькасць заяў ад грамадзян. Цяпер кіраўніцтвам вобласці робіцца шэраг захадаў, каб ліквідаваць гэту дыспрапорцыю і зменшыць чаргу на атрыманне ўчасткаў. На працягу двух наступных месяцаў гэтая праблема ў вобласці павінна быць вырашана, за выключэннем Мінскага раёна, дзе цяжка падабраць неабходную колькасць участкаў пад будаўніцтва з-за высакабальнасці зямлі.

***

Другі бок медаля — калі і ўчастак чалавеку выдзелены, і ўся неабходная інфраструктура ў наяўнасці, а ён не будуецца. Чаму? Па вобласці на 1 чэрвеня выдадзена больш за 3,7 тысячы прадпісанняў за невыкарыстанне зямельных участкаў у адпаведнасці з іх мэтавым прызначэннем, і гэтая праца будзе працягвацца. На сесіі было вырашана: да 1 верасня 2011 года прыняць меры па адабранні зямельных участкаў у асоб, якія не прыступілі да іх асваення ў адпаведнасці з вызначаным заканадаўствам парадкам.

— Давайце наводзіць парадак больш актыўна. Патрабаванні ў Мінскай вобласці да ўсіх адзіныя: за стан тэрыторыі адказвае кіраўнік гэтай тэрыторыі, — падкрэсліла Святлана Герасімовіч. — А няма парадку — значыць, такому кіраўніку трэба шукаць іншае месца працы.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА,**
*Мядзельскі раён.*

# МЯСЦОВАЯ ЭНЕРГІЯ ЗАМЕСТ ІМПАРТНАЙ

**У Віцебскай вобласці ў рамках распрацаванай мясцовымі ўладамі адпаведнай праграмы «Малая энергетыка Віцебшчыны», разлічанай на 2011-2015 гады, «ставіцца на паток» выкарыстанне энергіі сонца, ветру і вады. У прыватнасці, будуць эксплуатаваць сем геліяўстановак для гарачага водазабеспячэння. Для ўкаранення ў эксплуатацыю «сонечных батарэй» на працягу пяці гадоў будзе затрачана 228 мільёнаў рублёў.**

Патэнцыйнымі пляцоўкамі для стварэння цэлага парку ветраных установак (кожная з іх магутнасцю тысяча кілават і больш) выбраны тэрыторыі ля чатырох вёсак у Лёзненскім раёне. Будаўніцтва парку ветраэнергетычных установак абыдзецца амаль у 170 мільярдаў рублёў. А ў выніку дзейнасці гідраэлектрастанцый можна будзе замяшчаць каля 27,8 мільёна кубічных метраў прыроднага газу.

Падчас рэалізацыі вышэйназванай праграмы на прадпрыемствах жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці можна будзе выкарыстоўваць 75 працэнтаў мясцовых відаў паліва пры вытворчасці цеплавой і электрычнай энергіі. І такім чынам да 2015 года можна будзе штогод замяшчаць каля 40 мільёнаў метраў кубічных імпартуемага газу.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Асартымент, цэны і чалавечы фактар

**Менавіта за кошт апошняга дасягаецца да 90 працэнтаў поспеху ў продажы тавараў. З ім жа, адпаведна, звязаны і няўдачы. Можа, і занадта «радыкальна», але такое меркаванне прагучала на сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў падчас разгляду пытання аб насычэнні рынку таварамі айчыннай вытворчасці і пашырэнні спектра паслуг насельніцтву.**

Згодна з інфармацыяй старшыні Гродзенскага раённага спажывецкага таварыства Лілії Шаматовіч, у перыяд ажыятажнага попыту цэны спажыўкааперацыі аказаліся ніжэйшымі, чым у гарадах, што дазволіла павялічыць тавараабарот. Гэтым маглі скарыстацца не толькі сяляне, але і гараджане, якія актыўна атаварваліся па «танных» цэнах буйнагабарытнай тэхнікай (халадзільнікі, тэлевізары, пральныя машыны, мікрахвалевыя печы), імпартнымі мыйнымі сродкамі і г.д. Нехта і сапраўды выйграў у параўнанні з новым коштам гэтых тавараў, а хтосьці, магчыма, і пашкадуе, што паверыў вядомай прыказцы «запас бяды не чыніць».

На сесіі было агучана нямала лічбаў. Павялічыўся аб'ём рознічнага тавараабароту, выконваецца дзяржаўны сацыяльны стандарт па абслугоўванні насельніцтва, многія гандлёвыя прадпрыемствы набылі сучасны выгляд і нічым не саступаюць гарадскім, у чым пераканаліся ўдзельнікі сесіі, пабываўшы пасля пленарнага пасяджэння ў Парэччы, Азёрах, Верцялішках і іншых населеных пунктах.

Але, разам з тым, не выклікаюць, мякка кажучы, станоўчых эмоцый вынікі праверак гандлю санслужбай. Шмат фактаў, калі ў крамах выяўляюцца харчовыя прадукты са скончаным тэрмінам рэалізацыі, прычым ад пакупнікоў утойваецца сапраўдная інфармацыя, парушаюцца патрабаванні маркіроўкі тавараў. Большасць аб'ектаў райспажыўтаварыства не адпавядае нормам санітарнага заканадаўства, многія крамы не аснашчаны сучасным халадзільным і гандлёвым абсталяваннем. Тэмпературны рэжым захоўвання прадуктаў харчавання не выконваўся ў палове правераных аб'ектаў, што асабліва трывожыць у летнюю спёку. У шэрагу магазінаў не толькі даўно не праводзіўся рамонт, але і няма элементарнага — вады і каналізацыі.

Так, існуюць праблемы з фінансамі на абнаўленне матэрыяльнай базы гандлёвых прадпрыемстваў. Але ёсць і вышэйзгаданы чалавечы фактар. «Калі марозіва кладзецца побач з сырой курыцай — такому прадаўцу не месца ў гандлі», — зазначалася на сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў.

Вядома, гэта яшчэ больш абвострыць даволі вострую праблему з кадрамі «вясковых» прадаўцоў. Але як інакш?

### ШТО ЧАКАЕ РЫНАК У СКІДАЛІ?

Зараз ён не атэставаны на адпаведнасць устаноўленым, у тым ліку і санітарным патрабаванням. Закрыць рынак? Але ж іншага мясцовыя жыхары не маюць. «Будзе сацыяльны бунт», — прагучала падчас сесіі.

Станіслаў Мікша паведаміў, што рынак закрываць не збіраюцца, аднак і сродкаў на прывядзенне яго ў парадак пакуль няма. Тым не менш, запэўніў кіраўнік аблспажыўсаюза, гэтая праблема будзе абмяркоўвацца і паступова вырашацца.

### У ЧЫМ СЭНС РЭАРГАНІЗАЦЫІ?

Гэтая тэма таксама ўзнімалася на сесіі. Адзін з дэпутатаў нават запытаўся: «А ці варта нешта казаць, ставіць задачы на будучыню, калі не будзе райспажыўтаварыства?». Вось што Станіслаў Мікша патлумачыў на гэты конт:

— Дэмаграфічная сітуацыя такая, што колькасць сельскага насельніцтва скарачаецца і эфектыўнасць працы гандлю на вёсцы нізкая, аб'ёмы дзейнасці некаторых раённых спажыўтаварыстваў даволі мізэрныя і не дазваляюць ім развівацца. Цяпер з 1378 магазінаў 432 — стратныя. Але мы вымушаны іх трымаць, бо там жывуць людзі. А канкурэнты наступаюць і, каб не спазніцца, не страціць рынак, мы павінны неяк прыстасоўвацца да гэтых рэалій, кампенсуючы страты, якія нясём на абслугоўванні сельскіх жыхароў. Якім чынам? За кошт будаўніцтва аб'ектаў у гарадах. Але як гэта зрабіць, калі, скажам, Бераставіцкае райспажыўтаварыства ўласнымі сіламі нічога саліднага пабудаваць не зможа?

Вось чаму для канцэнтрацыі грашовых сродкаў для будаўніцтва аб'ектаў у гарадах раённыя спажыўтаварыствы пераўтвараюцца ў філіялы абласнога спажывецкага таварыства. Няхай у раёнах не хвалююцца — структура райспажыўтаварыстваў практычна захоўваецца, і яны будуць выконваць тыя ж функцыі, што і цяпер. Гэтая рэарганізацыя, якую плануем завяршыць да канца года, узгоднена з усімі старшынямі райвыканкамаў і, мяркую, прынясе свой эфект.

### ЯК АБАРАНІЦЬ ПАКУПНІКА?

— За апошнія гады такіх тавараў прыкметна менш, але факты, безумоўна, ёсць, — адказвае Станіслаў Мікша. — Як вырашыць гэтую праблему? Прадугадаць попыт і разлічыць заяўку, каб усё прадавалася ў належны тэрмін, проста немагчыма. У выніку ўсе выдаткі кладуцца цяжарам на прадаўца і гандлёвую арганізацыю. Хоць у той жа Літве, ды і ў іншых краінах даўно існуе норма, што тавар са скончаным тэрмінам рэалізацыі забірае пастаўшчык. Званок з магазіна — прыехалі і забралі. Мяркую, што адпаведная норма павінна быць уведзена і ў нас.

Разам з тым, на сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў адзначалася, што ў шэрагу гандлёвых прадпрыемстваў дрэнна карыстаюцца сістэмай цэнавых зніжак, каб усё ж не дапусціць скончанага тэрміну рэалізацыі тавараў. У любым выпадку пакупніку, пакуль у гандлі да канца не выкаранілі гэтую «балячку», трэба быць уважлівым.

### ХТО СКАРЫСТАЎСЯ СІТУАЦЫЯЙ?

Паводле інфармацыі Станіслава Мікшы, праблем з таварамі ў крамах спажыўкааперацыі няма, але адсутнасць па некаторых пазіцыях можа быць. Не па прычыне адсутнасці тавараў, а таму, што цяжка, здараецца, паспець прывезці ў раён тыя ці іншыя вырабы і даставіць у дзясяткі магазінаў.

— Нядаўна зніжаны цэны на даволі вялікі пералік тавараў — у прыватнасці, крухмал, соду, маянэз, рыбныя і агароднінныя кансервы, прыправы, каву, гарбату. А таксама — на халадзільнікі, газавыя пліты, веласіпеды... Але хачу сказаць аб іншым. Сёння, калі адмянілі гранічныя гандлёвыя надбаўкі, у нас іх сярэдні ўзровень складае 17—18 працэнтаў. Магчыма, мы страчваем свае даходы, але ж разумеем, што абслугоўваем вяскоўцаў. А вось асобныя іншыя гандлёвыя сістэмы вельмі хутка скарысталіся сітуацыяй і сталі прымяняць высокія надбаўкі.

Карыстаюцца момантам ажыятажнага попыту і некаторыя пастаўшчыкі тавараў, пагаршаючы для нашых гандлёвых прадпрыемстваў умовы аплаты. Крыўдна. Няўжо не зразумела, што пройдзе час, сітуацыя зменіцца, а ўзаемавыгадных партнёрскіх адносін можа ўжо не быць?

Дарэчы, апошнім часам спажыўкааперацыя Гродзеншчыны ў абслугоўванні вяскоўцаў, асабліва ў малых і аддаленых ад цэнтральных сядзіб гаспадарак вёсках, актыўна выкарыстоўвае аўтамагазіны, іх цяпер у вобласці 97. Напрыклад, у асартыментным пераліку аўтамагазіна ўніверсальнай базы аблспажыўсаюза зараз 57 пазіцый. Плюс іншыя тавары, якія прывязуць па папярэдніх заказах. Аўтамагазіны, кажа Станіслаў Мікша, даходу не прыносяць, але гэта ў мэтах эканомікі лепш, чым утрымліваць 5, 10, 20 стратных магазінаў.

Сёлета сістэму спажыўкааперацыі вобласці меркавалася папоўніць яшчэ на 20 аўтамагазінаў. Аднак...

На сесіі Гродзенскага раённага Савета дэпутатаў прэтэнзій да якасці сучасных аўтамагазінаў (не імпартнай — айчыннай вытворчасці) не выказалі, але канстатавалі, што цэны на іх, мякка кажучы, надта ўжо «кусаюцца» і купляць беларускае вельмі праблематычна. У аблспажыўсаюзе са спасылкай на дылераў карэспандэнту ўдакладнілі, што гэты аўтамагазін «МАЗ» з усім абсталяваннем 22 снежня мінулага года каштаваў 153 мільёны рублёў, 1 красавіка сёлета, у той жа камплектацыі — 273 мільёны рублёў, а на 1 чэрвеня — ужо 303,5 мільёна рублёў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## Беларускае футра стане «брэндам»?

**На Віцебшчыне ўлады ўзяліся надаць другое дыханне айчыннай пушной зверагадоўлі. Гэтае пытанне абмяркоўвалася падчас чарговай сесіі абласнога Савета дэпутатаў. У Прыдзвінскім краі паэтапна рэалізуюць адпаведную праграму «Віцебскае футра». Робіцца разлік на тое, каб беларускае каштоўнае футра, як і лён, стала нацыянальным «брэндам».**

У Віцебскім раёне з'явіцца гіганцкая сучасная звераферма для пушных звяроў: тут паселяцца нутрыі, норкі і іншыя звяркі з каштоўным футрам. Маштабы гэтай новабудоўлі ўражваюць: ферма разлічана мінімум на 30 тысяч звяркоў — і гэта толькі матачнае пагалоўе. На фінансаванне будаўніцтва фермы запланавана на працягу 2011-2015 гадоў патраціць каля 55,6 мільярда рублёў.

Футра будзе накіроўвацца ў якасці сыравіны на галоўнае ў рэспубліцы прадпрыемства гэтай галіны «Віцебскі футравы камбінат».

Напрыклад, сёння ва ўсёй Віцебскай вобласці норак разводзяць толькі ў фермерскай гаспадарцы ў Сенненскім раёне, а племянны маладняк труса — у сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве ў Браслаўскім раёне. На жаль, пакуль што прамысловая пушная зверагадоўля знаходзіцца фактычна ў крызісе.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЗВЯРТАЙЦЕСЯ — ВАС ПАЧУЮЦЬ

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 3-й стар. «МС»)**

— Што тычыцца грамадскіх калодзежаў, яны ўпарадкаваны, адрамантаваны, абсталяваны навесамі. Адзначу, што да гэтых работ мы прыцягваем і саміх жыхароў, якія карыстаюцца калодзежамі. Не ўсе, вядома, праяўляюць свядомасць у гэтым пытанні, але ёсць і такія, з каго можна браць прыклад. Так, у пасёлку Лянок жыхары штогод — без падказак і запрашэнняў з боку мясцовых улад — сваімі сіламі чысцяць і добраўпарадкуюць грамадскія калодзежы.

Адпаведнасць вады дзейным нормам рэгулярна правяраецца санітарнымі службамі. Толькі ў пасёлку Лянок у вадзе выяўлена невялікае перавышэнне дапушчальнай канцэнтрацыі жалеза. Паколькі будаўніцтва станцыі абезжалезвання ў Начскім сельсавеце пакуль не плануецца, мясцовым жыхарам раяць карыстацца бытавымі фільтрамі.

## Праблемны ўчастак

Летам насельніцтва Начскага сельсавета павялічваецца амаль на тысячу за кошт дачнікаў ( а пастаянна тут пражывае 1,3 тысячы чалавек).

— У асноўным дачнікі — людзі культурныя, — парадавалася старшыня сельскага Савета, — хоць, бывала рýзнае.

Напрыклад, адзін дачнік патрабаваў ад мясцовых улад бясплатнай замены сваёй агароджы. Аднак, паколькі ён не адносіўся да групы сацыяльна неабароненых грамадзян і льготнікаў, якім дзяржава дапамагае ў такіх выпадках, яго патрабаванне засталося незадаволеным.

— Мы патлумачылі, што па закону ён не мае права на замену агароджы за сродкі бюджэту, — падкрэсліла старшыня Савета.

...На другім месяцы па кольказці зваротаў у Начскі сельвыканкам пасля ЖКГ стаяць зямельныя пытанні: вызначэнне меж участкаў, спрэчкі з суседзямі.

— Цяпер нашы грамадзяне актыўна ўзяліся за афармленне дакументаў на зямлю і вызначэнне меж участкаў. Адны афармляюць участкі ў прыватную маёмасць, іншыя — у пажыццёвае карыстанне. Усе імкнуцца атрымаць дакумент, які пацвярджаў бы права на зямлю. Можна сцвярджаць, што грамадская свядомасць і юрыдычная граматнасць людзей выраслі.

У веснавы перыяд бываюць скаргі на стан грунтовых дарог, якія пасля сходу снегу размывае.

— Сёлета да нашых дэпутатаў звярнуліся людзі з просьбай падсыпаць дарогу да могілак на вёскі Прыяміна, — расказала Надзея Вусік. — Там якраз праблемны ўчастак: побач — пункт спагнання дарожных збораў «Крупкі» на трасе М1/Е30, і некаторыя вадзіцелі аб'язджаюць яго па нашай тэрыторыі, каб не плаціць грошы. Адпаведна нашы грунтовыя дарогі разбіваюцца. І адна з такіх дарог, размешчаная ля могілак у Прыяміна, за вясну асабліва моцна пацярпела (нягледзячы на тое, што толькі мінулай восенню яе падсыпалі). Людзі да нас звярнуліся па дапамогу. І мы гэтае пытанне да Радуніцы вырашылі.

Нягледзячы на блізкасць трасы, «смеццевая» праблема ў сельсавеце не вельмі вострая.

— Пасля выхадных, калі з'язджаюць дачнікі, уздоўж дарог назапашваецца смецце. Але па панядзелках дарожная служба праводзіць уборку. У параўнанні з тым, што было яшчэ два гады таму, магу сказаць, што смецця ля дарог цяпер стала менш. Будзем спадзявацца, што такая тэндэнцыя захаваецца і надалей, што ўзровень культуры павышаецца.

Што тычыцца населеных пунктаў, цэнтралізаваным зборам смецця ўжо ахоплена 89 працэнтаў жыхароў. У тым ліку і некаторыя дачнікі.

Ёсць сярод іх тыя, хто бывае тут рэдка — напрыклад, расіяне. Адзін такі (родам з Рэспублікі Карэлія), рэгулярна звяртаецца ў сельвыканкам з адной і той жа скаргай. Ён набыў тут дом і ўжо не адзін год просіць прадаставіць яму зямельны ўчастак у прыватную маёмасць, але, у адпаведнасці з заканадаўствам, грамадзянам іншых дзяржаў зямля можа выдавацца толькі ў арэнду.

— І колькі мы ні тлумачым, ён усё роўна прэтэнзіі не здымае, — пракаментавала Надзея Уладзіміраўна.

## Не толькі правы, але і абавязкі

Некаторыя просьбы мясцовых жыхароў атрымліваецца вырашыць без значных фінансавых затрат. Напрыклад, такую. У 2008 годзе ў аграгарадку Нача зрабілі новы мост цераз раку. А раней, недалёка, бліжэй да лесу, існаваў стары драўляны мост, які даўно згарэў. Мясцовым жыхарам для паходаў у лес больш зручным паказалася аднавіць стары мост на яго ранейшым месцы, а не карыстацца новым і штораз рабіць «крук» у 1,5-2 км. Натуральна, узводзіць у адным населеным пункце праз адну рэчку два масты — нерацыянальна. На сходзе жыхароў было вырашана, што можна абысціся і кладкай. Людзі арганізавалі суботнік, выкарысталі адходы будоўлі і за два заходы зрабілі кладку. Абышліся без фінансавых затрат з боку бюджэту і пры гэтым вырашылі пытанне.

— Мы намагаемся тлумачыць людзям, што яны самі павінны браць удзел у вырашэнні сваіх праблем. Не проста ставіць задачу перад мясцовымі ўладамі, а і прыкладаць уласныя сілы для яе вырашэння. Асабліва калі гэта тычыцца добраўпарадкавання. Самастойна даглядаць свае домаўладанні, своечасова абкошваць тэрыторыю, а не чакаць нашых загадаў.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.**

**Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30 15 чэрвеня 2011 года.**

Уладзімір КАРАГІН:

# «Поўная рэалізацыя Дырэктывы №4 дасць 5 тысяч еўра зарплаты»

**15 чэрвеня беларускі бізнэс адзначаў сваё прафесійнае свята (праўда, пакуль неафіцыйнае) — Дзень адраджэння прадпрымальніцтва Беларусі. Менавіта ў гэты дзень у 1988 годзе быў зарэгістраваны першы ў рэспубліцы Цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва. З нагоды свята Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў сустрэўся з журналістамі і падзяліўся думкамі наконт месца бізнэсу ў грамадстве і эканоміцы.**

— Зараз уклад бізнэсу ў эканоміку вельмі вялікі: малы і сярэдні бізнэс, практычна не атрымліваючы нейкіх уліванняў і датацый (за выключэннем невялікай дапамогі ад інфраструктуры падтрымкі), дае ў бюджэт краіны 27 працэнтаў (па стане на 1 студзеня 2011 года). Пры гэтым 90% малога і сярэдняга бізнэсу знаходзіцца ў стане арэнды, прадпрымальнікі не маюць уласных вытворчых плошчаў, памяшканняў, — сказаў Уладзімір Карагін і дадаў, што прадпрымальнік — гэта масавая прафесія, бо непасрэдна бізнэсам у Беларусі займаецца каля 600 тысяч чалавек (засанавальнікаў прадпрыемстваў, а таксама ІП).

Уладзімір Мікалаевіч адзначыў, што бізнэс-супольнасць спрабуе не даць падмяніць сапраўдны сэнс Дырэктывы №4 «Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь»:

— Самым галоўным у Дырэктыве №4 з'яўляецца тое, што любыя рашэнні ў эканоміцы павінны, па-першае, публічна і шырока абмяркоўвацца; па-другое, абмяркоўвацца ва ўзаемадзеянні з бізнэс-асацыяцыямі і саюзамі; і па-трэцяе, паўсюль павінны быць створаны грамадска-кансультацыйныя саветы, асноўнай часткай якіх і будуць прадпрымальнікі. Так, шэраг міністэрстваў, не буду іх называць, стварылі кансультацыйныя саветы. Туды ўключылі па чатыры намеснікі міністра, спецыялістаў міністэрстваў і ведамстваў, а для прыгажосці, «для гарніру» — па 2-3 прадпрымальнікі. Не ў гэтым быў сэнс Дырэктывы №4! Кансультацыйны савет на 95% павінен складацца з людзей бізнэсу гэтай і сумежнай галіны, аналітыкаў, эканамістаў, экспертаў. Навошта падмяняць калегіі міністэрстваў? Вядома, супрацоўнікі міністэрства павінны там прысутнічаць, але ж нельга скажаць сітуацыю і ствараць толькі выгляд. Гэта фальсіфікацыя, і мы пра гэта шчыра кажам, — патлумачыў пазіцыю Уладзімір Карагін і дадаў: — Дырэктыва №4 працуе, і мы нікому не павінны дазволіць яе падмяніць, фальсіфікаваць.

Таксама Уладзімір Карагін упэўнены і ў важнасці Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі-2011, якая была зацверджана на Асамблеі дзелавых колах у пачатку сакавіка:

— Паглядзіце тэкст платформы, і вы ўбачыце, што мы прагназавалі праблему дыспрапорцый на валютным і таварным рынках, мы ўнослі канкрэтныя прапановы. І калі б тады прыслухаліся да таго, што казалі прадпрымальнікі, сённяшняй сітуацыі ніяк не магло адбыцца. Мяне пытаюць: а што будзе, калі будзе рэалізавана Нацыянальная платформа бізнэсу Беларусі? Рэалізацыя ўсіх яе 104 пунктаў павялічыць бюджэт краіны ў тры разы, створыць дадаткова 2 мільёны працоўных месцаў. Але я падкрэсліў: рэалізацыя поўная, а не асобных пытанняў. І сярэдняя зарплата ў Беларусі будзе набліжана да еўрапейскай — не менш за 2 тысячы еўра. А поўная рэалізацыя Дырэктывы №4 дасць 5 тысяч еўра зарплаты. Бязумоўна, яна будзе рэалізоўвацца не за адзін год, але я хацеў бы агучыць у нашых экспертных ацэнках, колькі каштуюць гэтыя дакументы, за што ёсць сэнс змагацца — за нармальную сумленную канкурэнцыю, за дэманапалізацыю эканомікі, за нацыянальную канкурэнтаздольнасць, за інавацыйны характар нашай эканомікі, за дэбюракратызацыю ўсіх працэдур у нашай краіне, за ўласнасць, за стварэнне масавага слоя ўласнікаў, а не купкі алігархаў-мільярдэраў.

Пры гэтым ён падкрэсліў таксама і важнасць аб'яднання самога бізнэсу:

— Ва ўсім свеце прадпрымальнікі аб'яднаны ў дзелавыя клубы, галіновыя і тэрытарыяльныя асацыяцыі, нацыянальныя канфедэрацыі, федэрацыі бізнэсу, дзелавыя сеткі, гандлёва-прамысловыя палаты. Як правіла, прадпрымальнік Еўропы ўваходзіць у 6-7 саюзаў адначасова. А ў некаторых краінах ёсць абавязковае членства, як, напрыклад, у Германіі — ты абавязаны з моманту рэгістрацыі быць членам гандлёва-прамысловай палаты, адной з рэгіянальных асацыяцый і адной з галіновых асацыяцый. Там скарочаны розныя патрабаванні, менш ліцэнзій, але затое членства ў асацыяцыях абавязковае. Таму той жа ўрад Германіі змог скараціць колькасць працаўнікоў міністэрстваў: некаторыя міністэрствы складаюцца з 50 чалавек, а асацыяцыі, якія працуюць сумесна з міністэрствамі, маюць па 200-300 чалавек спецыялістаў і супрацоўнікаў выканаўчага апарату. Але гэта не дзяржслужачыя, у іх няма сацыяльных прывілей дзяржаўных служачых, яны працуюць на ўзносы, іх выбіраюць і накіроўваюць самі прадпрымальнікі. Гэта дэмакратычныя арганізацыі, там пастаянна праходзяць ратацыі лідараў, якія прадстаўляюць інтарэсы бізнэсу ва ўрадзе.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Спрэчны погляд з правінцыі

# ЧАМУ МНЕ ДВОЙЧЫ «НЕ ПАШАНЦАВАЛА»

Навіны пра тое, што група грамадзян перакрыла мяжу, ды яшчэ з нейкімі незразумелымі патрабаваннямі — адмяніць уведзеныя забароны на вываз паліва і іншага, — мяне навялі на думкі наконт таго, што нахабнасць насамрэч «другое шчасце». І так настрой быў дрэнны з-за чарговай сваркі з жонкай, але аказваецца, у некаторых «праблемы глабальныя»! Во як: вазіў сабе раней за мяжу цыгарэты, паліва, зарабляў добра на розніцы кошту гэтага ў памежных краінах, на зароблены грошы катэджы будаваў, жонку, дзяцей добра забяспечваў, а можа і каханку з яе дзецьмі? І раптам усё скончылася. «І пайду — вырашыў ён, — перакрываць межы, біцца з міліцыяй». А мне вось «не пашанцавала». Расійскую мяжу з боку Віцебшчыны навошта перакрываць? Сэнс? Ніякіх абмежаванняў не ўвялі — усётакі агульная мытная прастора. Тавары не вывожу ў суседнюю Смаленскую вобласць. Сумна. І чаго я не жыву ў тых жа Гродзенскай, Брэсцкай абласцях? Не пашанцавала. А па-другое, не пашанцавала мне таму, што я спраўна дапамагаю краіне тым, што падаткі з мяне бяруць — 12 працэнтаў не толькі па асноўным месцы працы. Бывае, і надрукуеш артыкул-другі ў іншых СМІ. Заробак смешны: на цукеркі дзецям не хопіць цяпер, але ж дадатковыя чэсныя грошы ніколі не перашкодзяць.

Наконт работнікаў мясцовай падатковай узнікаюць пытанні. Або раней не ведалі, што нямала людзей з прыгранічча ў заходнім кірунку зарабляюць на перавозцы паліва, цыгарэт і іншага, а падаткі не плацяць? А цяпер пачуў каментарый па тэлебачанні, што, маўляў, будуць пільна вывучаць фінансавы стан «бензавозаў». Якія гіганцкія дамы будуюць, па парку машын маюць!!! Чаму не рабілі раней — у сэнсе кантролю, праверак? Калі падлічыць, нават толькі прыкідваючы, нядрэнная сума атрымалася б, калі б кантрабандыстаў штрафавалі і вымушалі плаціць падаткі. Мяне, беднага журналіста, памятаю, амаль што не дапытвалі аднойчы ў падатковай: ці прызнаю, што падпрацоўваў на тэлебачанні. Прызнаў, у падатковую не прыйшоў, бо агульны заробак мой, калі яшчэ былі «плаваючыя» падаткі, не ўяўляў інтарэсу з пункту гледжання таго, што нешта, можа, не даплацідзь. Цяпер далі сігнал, і падатковая зашавялілася? І мясцовыя мытнікі. Памятаю, аднойчы з Брэста ехаў у Польшчу на электрычцы, якую тутэйшыя называюць «цыгарэтнай», «гарэлачнай». Праз нейкі час пасажыры побач ліхарадкава сарваліся з месцаў і пачалі... раскручваць элементы ўнутры вагона, каб схаваць блокі цыгарэт. Дзейнічалі нахабна. Калі маймy тавырышу выпадкова наступілі на руку падчас гэтых маніпуляцый, нават прабачэння не папрасілі, больш за тое, пагражалі. Заходзіць наш мытнік — «святы чалавек». Гэта пра тое, што паднаў бы галаву і ўбачыў бы, што панэлі дэкору не вельмі грунтоўна замацаваны. Запомню «цыгарэтны» цягнік на ўсё жыццё. Ужо прабачце, «грамадзяне ў форме», але як законапаслухмяны грамадзянін заўважыў, што часта дзейнічаеце па камандзе зверху. Маю на ўвазе, зрабілі ў Мінску акцэнт на нешта, дык зробім... А дзе ініцыятыва? Памятаю, пераходзіў у Віцебску з малым сынам дарогу і нахабны кіроўца, якраз на пераходзе ледзь што не задавіў. Запомніў я колер, марку, нумар машыны і расказаў пра інцыдэнт супрацоўніку ДАІ хвілін праз дзесяць. Думаў, знойдуць вінаватага, аштрафуюць. Не. Колькі гадоў прайшло, усё чакаю адказу на мой зварот да афіцэра. І вельмі здзівіўся, калі «раптам» пачалі кампанію па прафілактыцы такія выпадкаў: публікацыі ў СМІ разам ў з начальнікамі ад ДАІ, «аперацыі» і гэтак далей. А як жа мой выпадак? Тады не было каманды такія сігналы пільна вывучаць? Я хачу, каб мае падаткі адпрацоўваліся па поўнай тымі, хто носіць форму, і не толькі. Каб галоўным сігналам да дзеяння быў зварот грамадзяніна, які просіць абараніць яго правы, гонар, здароўе. Каб убачыўшы сумы падатковых вылікаў у больш за 200 тысяч рублёў у месяц, я больш не сумаваў...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «ДАКУРЫЎСЯ»...

**На Мядзельшчыне затрыманы вадзіцель, які незаконна перавозіў больш за 31 тысячу цыгарэт.**

Як паведаміў інспектар ДПС АДАІ Мядзельскага РАУС Андрэй Бародзіч, інцыдэнт адбыўся ў чацвер пасля чатырох гадзін раніцы. У вёсцы Шваўкшты патрулявалі дарогу старшы лейтэнант міліцыі, інспектар ДПС Віталь Мінчук. На вядомых толькі яму адной прыкметах міліцыянер спыніў звычайную «васьмёрку», за рулём якой знаходзіўся 39-гадовы жыхар Ашмян, які нідзе не працуе. Падчас праверкі аўто даішнік знайшоў 31200 цыгарэт NZ Gold «Super Slims» тытунёвай фабрыкі «Нёман» на суму 2 636 400 рублёў. Дакументаў аб законным набыцці «тавару» ў кіроўцы не было.

— У сувязі з крызісам накупіў сабе цыгарэты наперад, — патлумачыў гора-вадзіцель. Дзе купляў, ашмянец не сказаў.

Цыгарэты канфіскаваныя. Справа перададзена ГБЭЗ для далейшага разбору.

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

**ОАО «Минский завод отопительного оборудования»** извещает акционеров о проведении внеочередного собрания акционеров **28** июля 2011 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 29 – зал заседаний.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**
**внеочередного общего собрания акционеров открытого акционерного общества «Минский завод отопительного оборудования»:**

1. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2011 год.
2. Об утверждении локальных нормативных правовых актов Общества.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться по указанному адресу (профком) с 20 по 28 июля 2011 г. с 10 до 16 часов.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 15.00 до 15.45 в день и по месту проведения собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Кроме того, представитель акционера должен иметь доверенность (руководитель юридического лица, являющегося акционером, – документы, подтверждающие его полномочия).

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 1 июля 2011 г.

**Наблюдательный совет**
**ОАО «Минский завод отопительного оборудования»**

**КУП «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА» (организатор аукциона)**

**извещает о проведении 4 июля 2011 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Характеристика | Начальная цена продажи, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Воздушное судно НАРП-1 | Сельскохозяйственный, одноцилиндровый, поршневой двухместный моноплан. Изготовлен 01.09.2004, назначенный ресурс самолета 4 000 часов, 10 000 посадок, 15 лет. Ремонтов не имел. Двигатель Rotax-912, назначенный ресурс 3 600 часов, 45 лет. | 22 920 000 | 2 000 000 |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС». **Имущество расположено по адресу:** 247050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 25. **Шаг аукциона – 5 %.** Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 30 июня 2011 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца (Открытое акционерное общество «ГОМЕЛЬХИМСЕРВИС»): р/с 3012200630018 в Гомельском областном упр. ОАО «Бел.АПБ» УНП 400010620, ОКПО 05884280.

**Контактные телефоны организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА с применением метода понижения начальной цены по продаже объектов республиканской собственности**

| | |
|---|---|
| Лот № 1. Наименование, место нахождения объекта, информация о земельном участке (единый предмет аукциона) | **Капитальное строение, инв. № 422/С-430 (сарай), Гродненская обл., г.п. Островец, ул. Ленинская, д. 77, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0054 га сроком на 50 лет** |
| **Начальная цена единого предмета аукциона – 2 456 973 руб., минимальная цена единого предмета аукциона – 524 267 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Республиканское унитарное предприятие «Белорусский радиотелевизионный передающий центр» | |
| Лот № 2. Наименование, место нахождения объекта, информация о земельном участке (единый предмет аукциона) | **Капитальное строение, инв. № 422/С-14138 (здание аптеки), Гродненская обл., Щучинский р-н, Рожанковский с/с, дер. Рожанка, ул. Советская, д. 22, и право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0826 га сроком на 30 лет** |
| **Начальная цена единого предмета аукциона – 16 757 479 руб., минимальная цена единого предмета аукциона – 3 402 184 руб.** | |
| Лот № 3. Наименование, место нахождения объекта | **Изолированное помещение, инв. № 441/D-1136, Гродненская обл., Ивьевский р-н, Трабский с/с, д. Трабы, ул. Советская, д. 35 А-1** |
| **Начальная цена объекта – 19 483 252 руб., минимальная цена объекта – 3 896 651 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества по лотам 2, 3:** Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация» | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (Фонд «Гродноблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; www.region.grodno.by, www.gki.gov.by | |

1. Аукцион состоится **30 июня 2011 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть юридические и физические лица, индивидуальные предприниматели.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 24 июня 2011 года до 16.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе уплачивает задаток в размере 1 289 000 руб.** путем перечисления денежных средств на расчетный счет организатора аукциона – фонда «Гродноблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549; внесение задатка дает право на участие в аукционе по всем выставляемым на аукцион лотам.

4. В случае продажи единого предмета аукциона победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить указанную в протоколе сумму затрат на организацию и проведение аукциона (в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков), а также внести в соответствующий местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка.

В иных случаях победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить сумму затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

С победителем аукциона (претендентом на покупку) после совершения указанных действий (не позднее 2 рабочих дней) продавцом в установленном порядке заключается договор купли-продажи объекта республиканской собственности, а в случае продажи единого предмета аукциона местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

5. **Подробная информация** – в извещениях о проведении аукциона, ранее опубликованных в газете **«Звязда» 8 апреля 2011 г. № 65 (26929) и 17 мая 2011 г. № 89 (26962).**

Замор'е

# Неправінцыйны Руген

**Сёлета я пабывала ў Германіі: у Берліне і паўночнай частцы краіны, на востраве Руген.**

**Гасцявала па запрашэнні нямецкага фотамастака-аматара Ёрга Айднера. Праўда, аматарам назваць яго цяжкавата. Ён уладальнік узнагарод шматлікіх міжнародных выстаў, мае ганаровае званне сябра AFIAP (мастак міжнароднай федэрацыі мастацкай фатаграфіі). Дзве яго персанальныя выставы экспанаваліся ў Мінску. Але ж фатаграфія — гэта хобі. Асноўная прафесія — інжынер-энергетык.**



Адна са старажытных цэркваў на востраве Руген — Альтэнкірхе.



Куды ні кінь вокам, усюды ветракі.

Жонка Рэгіна — біёлаг. Таксама цікавіцца фатаграфіяй, але як вялікі аматар, назіральнік жыцця і павадзін птушак. Гэтае захапленне мае моцны падмурак: выдатная оптыка, апаратура. Свае назіранні, занатоўкі і здымкі друкуе ў папулярных у Германіі часопісах, прысвечаных звярам і птушкам. Яшчэ яна цудоўна малюе. «Героі» яе акварэляў зноў жа, часцей за ўсё, птушкі. Каб удасканаліць мастакоўскае майстэрства, наведвае студыю акварэлі і жывапісу. Тут займаюцца як маладыя юнакі і дзяўчаты, так мужчыны і кабеты даволі сталага веку. Гэтым часам я думала: у нашых студыях падобнага тыпу не часта ўбачыш (ці ўбачыш увогуле) дзядулю ці бабульку пад 80, нават і болей, што малюе лірычна-рамантычную карціну. Праблемы і клопаты зусім іншага кшталту... Не вельмі лірычныя, не вельмі рамантычныя...

цяжарваюць нямецкіх гаспадынь. На прыгатаванне ежы ідзе мінімум часу. Якасныя і смачныя паўфабрыкаты адпраўляюць на некалькі хвілін у духавую шафу — і ежа гатовая. А яшчэ карыстаюцца папулярнасцю адносна танныя кітайскія, турэцкія, індыйскія кавярні і рэстаранчыкі. Адтуль жа можна заказаць страву і на дом. Кошт ад гэтага не павялічыцца. На дзевяць еўра мы маглі сытна і смачна паабедаць. Порцыі даволі вялікія. Праўда, 9 еўра для немца і такая ж сума для беларуса — рэчы розныя.

Грашовыя праблемы таксама не вельмі хвалююць. Бо няма гэтых праблем. Не буду казаць пра ўсё насельніцтва Германіі. Гаворка ідзе пра канкрэтную сям'ю. Малодшая дачка Анхен — студэнтка. Бацькі выдаткоўваюць ёй неабходную суму грошай. Старэйшая, Інэс, мае вышэйшую тэхнічную адукацыю, замужам. Дзіцяці адзін год і тры месяцы. Калі Інэс зусім нядаўна прапанавалі працу на поўдні Германіі з даволі высокім заробкам, маладая сям'я, не раздумваючы, пераехала ў невялічкі паўднёвы гарадок, які знаходзіцца больш, чым за 600 км ад Берліна, дзе Інэс вучылася і дзе жывуць бацькі. Муж юрыст. Працы не знайшоў. Тым не менш, улічваючы плату за арэнду жылля, сродкаў дастаткова, каб сям'я жыла годна. Муж даглядае дзіця. І як кажа Інэс, выдатна спраўляецца. Атрымлівае дапамогу па доглядзе дзіцяці. Праўда, яна зусім невялічкая пасля года. Каб падтрымаць маладую сям'ю ў першы час, бацькі аддалі ім свой «Форд», а сабе набылі новае аўто. Галоўныя патрабаванні да аўтамабіля — не разрэкламаваны брэнд, а надзейнасць і ёмісты багажнік. Бо Ёрг і Рэгіна шмат падарожнічаюць, у тым ліку і на сваіх «колах». Сямейныя вандроўкі плануе і арганізуе Рэгіна. Звычайна штогод сям'я кудысьці выбіраецца двойчы. У «малую» вандроўку, як яны кажуць, — гэта па Еўропе ці ў недаследаваны імі куток Германіі. І ў «вялікую» — у адну з далёкіх краін Афрыкі, Паўночнай ці Паўднёвай Амерыкі, Кітай, Японію, Індыю, В'етнам...



У студыі акварэлі і жывапісу.



Крэйдавы ўцёс «Каралеўскі трон».

Наведала я з Рэгінай рэпетыцыю аматарскага аркестра. Ужо працяглы час яна з дачкой займаюцца музыкай, удзельнічаюць у канцэртах у складзе аркестра. Рэгіна — гітара, дачка Анхен — мандаліна. Тут таксама музыкі розных узростаў і прафесій.

У гэтай сям'і дарэмна не марнуецца ані гадзіны, ані паўгадзіны. Усё пралічана, арганізавана, пунктуальна.

Побытавыя клопаты не вельмі аб-



Найбольш папулярны транспарт для многіх немцаў — веласіпед.

**Ёрга і Рэгіну вабіць таксама Беларусь, асабліва Палессе, Прыпяцкі край, ды іншыя куточкі. Ёрга — цудоўныя краявіды, Рэгіну — магчымасць паназіраць за рэдкімі птушкамі, што жывуць на Прыпяці. Але ж дзіўныя рэчы трапляюцца ў нашым турыстычным сэрвісе. Кошт тура «Незнаёмая Беларусь» на 15 дзён, куды ўваходзіць наведванне Бярэзінскага біясфернага запаведніка, Браслаўскіх азёраў, Нарачы, Ясельды, Нацыянальнага парку «Прыпяцкі» складае аж 2.345 еўра. А калі сям'я 2-3 чалавекі?!**

**— Мы не бедныя людзі, — гаворыць Рэгіна, — але ж у амаль суседнюю Беларусь такія грошы?.. За больш сціплую суму мы маглі б паехаць на такі ж тэрмін, напрыклад, у Эміраты — 1900 еўра, Марока — каля 2.000 еўра, Кітай — 2.200.**

**Вось і ўсе нашы гучныя заявы на ўсіх узроўнях: развіваць магутнымі крокамі турызм у Беларусі, ствараць прывабныя ўмовы для замежных гасцей на справе. Прымай хоць сотні, хоць тысячы пастаноў, рашэнняў аб развіцці турызму... Думаю, няшмат смельчакоў знойдзецца прыехаць у нашу Сінявокую за такія грошы.**

Тым часам мае нямецкія сябры прапанавалі пазнаёміць мяне з «Незнаёмай Германіяй». Мы паехалі на самы поўнач краіны, востраў Руген, берагі якога абмываюцца халаднаватымі водамі Балтыйскага мора. Засяліліся ў невялічкім доміку пад чаротавым дахам на тры пакоі з неабходнымі выгодамі, у дзесяці хвілінах хадзьбы да мора, за параўнальна сціплую плату.

Руген — самы вялікі востраў Германіі. Плошча яго больш за 900 квадратных кіламетраў. Гэта архіпелаг з 18 астравоў і паўастравоў. З кантынентам ён злучаецца трохкіламетровай дамбай і адкрытым у 2007 годзе мостам, самым працяглым у Германіі (даўжыня больш за 4 кіламетры). На востраў можна трапіць і на грузавым пароме.

Галоўны прыбытак для вострава — турызм, як і сто, і дзвесце гадоў таму. Кожны жылы дом і ёсць міні-гатэль, гатовы зімой і летам прыняць гасцей. Жыхары вострава з любоўю ставяцца да сваёй зямлі, да сваіх традыцый. Нават новазбудаваныя дамы маюць выгляд тых, што будавалі сотні гадоў таму. З чаротавымі і чарапічнымі дахамі, брукаванымі дворыкамі і мноствам кветак. Немкі любяць высаджваць іх усюды: у вазонах, на балконах, ля вокнаў, на клумбах, газонах...

Знойдзеныя на востраве мінеральныя крыніцы далі штуршок хуткаму развіццю марскіх курортаў. Да вайны Руген лічыўся фешэнебельным курортам для багатых людзей. Цяпер гэта адно з найбольш вядомых турыстычных месцаў Германіі, штогод сюды прыязджае некалькі мільёнаў адпачывальнікаў.

Галоўная славутасць вострава — яго незвычайная прырода. Ён лічыцца самым сонечным месцам у Германіі. У ахоўным запаведніку Ясмунд можна ўбачыць непаўторна прыгожае відовішча — беласнежныя крэйдавыя скалы адлюстроўваюцца ў яркай сінечы мора. Шматлікіх турыстаў вабіць від грознага крэйдавага ўцёса «Каралеўскі трон» — сімвала вострава.

Яшчэ мяне ўразіла адна карціна: мноства ветракоў. І не толькі на востраве, а па ўсёй тэрыторыі Германіі, асабліва паўночнай яе часткі. Дзясяткамі, сотнямі, куды не кінеш вокам. Нямецкія спецыялісты па энергазабеспячэнні агучылі такі факт: магутнасць энергіі ўсіх ветракоў Германіі раўняецца магутнасці аж 25-ці атамных электрастанцый!

У Германіі набірае сілу рух праціўнікаў атамнай энергетыкі. Асаблівую моц ён набыў пасля аварыі на «Фукусіме». Кіраўніцтва краіны не магло не прыслухацца да голасу шматтысячных пратэстуючых. Восем самых старых рэактараў канчаткова адключаюць і выводзяць са строю. А да 2022 года ўсе атамныя станцыі Германіі закрыюць, у тым ліку тры самыя новыя. Таму да развіцця альтэрнатыўных крыніц энергіі тут ставяцца самым сур'ёзным чынам. Атрыманне такой энергіі падмацавана пэўным законам, дзякуючы якому гэтая сфера пачала атрымліваць дзяржаўныя субсідыі.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ,**
**фота аўтара.**



Удзельнікі аматарскага аркестра Берліна.

Важныя дробязі

## ПЛЯТКАРЫМ НА ЗДАРОЎЕ!

**АБМЕРКАВАННЕ чутак і перадача плётак самым пазітыўным чынам уплываюць на здароўе жанчыны, падтрымліваючы яе інтэлектуальны ўзровень, аднаўляючы душэўную гармонію і актывізуючы імунную сістэму. Да такой высновы прыйшла навуковая група з амерыканскага Універсітэта штата Мічыган.**



Паводле меркавання навукоўцаў, якія зрабілі гэтае дзіўнае адкрыццё, абмеркаванне апошніх навін і «перамыванне костачак» сваім калегам не толькі паляпшае настрой чароўных дам, але і паляпшае іх здароўе, самаадчуванне, а таксама падтрымлівае інтэлектуальны ўзровень, аднаўляе душэўную гармонію і актывізуе імунную сістэму.

Механізм такога ўплыву просты: падчас абмеркавання апошніх чутак і плётак з сяброўкамі ў жанчын значна павялічваецца ўзровень прагестэрону — спецыяльнага гармону, які ўдзельнічае ў паніжэнні стрэсу або якога-небудзь неспакою. Акрамя таго, разам з павелічэннем узроўню гэтага рэчыва, актывізуюцца і ахоўныя функцыі арганізма, аднаўляючы імунную сістэму, а заадно і прадухіляючы рызыку ўзнікнення невылечных захворванняў. У прыватнасці, падчас рэгулярных даверных гутарак рэзка зніжаецца шанц утварэння ў арганізме чалавека патагенных ракавых клетак.

Акрамя гэтага, павышэнне ўзроўню прагестэрону павышае і ўзровень самасвядомасці цудоўнай паловы чалавецтва. Пасля гэтага дамы набываюць непераадольнае жаданне зрабіць штосьці добрае і карыснае або дапамагчы каму-небудзь, хто апынуўся ў складанай жыццёвай сітуацыі.

Улічваючы ўсе гэтыя станоўчыя наступствы плётак, навукоўцы заклікаюць жанчын не саромецца сваіх звычак і не адмаўляць сабе ў абмеркаванні ўбору суседкі па офісе, калі тая выйшла набыць кубак чаю.

Разам з тым, даследчыкі паспяшаліся расчараваць мужчын, падкрэсліўшы, што той жа механізм не дзейнічае ў дачыненні да іх, а толькі раздражняе калег.

**Падрыхтавала Ева АДАМАВА.**

Крымінал, здарэнні

## ПЕРАБРАЎ НА СПЯКОЦЕ

Супрацоўнікі хуткай медыцынскай дапамогі не змаглі самастойна выцягнуць з каналізацыйнага люка рабочага, якому стала зусім дрэнна непасрэдна на працоўным месцы. 42-гадовы мужчына страціў прытомнасць, калі сумесна з напарнікам праводзіў работы па ачыстцы гарадской каналізацыі. Грамадзяніна вымалі на паверхню выратавальнікі пры дапамозе процівагазаў і альпінісцкай амуніцыі. Урэшце пацярпелы, які знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення сярэдняй ступені, з драпінамі быў дастаўлены ў бальніцу. Пасля агляду супрацоўніка рамонтна-эксплуатацыйнага ўчастка КЖРЭУП «Цэнтральнае» Гомеля адпусцілі дадому, паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.

## ВУЖ НАПУЖАЎ

Нечаканы госць прыпоўз на пляцоўку для гульняў у дзіцячы садок вёскі Запясочча Жыткавіцкага раёна. Загадчыца дашкольнай установы паведаміла, што дзецям замінае гуляць вуж. Бяспечную, але страшную для выхаванцаў садка істоту адлавілі супрацоўнікі МНС і выпусцілі на пустцы за вёскай.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## УПУСЦІЛА Ў КВАТЭРУ МАХЛЯРКУ

У Аршанскі гарадскі аддзел унутраных спраў бабуля, 1929-га года нараджэння, паведаміла аб тым, што з яе кватэры нейкая жанчына скрала 500 тысяч рублёў. Дзверы незнаёмцы бабуля адчыніла сама вечарам. Зладзейку затрымалі. Міліцыянеры дэпартамента аховы ўстанавілі яе асобу — беспрацоўная, 1953-га года нараджэння. Частку скрадзеных грошай канфіскавалі. Заведзена крымінальная справа. У ліку іншага высвятляецца, ці магла такім жа чынам затрыманая падманваць іншых бабуль.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У злачыннай групы канфіскавалі 1,8 млрд рублёў

**ГЭТАЯ група аказвала незаконныя паслугі па атрыманні наяўных грошай і легалізацыі тавар-на-матэрыяльных каштоўнасцяў, набытых з парушэннямі мытнага і падатковага заканадаўства. Яе выкрыла ўпраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці, пры садзейнічанні УКДБ па Магілёўскай вобласці.**

Цяпер затрыманы 5 удзельнікаў групы, якія абвінавачваюцца ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Каардынаваў іх дзейнасць 28-гадовы жыхар Магілёва. Ужываліся меры канспірацыі: мяняліся месцы сустрэч з кліентамі, набываліся розныя СІМ-карты і тэлефонныя апараты.

Група выкарыстоўвала разліковыя рахункі і дакументы з рэквізітамі шматлікіх падкантрольных камерцыйных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Абарот сродкаў сёлета склаў ужо больш за 20 мільярдаў рублёў. Толькі ў момант затрымання адзін з выканаўцаў меў пры сабе больш за 300 мільёнаў беларускіх рублёў, якія прызначаліся для чарговага кліента. Кліентамі групы былі як суб'екты гаспадарання розных формаў уласнасці, так і фізічныя асобы.



Падчас вобыскаў былі знойдзены 70 мільёнаў беларускіх рублёў, 108 тысяч долараў. Арыштаваны на разліковых рахунках 870 мільёнаў рублёў. Увогуле, паводле інфармацыі УДФР КДК Магілёўскай вобласці, канфіскавана надзвычай буйная сума грошай — 1,8 мільярда рублёў.

**Ул. інф.**

Важныя дробязі

## САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ РАЗБІВАЮЦЬ СЕМ'І



**Віртуальныя знаёмствы могуць прывесці да вельмі сур'ёзных наступстваў у рэальным жыцці. Сучасныя сужэнцы схільныя разглядаць флірт у сацыяльных сетках як здраду, здольную звесці на нішто любоўныя адносіны мужа і жонкі. Захапленне аднаго з партнёраў «УКантакце», «Аднакласнікамі» і падобнымі сэрвісамі — сур'ёзная пагроза сямейнаму дабрабыту. Таму парам неабходна спакойна і добразычліва абмеркаваць, колькі часу яны надаюць стасункам з сябрамі з сацыяльных сетак.**

Клінічны і сямейны псіхолаг Нога Навара апісаў магчымую неспрыяльную сітуацыю: «Ён знаходзіць жанчыну ў інтэрнэце. Яна не патрабуе, не крыцікуе, не настойвае, каб ён вынес смецце або адпраўляўся на працу. Каб забраў дзяцей. Яна заўсёды мілая, зацікаўленая. Яна заўсёды руплівая і эмацыйная. І як нехта мне нядаўна сказаў — яна можа зрабіць у пасцелі тое, што жонка ўжо не вельмі і хоча. Праўда, гэта ўяўная, віртуальная пасцель, аднак яму абсалютна ясна, што калі-небудзь гэтая віртуальная пасцель ператворыцца ў рэальную».

## 5 СПАКУС ДЛЯ ЕВЫ

**Спецыялісты з Каліфарнійскага ўніверсітэта ў Сан-Дыега правялі незвычайнае апытанне сярод рэспандэнтаў, розных па ўзросце, поле, адукацыі і сацыяльным статусе. Іх мэтай было высветліць, ад якіх спакус цяжэй за ўсё адмовіцца жанчынам і мужчынам. У выніку стала зразумела, што прадстаўніцы чароўнай паловы чалавецтва пасуюць перад пяццю спакусамі.**

**Па-першае,** звыш 90% апытаных прызналіся, што амаль штодня ўжываюць шакалад — у выглядзе цукерак або пліткі, дэсерту або гарачага напою.

**Па-другое,** рэдкі туалетны столік абыходзіцца без парачкі флаконаў парфумы, практычна ўсе жанчыны карыстаюцца або хацелі б карыстацца добрай, дарагой парфумай.

**Па-трэцяе,** пры наяўнасці сродкаў дамы становяцца заўзятымі вандроўніцамі. А тыя, хто пакуль толькі збірае сродкі на будучы адпачынак, прызналіся, што не адмовіліся б атрымаць у падарунак пуцёўку ў любы куток свету.

**Па-чацвёртае,** многія паненкі зачараваны мадэльным абуткам — ім усё роўна, будуць гэта боцікі класічнага дызайну або туфлі на высокім абцасе з паеткамі і стразамі.

**Па-пятае,** жанчыны не ў сілах выстаяць перад сэксуальным мужчынскім голасам.

А вось самі мужчыны распавялі, што таксама любяць шакалад і не гатовы адмаўляцца ад дарагога спіртнога напою, асабліва ў кампаніі разумнай і прыгожай жанчыны.

## 3 ПРЫКМЕТЫ ТАГО, ШТО МУЖЧЫНА НАМЕРЫЎСЯ ВАС КІНУЦЬ

**Псіхолагі вылучаюць тры асноўныя прыкметы, па якіх можна загадзя вызначыць рызыку спынення любоўных адносін. Калі вы хочаце перастаць трывожыцца з прычыны магчымага расстання, прааналізуйце, наколькі абгрунтаваны вашы страхі. Вось спіс рэальных прычын для хвалявання.**



**Прыкмета № 1** — мужчына не хоча траціць на вас свой час. Зразумела, у яго могуць быць важкія падставы забыцца на гадавіну вашага знаёмства, не адправіць вам за некалькі дзён ніводнага sms-паведамлення, затрымлівацца на працы, а потым цікавіцца толькі тэлевізарам. Але калі ўсё гэта адбываецца рэгулярна, ці патрэбен вам такі эгаіст?

**Прыкмета № 2** — мужчына праважуе сваркі, крытыкуючы вашы звычкі і густы, вашых сваякоў і сяброўак, вашу мову і паводзіны, фігуру і гардэроб...

**Прыкмета № 3** — мужчына раптам перастае займацца з вамі сэксам. Напал страсці з часам зніжаецца, і гэта натуральна, але калі паводзіны вашага інтымнага партнёра змяніліся нечакана і надоўга, — гэта нездарма.

Падрыхтавала Ева АДАМАВА.

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81

№ 22 (401)

## Пара чаранкавання

**Другая палова чэрвеня — пара зялёнага чаранкавання ягадных і дэкаратыўных кустоў.**

Як толькі парасткі адзеравянеюць, што чуваць па слабым пахрумстванні пры згібе, зялёныя чаранкі з сярэдняй часткі парастка гэтага года змяшчаюць на 18 гадзін у раствор гетэраауксіну або іншага стымулюючага сродку. Перад тым, як апусціць чаранок у раствор, абарвіце 1—2 ніжнія лісты.

Пасля пасадкі ў пясчана-тарфяны субстрат чаранкі накрываюць плёнкай або шклянымі слоікамі і 5 разоў на дзень паліваюць. Калі чаранкі ўкараняцца і ў іх з'явяцца новыя парасткі, слоікі здымаюць.

## Кроп пахучы



У дзікім выглядзе гэтая расліна распаўсюджана ў Малой Азіі, Іране, Паўночнай Індыі, у Егіпце. Кроп быў вядомы яшчэ старажытным народам як прыправа і як лекавая расліна. Народная медыцына выкарыстоўвае яго як мачагонны, ветрагонны і адхарквальны сродак.

Добра дапамагае кроп і пры бяссонніцы. З яго насення можна прыгатаваць снатворны напой: 50 г насення вараць на малым агні ў 0,5 літра кагору ці партвейну. Прымаюць перад сном па 50-60 мл. Гэты народны сродак не такі шкодны для здароўя, як снатворныя таблеткі, але ў той жа час ён забяспечвае глыбокі, здаровы сон — у адрозненне, напрыклад, ад ляснога хмелю, які выклікае хутчэй дурманлівы, а не сanлівы стан.

А калі вы часта прачынаецеся ўначы, можна паспрабаваць націраць на ноч падбародак кропным алеем.

## Буракі смачныя і прыгожыя: як гэтага дабіцца?



Тое, што сталовыя буракі патрабавальныя да сілкавання, ні ў каго не выклікае сумненняў. Смак караняплода і залежыць у асноўным ад правільнага яго сілкавання. Цукру ў ім — 50—70 працэнтаў ад агульнага ўтрымання сухіх рэчываў. Каб правільна праходзіў сінтэз вугляводаў, неабходна наяўнасць азоту і правільныя суадносіны паміж усімі пажыўнымі элементамі. Павышанае азотнае сілкаванне карысна для буракоў у першы перыяд вегетацыі. Але калі азот інтэнсіўна паступае ў перыяд выспявання караняплода, то гэта значна зніжае цукрыстасць. І яшчэ калі ў вас кіслая глеба, то не толькі буракі не накопяць цукру, але і ў іншых караняплодах яго будзе мала, каб яны вырастуць. І нельга забываць, што ў вільготныя халодныя гады цукру ў гароднiне будзе значна менш. Таму трэба падбіраць гатункі і гібрыды для любога надвор'я.

У чым прычына, што караняплоды дробныя? Існуе іх некалькі, і асноўная, відаць, калі глеба на ўчастку кіслая, якую буракі не цэрпяць. Не забудзьцеся ўвосень правапнаваць глебу. Калі расліны размешчаны блізка адна ад адной, яны дрэнна наліваюцца. І вельмі згубная з'ява — недахоп вільгаці ў глебе ў час наліву караняплода.

Пры загушчаным пасеве бурачкі абавязкова трэба прарываць. Таму што без своечасовага прарэджвання караняплоды завязваюцца дрэнна і атрымліваюцца нізкай якасці. Але калі высяваць аднанасенныя гатункі, якія даюць толькі адзін парастак, — гэта гатункі «Віраўская аднанасенная», «Бардо аднанасенная», «Аднапарасткавая», «Цыліндра аднапарасткавая», то можна абысціся без такой цяжкай работы.

*(Заканчэнне будзе.)*

## Каварная хвароба клубніц



**Сярод хвароб клубніц найбольш распаўсюджанай і вельмі шкоднай з'яўляецца шэрая гніль. Узбуджальнік хваробы — грыб. Першае захворванне з'яўляецца звычайна ў фазе бутанізацыі, ва ўмовах з пастаянна павышанай вільготнасцю паветра. На лістах і сцёблах утвараюцца расплывістыя цёмна-шэрыя плямы, якія потым загніваюць. Пазней плямы з'яўляюцца на кветках і ягадах. У сухія гады хвароба бывае толькі на спелых ягадах.**

Шэрая гніль размнажаецца спорамі з дапамогай ветру, кропель дажджу. Паражаюцца лягчэй аслабленыя і пашкоджаныя тканкі раслін. Зімуе грыб у глебе і на раслінных рэштках. У асобныя, спрыяльныя для інфекцыі гады страты могуць быць адчувальнымі — 40—60 працэнтаў. Устойлівых да хваробы гатункаў зараз няма, таму не трэба грэбаваць мерамі барацьбы з гэтай немаччу.

Для аздараўлення глебы, у якой жывуць і накопліваюцца ўзбуджальнікі хваробы, з мэтай прафілактыкі клубніцы вяртаюць на ранейшае месца не раней чым праз 3—4 гады. Непажаданыя папярэднікі — бахчавыя, бульба, агрэст, сланечнік, тытунь, таматы. А вось лепшымі папярэднікамі для клубніц з'яўляюцца збожжавыя культуры.

Пасадкі клубніц трэба размяшчаць на добра асветленых участках, якія добра праветрываюцца. Не трэба допускаць загушчэння пасадак, угнаеннях арганічных і азотных павінна быць у меру.

Каб знізіць страты ўраджаю, у час выспявання ягад у пачатку ўтварэння завязі добра было б замульчыраваць глебу пад клубніцамі торфам, саломай, хвояй, плавіннем так, каб ягады не датыкаліся да глебы.

Збірайце своечасова ўраджай, а заражаныя плады збірайце асобна, каб потым закапаць.

Развіццё шэрай гнілі можна стрымаць, калі вясной пасыпаць глебу пад кустамі драўнінным попелам або гашанай вапнай (15—20 г на куст). Можна паліваць кусты моцным растворам попелу (0,2—0,5 кг на 10 л вады). Таксама апырскваць глебу хларыстым каліем (100 г на 10 л вады). Садзіце паміж кустамі клубніц цыбулю (1 цыбуліна на 4 кусты клубніц).

Пасля збору ўраджаю апырсквайце пасадкі 1-працэнтнай бардоскай вадкасцю, на старых пасадках (трох і больш гадоў) адразу пасля снегу і ў пачатку вегетацыі — 3-працэнтнай бардоскай вадкасцю або марганцоўкай.

У перыяд бутанізацыі для павышэння ўстойлівасці да хвароб клубніцы апрацоўваюць растворам імунацыфіту (1 таблетка на 2 літры вады на 0,5 соткі).

З фунгіцыдаў выкарыстоўвайце байлетон, фундазол. Апрацоўку праводзьце да цвіцення і пасля збору ягад.


Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на ІІІ квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 13 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, сокавыціскалку, электрасушылку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **14 ліпеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 23 ліпеня 2011 г.**

Дастаўку электрасушылак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на ІІІ квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 17.05.11 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 17.05.11 па 30.09.11.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1892 ад 11.05.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**8 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на ІІІ квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________
(аддзяленне сувязі)

____________ на ІІІ кв. або 2-е паўг. 2011 года

Жатні адрас і тэлефон ______ ____________
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ на газету ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету**

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | перaадрасоўкі | ______ руб. | |

на 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
Куды (прозвішча, ініцыялы)
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

